№ 9-10 (81)
10 сакавіка
1997 г.

НАША НІВА

беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску

«Бітва» з «Аляксашкам»

Севярын Квяткоўскі



"Ёсьць тры варыянты. Выбар залежыць ад настрою. Я творца, настрой — мая стыхія", — сказаў адзін добры чалавек, паэт і анархіст. Пасьля сьвяткаваньня 930-ых угодкаў першай пісьмовай згадкі Менску мы размаўлялі на адвольныя тэмы, што не датычыліся славутай Бітвы на Нямізе. Мімаходзь мой суразмоўца азначыў ключавое слова, якое вызначае плён ці ня кожнай акцыі з тых, што ладзяцца незалежнымі коламі ў апошнія гады. Гэтае слова — настрой.

"Ідзеш сёньня на акцыю? — Пэўна, не: няма настрою", "Ну, як учора было на дэманстрацыі? — Файна, крута адвязаліся!", "Штосьці сумна робіцца, хутчэй бы якая акцыя"...

У арганізатараў "Бітвы на Нямізе", што сьвяткавалася 2 сакавіка, было некалькі варыянтаў: зрабіць тэатралізаванае відовішча, зрабіць чыста палітычную акцыю (зь верагоднай сапраўднай бітвай з "рыцарамі"), альбо ўвогуле нічога не рабіць. Апошні варыянт, бадай, найболып непрымальны. Хаця...

Вельмі часта грамадзяне, якія маюць пэўныя палітычныя пазыцыі, тлумачаць свой няўдзел у вулічных акцыях наступным чынам: "А што гэта зьменіць?" Але калі такія людзі "празь не хачу" трапляюць на якуюнебудзь дэманстрацыю, яны часам робяцца заўсёднікамі вулічнае палітыкі. Гэта здараецца ў тым выпадку, калі яны вяртаюцца з акцыі ў добрым (узьнёслым, вясёлым, баявым і г.д.) настроі.

З тых пяці-сямі тысячаў людзей, што прыйшлі на Замчышча, багата хто арыентаваўся на імпрэзу, на пэрформанс. А хтосьці проста ішоў "на акцыю". Сапраўды, абвешчанае "сьвяткаваньне 930-ых угодкаў Менску" спарадзіла надзею ўбачыць тэатральную "бітву", ахінуцца ў адмысловы карнавал. Тым больш, што мы памятаем прэцэдэнты падобных сьвяткаваньняў угодкаў Грунвальдзкай бітвы.

На Замчышчы настрой быў сьвяточны. Было сказана колькі словаў пра значнасьць мінулай падзеі, калі нашыя продкі абралі адзіны магчымы для сябе варыянт: не здалі горад

Працяг на старонцы 2.

Гісторыя

"Што яны выраблялі!.."

... Васіль Струпавец паказваў мне хату, дзе савецкія партызаны расстралялі ягоную сям'ю. У гэты момант да нас падыйшла старая жанчына. Я запытаўся ў яе пра савецкую партызанку.

— Рабавалі яны нас кожны Божы дзень, — гаворыць Яўгенія Афанасеўна Ш., — Што яны выраблялі!.. Ад немцаў у нашай вёсцы ні адзін чалавек не загінуў, а партызаны забілі 45 вяскоўцаў. Толькі некаторыя пахаваныя па-людзку, на могілках. Большасьць людзей вазілі ў лес, там забівалі, там і закопвалі... Маю сястру, Надзю, забілі, пакінулі пяць яе дзяцей сіротамі...

Матэрыял Сяргея Ярша ў сэрыі "Партызанскімі сьцежкамі".

На старонцы 6.

Востраў сьмерці

... Менавіта на востраў Назіна 18 траўня 1933 году была дастаўленая першая партыя "элемэнтаў гарадзкога тыпу", людзей, затрыманых пераважна ў Менску і Маскве як бяспашпартных – 4900 чалавек. Другая партыя — 1174 чалавекі — наступіла 27 траўня. Да 12 чэрвеня было зарэгістравана 1473 памерлых. Да зімы загінулі амаль усе... Гэта лічбы афіцыйных архіўных, нядаўна яшчэ зусім сакрэтных дакумэнтаў...



Пра тое, што адбылося з нашымі землякамі на Востраве сьмерці — у артыкуле Ігара Кузьняцова.

На старонцы 6.

Літаратура

БОГУМІЛ ГРАБАЛ

У Празе памёр Богуміл Грабал. Сусьветна вядомы пісьменьнік, легенда чэскай літаратуры.

З лютага, кормячы галубоў, ён выпаў з вакна пятага паверху праскага шпіталю. 82-гадовы стары, які любіў пісаць без чарнавікоў, любіў піва, любіў птушак і кошак.

Тэма разьвітальнага падзеньня адкрыта ўваходзіць у ягоныя тэксты: "Некалькі разоў я хацеў скочыць зь пятага паверху, з гэтай маёй кватэры, дзе кожны пакой робіць мне балюча, але анёл заўсёды ўратоўваў мяне ў апошнюю хвілю..."

Сёньня "Наша Ніва" ўпершыню па-беларуску друкуе апавяданьне Богуміла Грабала "Што такое карчма", а таксама эсэ Аляксандра Лукашука "Піва з тыгрыцай".

На старонках 10-11.



Грабніцы македонскіх цароў



Зрабіць сэнсацыйнае адкрыцьцё ў галіне антычнай археалёгіі Грэцыі амаль немагчыма. Але прафэсар Маноліс Андранікас такое адкрыцьцё ўсё ж зрабіў...

"Расчысьціўшы фасад грабніцы, археолягі нарэшце ўбачылі дзьверы, за якімі знаходзіўся ўваход у пахавальную камэру. Андранікасу шчасьціла — дзьверы былі цэлымі і знаходзіліся на сваім месцы. Аднак прабірацца ў яе прыйшлося праз скляпеньні. Раскапаўшы дах пахавальнай камэры і зьняўшы адну з плітаў, археолягі 8 лістапада 1977 г. змаглі ўпершыню больш чым праз 2000 гадоў пасьля збудаваньня грабніцы зазірнуць у цёмнае скляпішча..."

Артыкул Міколы Крывальцэвіча ў сэрыі "Археалягічныя адкрыцьці сьвету".

На старонках 4-5.

Гітлер — «вялікі» ці кожны з нас?

Сёньняшняя "хваля Гітлера" трапляе на добры момант глябальных пераацэнак. Адно з пытаньняў, якія ставіць сучасная кінематаграфічная і кніжная "гітлерыяна", — ці быў Гітлер вялікім?

Артыкул на старонцы 7.

Чачэнскі дзёньнік

Каханьне да цяжкага хворага

Сёньня мы працягваем публікацыю сэрыі матэрыялаў, якія карэспандэнты "Нашай Нівы" прывезьлі з паездкі на прэзыдэнцкія выбары ў Чачэнію ў канцы студзеня. Гэтым разам — занатоўкі Тацяны Сьнітко.

На старонках 4-5.

Новая дыскрымінацыя

Ня гледзячы на ўсю спэцыфіку беларускае сытуацыі працэсы, якія адбываюцца ў гэтай краіне, маюць цэлы шэраг стандартных вызначэньняў: аўтарытарызм, парушэньні правоў чалавека, абмежаваньні свабодаў слова й сходаў... Гэта тыя маркеры, якія, нажаль, паступова губляюць у сваіх этычных ацэнках (праз выцясьненьне эмацыйнасьці), затое робяцца сапраўды ўнівэрсальнымі — зразумелымі мэдыямі, грамадзкасьцю, уладамі дэмакратычных краінаў. Сытуацыю ў Беларусі, такім чынам, можна тлумачыць з дапамогаю ўнівэрсальных паліталягічных і сацыялягічных вызначэньняў. Гэта мае чыста прагматычны сэнс —камунікатыўны. Але важным ёсьць тое, што беларуская сытуацыя патрабуе гэтых унівэрсальных тлумачэньняў.

Тым ня менш, зусім пазьбегнуць камэнтароў да характарыстыкаў сытуацыі ў Беларусі ня ўдасца. У тым ліку й таму, што разьвіцьцё грамадзтва ў Беларусі апярэджвае многія іншыя сацыяльныя працэсы, у тым ліку й дзяржаўныя. Больш таго, некаторыя рысы беларускага соцыюму выводзяць яго ў XXI ст. Выразны прыклад падобнаму — сымбіёз паняткаў ідэалёгія й дыскрымінацыя.

Калі журналісты й палітыкі гавораць пра дыктатуру ў Беларусі, яны маюць на ўвазе найперш юрыдычныя прыкметы гэтай формы арганізацыі ўлады — ліквідацыя падзелу ўладаў, адсутнасьць мясцовага самакіраваньня, зьнішчэньне незалежнага суда, абмежаваньні свабоды слова, нізкія стандарты індывідуальных свабодаў... Прызнаньне факту дыктатуры не азначае наяўнасьці штохвілiннай пагрозы ўласнаму жыцьцю, не азначае вяртаньня да самых брутальных мэханізмаў функцыянаваньня дыктатуры, якія склаліся за першую палову XX стагодзьдзя. Натуральна, што асобныя рэцыдывы такіх учынкаў ня выключаныя. Але новай дыктатуры ёсьць дзе праявіць сябе ў новых сфэрах. Найперш — у кантролі над інфармацыяй. У масавым грамадзтве, якое можа існаваць пры ўмове насычанасьці інфармацыйных плыняў, кантроль над інфармацыяй пераўтвараецца ў адну з функцыяў дыктатарскіх рэжымаў. Адпаведна й мэтанакіраванае ўмяшальніцтва ў інфармацыю набывае новае значэньне — як дыскрымінацыя.

У канцы XX ст. дыскрымінацыю асобных этнічных, культурных, палітычных групаў ужо ня модна замацоўваць юрыдычна. Затое абмежаваньне інтарэсаў гэтых асобных групаў можна эфэктыўна праводзіць праз абмежаваньне доступу да інфармацыі й праз адмысловую інфармацыйную палітыку. Некаторыя ідэалягічныя ўстаноўкі рэжыму, якія рэалізуюцца ў сёньняшняй Беларусі, зьяўляюцца ва ўмовах інфармацыйнага грамадзтва праявамі новай дыскрымінацыі.

Для беларускага грамадзтва афіцыйная антызаходняя прапаганда ёсьць формаю нацыянальнай дыскрымінацыі. Цывілізацыйна-культурная сувязь з Захадам зьяўляецца адным з чыньнікаў фармаваньня беларускае сьвядомасьці. Беларускі выбар, да таго ж, азначае выхад за рамкі ўласна беларускага. У такім разе антызаходняя прапаганда ў дачыненьні да беларускага грамадзтва азначае непавагу да генэалёгіі грамадзтва, а таксама парушэньне яго этычных нормаў.

У альтэрнатыву прапаноўваецца не Расея, а арыентацыя на самыя адыёзныя колы Расеі. Усё больш-менш прыхільнае беларускай цэльнасьці абвяшчаецца маргіналіяй для Расеі. Можа быць, так яно й ёсьць. Але вядзецца пра адбор для сябе, вядзецца пра тое, што беларускае грамадзтва само мусіць абіраць для сябе партнэра ў дыялёгу. У выніку афіцыйнаю прапагандаю ствараецца гіпэртрафаваны вобраз Расеі, бо гэты вобраз татальны — гэта значыць, што там мы ўвогуле ня можам знайсьці суразмоўцу. Так для Беларусі ўвогуле зьнікаюць усе суседзі, а застаецца толькі пас варожасьці.

Чаму гэтыя два напрамкі інфармацыйна-прапагандысцкай дзейнасьці дзяржавы зьяўляюцца дыскрымінацыяй? Магчыма, што антызаходнія й прашавіністычныя погляды будуць агучвацца ў Беларусі яшчэ доўга. Але сёньня за гэтымі лёзунгамі стаіць дзяржаўная ўлада. Парушаюцца прынцыпы плюралістычнасьці інфармацыі, а дзяржаўныя мэханізмы выкарыстоўваюцца для стварэньня дэфармаваных вобразаў. Канцэпцыі адной групы насельніцтва за бюджэтныя сродкі пераўтвараюцца ў дзяржаўную палітыку, якая дыскрымінуе пачуцьці іншых.

Алег Дзярновіч



"БІТВА" З "АЛЯКСАШКАМ"

ворагу — аб'яднанаму войску Яраславічаў, чым спынілі іхны наступ на Полацкае княства. Далей усе рушылі да Опэрнага тэатру, дзе пасьля кароткіх прамоваў аб Менску быў разыграны невялікі лялечны сюжэт пад назовам "Цар Аляксашка".

Тое, што ў нашым вулічным супраціве зьявілася старадаўняя форма змаганьня — пэрформансавае высьмейваньне, сатыра — гэта станоўчая тэндэнцыя. Батлейка, у якой пэрсанажы вядомыя кожнаму, і ў якой можна сказаць пра ўсе надзённыя праблемы, была "абсалютнай зброяй" сярэднявечнага "простага" соцыюму. Уласна зь яе і ўзьнікалі такія прафэсійныя жанры нацыянальнай культуры, як тэатар, пасьля — кіно, пасьля — тэлебачаньне. Словам, усё тое, чаго ў беларускай культуры пакуль няма.

Заўважу, што ідэя пэрформансу з "царом Аляксашкам", народжаная сярод анархісцкай моладзі Менску, напярэдадні была рэалізаваная на пляцы Волі. Тады, 1 сакавіка ў былым Аляксандраўскім сквэры была разыграная сапраўдная п'еса пад назовам "Сьмерць тырана", "прысьвечаная 116-м угодкам забойства цара Аляксандра II тэрарыстам Ігнатам Грынявіцкім".

Пасьля быў сьпеўны выступ Андрэя Мельнікава — пра тое, што прадразьвёрстку трэба вынішчаць "да апошняга камісара". Ягоны ваяўнічы голас зьмяніўся рахманым сьпевам Алега Атаманава. Сьпяваў, нібы пераконваў сябе, — трэба любіць Бацькаўшчыну, яна харошая...

А як настрой?. Ясна, рушылі на Праспэкт. І дайшлі да пляцу Незалежнасьці. Файна? Файна.

Якое адчуваньне мог вынесьці выпадковы чалавек, які ня ходзіць на мітынгі, бо не адчувае іхнае плённасьці? Пэўна, адчуваньне гармідару. Зьмяшаньне жанраў, блытаніна мэтаў, недаробленасьць, неакрэсьленасьць... Зразумела, можна запярэчыць, што лепш так, чым ніяк, што час такі, калі трэба сумяшчаць тэатар і чыстую палітыку... Ясна, што й тэатар, і палітыку робяць "паэты", творчасьць якіх залежыць ад настрою. Але за дзесяць гадоў "палітычнага жыцьця на тэатральнай сцэне" (ці наадварот) магчыма выпрацаваць кшталт, на які настрой не ўплывае ў прынцыпе — прафэсіяналізм.

Бадай, цяпер гэтае слова зрабілася ключавым для беларускага вулічнага супраціву. Што да настрояў, за мінулы год яны не зьмяніліся.

Севярын Квяткоўскі

ГЭТА — МЫ

Здаецца, у траўні чарговы рэфэрэндум. Яднальны. Зьліемся, так сказаць, у экстазе. З Расеяй. Відаць, доля такая. Не трымаецца свабода ў руках. Беларусь нядужае на хваробу Паркінсона. Чаму?..

Неяк ля Камароўкі, заняты размовай, я замінаў праехаць BMW, якая ехала па ходніку. BMW спынілася. Выскачылі ўнушальнага выгляду чацьвёра. З "братвы". Пачутага мату хапіла б на чатырох. Вылупленыя вочы, растапыраныя пальцы...

Адэкватна адказаць я ня здолеў. Інакш кажучы, наклаў у штаны.

Хамства і няздольнасьць адэкватна адказаць на хамства — знакі нашага часу. Сёньня гэтым працятае ўсё нашае жыцьцё. Хамства песьціцца і выхоўваецца ў грамадзтве. На дзяржаўным узроўні. Хамства і спалох — альтэрнатыва свабодзе. Свабода грамадзтва нараджаецца са свабоды асобы. Для нараджэньня свабоды асобы мусіць быць сіла волі, сіла хаценьня. У Беларусі яе бракуе. На ўсіх узроўнях. У грамадзтве пануе хам і культывуе роднасныя яму якасьці — страх, лісьлівасьць, здраду.

У Траецкім разьбіраецца "братва". Шасьцёра на трох. Тыя, каго менш, моўчкі рэагуюць на абразы. Сёньня ня іх "масьць". Але злоба і крыўда мусяць выліцца ў іншым месцы.

У краме скандальная цётка раве на дзяўчо за прылаўкам, пагражаючы выклікаць загадчыцу. Дзяцюк кантралёр з асьцервянеласьцю штрафуе бабку. Зноў — страх, крыўда, злоба.

Ахвяра выбіраецца так, каб — беспакарана, каб выключыць магчымасьць адказу.

Міліцыянты хапаюць студэнтаў ПАСЬЛЯ мітынгаў — упяцёх на аднаго. Так спакайней і надзейней. Так сухія штаны.

Прэзыдэнт на паказальным паседжаньні па-хамску выганяе міністра свайго ўраду, значна старэйшага за прэзыдэнта. На загад прэзыдэнта зьбіваюцца дэпутаты і кідаюцца за краты паэты. Прэзыдэнт моцны, прэзыдэнт сьмелы. Бо адказу ня будзе. Беспакаранасьць. Міністры і вэртыкаль кладуць у штаны нават раней, чым трэба.

Адстаўлены Вярхоўны Савет у самы напружаны момант таксама наклаў у штаны. Лідэр апазыцыі ў напружаны момант зьнікае з Бацькаўшчыны.

Беларускія ўлады зьбіваюць паветраныя шары і гыркаюць на Захад, калі за плячыма — улады расейскія. Беларускія ўлады лісьліва адгукаюцца на кожны шоргат з Масквы, бо існуе магчымасьць канкрэтнага пакараньня.

Грамадзяне пакуль што Рэспублікі Беларусі абыякава глядзяць на ўсё гэта, пэрманэнтна аказваючыся то ў ролі хама, то ў ролі пацярпелага ад хама. Гэта — мы.

Што рабіць, як паставіць хама на месца? Паклясца на крыві?.. Магчыма, нешта зьменіцца, калі дойдзе да крыві, калі нас прымусяць у чарговы раз браць Грозны альбо Севастопаль? Можа, гэта дадасьць нам мужнасьці адэкватна адказаць хаму.

А пакуль, пакуль можна радасна ўсьміхацца і сьмела казаць: "Ну вот, дачакаліся, цяпер за намі — Масква".

Ня трэба цешыць сябе ілюзіямі. Пакуль за намі — хамства і сьмярдзючыя штаны.

Алег Дашкевіч

Пошта

Дзень добры, шаноўная рэдакцыя!

Вашу газэту чытаю ад першых нумароў, якія захаваў у сваім хатнім архіве. Відаць, такіх, як я, прыхільнікаў "НН" у маім горадзе шмат, бо газэту цяжка купіць ужо нават а 17 гадзіне ў шапіку, калі я іду дадому з працы. Але нагодай напісаньня гэтага ліста стаў артыкул Сяргея Паўлоўскага "Каменная тога Майсея". Вельмі патрэбны артыкул, якога я чакаў даўно, бо сам прайшоў праз усе "wątpiwości", як кажуць палякі.

Спачатку трошкі пра сябе. Мне 26 гадоў. Скончыў Палітэхніку ў Менску, браў непасрэдны ўдзел у маладзёжным незалежніцкім руху (арганізацыя "Чырвонага Жонду"). Мітынгі, сьцягі, выезды за мяжу, пісаньне беларушчынай. Агітаваньне іншых, уздым, а пасьля як нешта заламалася. І гэтае заламаньне прыйшло яшчэ ў часы Шушкевіча-Кебіча зь іх згодніцка-рублёвай палітыкай. Няўзброеным вокам была відаць апатыя нашага грамадзтва (не хачу вымаўляць слова народ) да якіх-колечы зьменаў. Горка было глядзець на людзей, якім нічога апроч каўбас і расейскіх рублёў не было патрэбна. І вось тады я плюнуў і сказаў, як той Яновіч, — калі ім гэта не патрэбна, чаму я павінен штосьці рабіць для іх, дзеля чаго павінен прабіваць сваёй галавою гэты глухі мур неразуменьня і нават варожасьці?!

Я адыйшоў ад актыўнай палітыкі, я захапіўся польскім рухам на "Крэсах", я дасканала авалодаў польскай мовай, і нават быў выхаванцам у харцэрскім асяродку моладзі. Але... Але нават дасканалае, амаль без акцэнту веданьне польскай мовы, нават замежныя выезды і ваяжы не прынасілі задавальненьня. Кожны раз, калі я ў складзе палянійнай групы выяжджаў на які-небудзь сэмінар па гісторыі ці рэстаўрацыі помнікаў, то на розных дыспутах і выкладах зацята бараніў БЕЛАРУСЬ. Так, менавіта тую кепскую, калгасную, расейскую Беларусь. Натуральна, я не казаў пра гэта, я прыводзіў іншыя аргумэнты, я спрачаўся, казаў, што мы маем ня горшыя кнігі, помнікі і г.д. Чым выклікаў абураную крытыку з боку "дрэўняных палякаў", як кажа мой бацька, зь Беларусі, Украіны і іншых краінаў. Але затое мае заўвагі і інфармацыя былі вельмі цікавыя для "rdzennych polaków", менавіта да мяне, да маёй Беларусі яны мелі інтарэс, а не да неатракцыйных цяпер у Польшчы "Крэсаў".

Але па вяртаньні ўсё вярталася на колы свае. Зноў шарая савецкая рэчаіснасьць і беспэрспэктыўнасьць усяго беларускага ў Беларусі. Я зразумеў, што ў Беларусі можна быць альбо беларусам, альбо савецкім. Так, савецкім. Бо ніякі паляк ці расеец, апроч, вядома, нацыяналістаў, не прызнае іх сваімі. Для першых мы заўсёды застанемся "расейцамі", для другіх "бульбашамі". Савецкім быць ня хочацца, дый узровень ведаў не дазваляе. Але каб стаць беларусам, трэба, як кажа Паўлоўскі, жыць для сябе, змагацца за сябе і сваіх дзяцей, а не за абстрактны народ. Быць гордым і жорсткім. За абразу СВАЮ адказваць жорстка, а не пісаць у газэту сьлёзныя лісты, як мяне, літаратара, абразілі за мову каля паштовага акенца. Але каб гэта зрабіць, трэба шукаць аднадумцаў, і хоць нас мала, прыклад "НН", Свабоды, Радыё 101,2 і іншых — патэнцыял мы маем агромністы.

З павагай,

Моргун Аляксандар,

Баранавічы

ДЗЕЛЯ ГЭТЫХ ДЗЁН...

Праца ў рэдакцыі штодня сутыкае мяне зь людзьмі, якім сёньня вельмі кепска. І маральна, і матэрыяльна. Яны шукаюць хоць якой падтрымкі ў журналістаў. А што могуць журналісты? Сказаць — цярпіце? А дзеля чаго цярпець? Хіба штосьці абяцае паляпшэньне?

Вось жанчына, якая кожную ноч ставіць свайму мужыку каля ложка бутэльку. Можа, варта было б неяк ратаваць чалавека? — асьцярожна пытаюся я. А дзеля чаго? — зьдзіўляецца яна, — дзеля ГЭТЫХ ДЗЁН?

Людзі, усё яшчэ савецкія, дзяржаўныя, адчуваюць сябе пакінутымі дзяржавай. Бо яны так прывучаныя, што дзяржава стварае ім жыцьцё, а не яны самі робяць свой лёс і сваю дзяржаву.

Людзі так насталыгуюць па сваёй маладосьці, бо сучаснасьць сапраўды горшая. Афіцыйная прапаганда ўсяляк падмацоўвае гэты ўнутраны дыскамфорт, бясконца далдонячы пра развал саюза, белавескую здраду, пра тое, што сёньня Беларусь — сярод былых саюзных рэспублік такая й такая... Не сярод Эўропы, не сярод краінаў-суседак, а сярод былых, савецкіх. Краіна зь мінулага, у якой усё лепшае — былое...

Я не хачу чытаць гэтым людзям палітінфармацыю. Я хачу сам зразумець, у чым наш нерэлігійны, ненацыянальны, незабясьпечаны матэрыяльна чалавек можа знайсьці тую цьвёрдую купіну пасярод жыцьця, якое ўяўляецца яму балотам. Адкуль узяць яму самую махатку не абавязку, а жаданьня жыць? Прычым ня некалі недзе, а тут і зараз.

Тое, што прыходзіць мне ў галаву, выглядае, магчыма, банальна. Але шукаць тую купіну трэба пачынаць з быту.

Па-першае, трэба прыбраць свой дом. Ня толькі ад сьмецьця, але — аздобіць. На сьцяне абавязкова павінны быць няхай сьціплыя партрэты вашых сваякоў — бабулі, можа быць, прадзеда... Трэба з кватэры ці пакою зрабіць ваш асабісты ўтулак, куды хочацца прыйсьці. Па-другое, займіцеся сабою. Не дзеля таго, каб камусьці падабацца, а каб набыць вартасьць ва ўласных вачах. Па-трэцяе, займіцеся дзецьмі. Сто разоў ахвяруйце сваімі нэрвамі, але дзеці павінны стаць вам сябрамі. Па-чацьвертае, увесь час што-небудзь чытайце, хоць бы хвіліну ў дзень. Накладзіце забарону на тэлевізар і афіцыйныя газэты. Пазьбягайце хлусьні. Пазьбягайце палітыкі. Каб вашае дзіця вырасла паўнавартасным, вы мусіце аднавіць свой радавод, як пісаў Ул.Арлоў, да пятага калена. Для гэтага, магчыма, прыйдзецца зьезьдзіць у далёкую вёску. Але вы мусіце зрабіць гэта.

Я пералічыў некалькі асноўных маленькіх хітрыкаў, якія спрацоўваюць толькі тады, калі працуюць штодня. І я ведаю, наколькі цяжка вытрымліваць гэты статус. Назавем яго так: наш чалавечы статус. Ніхто ня мусіць нікога зачапляць і наяжджаць! Прынцып "зашчамі бліжняга свайго" павінен зьмяніцца прынцыпам — "калі можаш, не грузі на іншага свае праблемы"!

На жаль, усё навокал нас амаль цалкам адваротнае. Людзі не даглядаюць свае хаты, сваіх дзяцей і сябе. Ад гэтага яны раздражнёныя і дэпрэсіўныя. Вось з чаго, а не з палітыкі, якой бы яна ні была, трэба пачынаць сваё выжываньне. Вярнуцца з саўковага статусу ў чалавечы ніякая палітыка нам не дапаможа.

Неяк мы зь сябрамі пайшлі на канцэрт беларускіх артыстаў. Мой сябра зьвярнуў увагу на тое, што жанчына-канфэрансье выйшла на сцэну зь непрыбранымі косамі, быццам толькі што ўстала з ложка. Да таго ж артысты сьпявалі міма нотаў. Я спрабаваў пярэчыць уласнаму ўражаньню. Маўляў, артысты з дарогі. Маўляў, яны жывуць пасярод бытавое неўладкаванасьці. Маўляў, яны ж нашы сябры-патрыёты. Але ўсё адно канцэрт для мяне быў сапсаваны. Тая беларушчына, да якой мы ставімся зь піетэтам, была прыніжаная неахайнасьцю, якая, у сваю чаргу, мусіла апраўдвацца сьвятасьцю беларушчыны. Даводзіцца прызнаць, што ёсьць у нас і такі савок — нацыянальна сьвядомы.

***

Калі ў краіне працуе адзін дзяржаўны тэлеканал, зачыняюць недзяржаўнае радыё, усе незалежныя газэты ходзяць пад судом, мірныя дэманстрацыі разганяюць спэцназы, а апанэнты ўлады трапляюць у турмы, — паставіць дыягназ такой краіне нескладана. Там пануе антыдэмакратычны рэжым.

Калі ж рэжым гэты абраны і падтрыманы народам, — мы кажам: народ падмануты, народ не пазбавіўся рабскае псыхалёгіі, народ ня ведае, што такое свабода. Калі ж народ пры гэтым і не жадае нічога ведаць, нічога мяняць у сваім убогім жыцьці, тады мы пачынаем разважаць пра якасьць чалавечага матэрыялу.

Сам па сабе гэты тэрмін не нэгатыўны і не пазытыўны ў нармальнай сытуацыі. У НАС жа, дзе народ — гэта сьвятое, адзіная крыніца праўды і ўлады, — гэты тэрмін успрымаецца адназначна нэгатыўна. А між тым і названы народ сьвятым дзеля таго, каб быць адгароджаным ад крытыкі і ў разе патрэбы быць нацкаваным на крытыкаў, як гэта бывала ня раз...

Вось ужо 10 гадоў як у беларусаў стала крыху больш свабоды і крыху болей грошай. Гэта ўвогуле і відаць з тых мінімальных вонкавых зьменаў, якія адбыліся ў аблічы краіны і яе сталіцы. У Менску зеўрае даўгабуд вакзалу, новыя рускія ўтыркаюць у сталінскія фасады ваконныя рамы ўсіх колераў вясёлкі і шчыльна завешваюць будынкі сатэлітарнымі талеркамі, чым дашчэнту руйнуюць выгляд таго, што ўжо стала гісторыяй.



Безгустоўшчына і недарэчнасьць вылазіць паўсюль. Новыя рускія сноўдаюць на даражэзных машынах, праз сотавыя тэлефоны асаджаюць сваіх істэрычных жонак (адна крычала: ты считаеш, что это я трачу твоі деньгі) і ўводзяць у сваіх модных супэрмаркетах стары, як сьвет, штотыднёвы сандзень. Старыя беларусы абураюцца цэнамі, хваляць Лукашэнку і кажуць, што на новых рускіх не хапае Сталіна.

Па горадзе прабягаюць гэбісцкія шасьцёркі, густы сьнег на вуліцах густа засыпаецца пяском, прэзыдэнт віншуе народ з новым годам: успомніце, рускія, палякі і яўрэі, кажа ён, успомніце, як пры Шушкевічы вас выганялі з працы за адну толькі графу ў пашпарце! Да, было, — ахвотна кажа народ і з задавальненьнем каўтае ніншавальную хлусьню пад чарку... Дарагія футры, голеныя каркі, спалоханыя вочы, амон...

За ўсе гэтыя гады ў Менску не зьявілася ніводнага больш-менш прыстойнага будынка, фасада, рэспэктабэльнай вуліцы. Рэспэктабэльная публіка робіць эўрарамонты ў хрушчоўках і партшколах. Нават камэрцыйныя банкі зьдзіўляюць сваёй саўковасьцю. У Менску няма ніводнай проста кавяранькі, ніводнага проста сквэра ці нават проста ракурсу, дзе табе калісь бывала ўтульна і дзе было б утульна сёньня. Свабода і грошы вылазяць, тырчаць, сачацца з самых недарэчных месцаў. Гэта як бы ў камэры на зоне нувярыш паставіў сабе нары з балдахінам і пэрлямутравую парашу.

Наш багаты народ укачвае свае баксы ў эўрарамонт зоны. Наш бедны народ пераважвае ад гэтага страшнае прыніжэньне і зь яшчэ большай вераю апэлюе да турэмнага начальства. Наш народ — гэта Шура Балаганаў, які ня здатны распарадзіцца ані свабодай, ані грашыма, ані сваім голасам на рэфэрэндуме. Таму ён усяго гэтага асабліва й ня прагне. Ягоныя здабыткі: каб на халяву, каб зашчыміць бліжняга і бязьмежная гардыня пры гэтым. Гардыня, якая і выяўляецца ў тым, што народ — сьвятое, няхай скажа народ.

Якасьць чалавечага матэрыялу немагчыма павысіць, пакуль ён — сьвяты. Сьвяты — гэта кансэрвацыя зоны і яе ладу жыцьця. Між тым, народ трэба будаваць. А перадусім зразумець, адчуць, пранікнуцца праўдаю пра тое, што гэта за народ.

***

Наша нацыянальная традыцыя ведае шмат такіх выразаў праўды пра народ. Гэта хрэстаматыйныя вершы, на якіх і выхоўваўся сучасны беларус. У Багушэвіча: "Дурны мужык як варона" — таму што — "Да навукі ён ня браўся, Закасіўся, заараўся"

Глядзі! Горы паразрыты,
А чыгункай сьвет абвіты:
Усё з мужыцкай цяжкай працы,
Усе едуць у палацы;
Ў мужыка ж няма білета!
Ці ж ня дурань мужык гэта?
Дык крычыце ж, біце ў звона:
Дурны мужык, як варона.

Сацыяльны матыў паўтарыў Купала:

Чытаць, пісаць я не умею,
Ня ходзіць гладка мой язык,
Бо толькі вечна ару, сею, —
Бо я мужык, дурны мужык.

У Купалы сканчасцца сьцьвярджальна: "Я буду жыць, бо я мужык!" Зразумела, што язык ад гэтага гладчэй хадзіць ня будзе. Наадварот, непісьменнасьць робіцца прадметам пэўнага гонару, каб неўзабаве, пасьля рэвалюцыі, перарасьці ў зусім ужо ганарыстае: Мы універсітэтаў не канчалі. І далей — да сакрамэнтальнага: народ — сьвятое.

Па-іншаму ацаніў свой народ Багдановіч. Адпаведна і верш ягоны выпаў са школьнай праграмы:

Народ, Беларускі Народ!
Ты — цёмны, сьляпы быццам крот.
Табою ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі зь ярма
І душу тваю абакралі, —
У ёй нават мовы няма.
Збудзіўшыся з грознай бяды,
Ўвесь поўны сьмяротнай жуды,
Ты крыкнуць ня вольны: Ратуйце!
І мусіш ты Дзякуй крычаць.
Пачуйце ж вы гэта, пачуйце,
Хто ўмее з вас сэрцам чуваць!

У гэтым тэкст ўжо няма й намёку на плебейскую гардыню, няма мужыцтва, якое сее-арэ і якому не да кніг. Тут — нацыя. Таму верш ахвотна пішуць на сьцягах сучасныя адраджэнцы. Але гэты верш таксама не забясьпечвае катарсісу, бо пакідае месца для самашкадаваньня — пакрыўджаны мы, маўляў, народ... Самашкадаваньне, як і сьвятасьць, таксама толькі кансэрвуе горшыя якасьці народу — тое, што трэба ў сабе ламаць.

Кірунак мужыцкай гардыні, абазначаны Багушэвічам і Купалам, за савецкі час пасьпеў расквітнець і да нашага часу вычарпацца. Цяпер такія вершы ўспрымаюцца як рэтраградзтва. А кірунак, абазначаны Багдановічам, толькі пачынае квола падымаць галаву.

Трэба сказаць так, каб не было месца для асалоды самапрыніжэньня і самашкадаваньня.

Сёньня на вуліцах колькі заўгодна пачуеш, што вакол пяздары, саўкі, адмарозкі. 200 гадоў расейскага панаваньня ў Беларусі ўсе лепшыя, здатныя, таленавітыя, актыўныя прадстаўнікі пакаленьняў вынішчаюцца яшчэ ў маладыя гады. Застаецца чалавечая рэшта. Як толькі падніялося пакаленьне — праходзіць каса. Такая вось своеасаблівая сэлекцыя, вывядзеньне новай пароды — ніякіх людзей.

"Вы народ?" — "Вы шэры скот", — піша сучасны паэт-пачатковец, намацваючы працяг катарсыснага кірунку. За гэтыя вершык, які, дарэчы, называецца "Трызьненьне Гамлета", "Наша Ніва" атрымала адно з папярэджаньняў Дзяржкамдруку. Матывацыя зразумелая: народ — сьвятое, не чапайце народ!

***

Магчыма, я завёў гутарку пра рызыкоўныя рэчы, але іншага выйсьця папросту няма. Ёсьць, вядома, грамадзянская вайна або нейкая пазытыўная дыктатура, калі сілком выбудоўваюцца пэўныя грамадзкія герархіі. Толькі якой цаной?! Прынамсі, сёньня яшчэ можна казаць пра ломку не хрыбтоў, а сьвядомасьці тых, хто ломіць свой край, пляжыць сваю сталіцу і ўхваляе антыдэмакратычны рэжым.

Беларуская нацыя сёньня — гэта сапраўды адстойнік саўка пасьля сацыялізму. Гэта не вандэя, а клаака. Але калі я зразумею гэта, я скірую ўсю сваю жыцьцёвую энэргію на тое, каб ня быць падобным да тых, хто побач, каб сьцьвярджаць сябе нармальным чалавекам на фоне іх. Я буду думаць пра тое, як і кто кажу, як іду па вуліцы — толькі б ніхто ні на сэкунду не атаясаміў мяне зь імі, з саўком. Я ня буду змагацца зь імі. Але я буду іншы ад іх і дзяцей сваіх выгадую іншымі, і дома ў мяне будзе па-іншаму. Толькі б ніхто не падумаў, што паміж намі ёсьць нешта агульнае.

Мы не павінны быць клаакай. А гэта яшчэ цяжэй, чым проста жыць, як цяпер. Бо гэта значыць пераўтварыць сваё жыцьцё не ў камфортную адзідку, а ў высьпачку свабоды і культуры. Памятаеце, у нас казалі пра прыбалтаў: ну, дык яны ж культурныя! Дык вось, з гэтага моманту я хачу пачуваць прыбалтам адносна саўка.

А разам з тым я буду цаніць кожную праяву нармальнасьці ў іншым чалавеку, кожную ветлівасьць і акуратнасьць, кожную спагаду і дапамогу.

Гэтае ўнутранае процістаяньне саўку — можа і мусіць стаць найвялікшай справай нашага жыцьця. Гэта адзіная энэргія, зь якой наш нерэлігійны, ненацыянальны, незабясьпечаны матэрыяльна чалавек можа ўзьвесьці тую цьвёрдую купіну пасярод жыцьця, якое ўяўляецца яму бяздонным балотам. Гэта энэргія хаценьня жыць.

Чалавек гучыць горда? Не. Кожны чалавек гучыць так, як ён гэтага заслугоўвае.

Сяргей Паўлоўскі

ЧАЧЭНСКІ ДЗЁНЬНІК

КАХАНЬНЕ ДА ЦЯЖКА

Сёньня мы працягваем публікацыю сэрыі матэрыялаў, якія нашы карэспандэнты прывезьлі з паездкі на прэзыдэнцкія выбары ў Чачэнію ў канцы студзеня.

Алу Тайсумава, старшыню чачэнскага дзяржкамітэту гуманітарнай дапамогі, нам паслаў сам пан Бог альбо спадар Алах. Дзьве гадзіны, самі ня ведаючы, мы ішлі да спазьненьня на апошні аўтобус. Потым пад нагамі таўкліся рознамасныя таксісты, прапануючы завезьці на палову шляху — на ноч гледзячы і за вар'яцкія грошы. І тут нехта зьверху зрабіў той шыкоўны жэст, накіраваўшы мне выратавальніка Алу.

— Будзеце жыць у майго брата, — скончыў ён нашу размову. Што такое "няёмка", Алу разумець не хацеў. І меў рацыю.

А чацьвертай ранку Грозны сьпіць, але нешта зашмат асьветленых вокнаў для горада, дзе такой парою на працу амаль нікому ня трэба... Некалі я закахалася ў гэты горад, як у чалавека, які захварэў на цяжкую хваробу. Сёньня яму ня сьпіцца... Але мы едзем у Новыя Атагі, каб зваліцца там як сьнег на галаву. Аб'езд узарванага маста праз Сунжу, пасты, зь якімі кіроўца дамаўляецца за паўхвіліны. Усё тут цяпер здаецца не такім!

Моладзь купкамі шыбуе да мячэцяў на першую малітву. Сьпеў мулы, які стане тут хутка замест будзільніка. Высокая брама, жанчына ў адным халаце выходзіць на мароз. Ідылічная карцінка працягваецца ў прыбранай гасьцёўні — любы чачэнец хутчэй памрэ, чым дасьць госьцю зразумець, што для яго няма гасьцёўні і пачастунку. Нясьпешная размова пад гарбату.

... А ў суседніх пакоях — мы не адразу гэта зразумелі — суцішваюць дзяцей. Мір'я, яна прачнулася першая, заплакала і сказала: "Я баюся! Гэта рускія!.."

"Навядзеньне парадку"... Назаўтра я зноў буду



лаяцца гэтай фразай. Ціха, скрозь зубы, ідучы па цэнтры горада. Царква, каля якой фатаграфаваліся — разбураная. А тады ж яе толькі адбудавалі! Высотныя будынкі, некалі амаль эмблема ваеннага Грознага — адсутнічаюць. Няма гатэлю "Каўказ". Няма цэлага кварталу шматпавярховак, ад сарака дамоў не засталося нават абломкаў. Няма некалі паўразбуранага маста. Няма гарадзкога ляндшафту, які быў у сьнежні 95-га!

"Навядзеньне парадку"... Некаторыя дамы зруйнаваныя разам з падваламі, у парку нічога не расьце нават вясной — сьляды глыбінных бомбаў і хімічнай зброі. І гэты нядаўні палігон — чыясьці радзіма!..

Паміж людзьмі з пачуваньнем уласнай радзімы існуе невытлумачальная повязь. Зь легендай Каўказа Вахам, празваным "Адзінокі воўк", мы наладзілі кнігаабмен. Ён падараваў мне кніжку вершаў свайго сябра-патрыёта, які прайшоў праз "фільтры" і вайну — Хасі Зібукаева. Вершы пра свабоду, з мноствам клічнікаў. Пра незалежную Ічкерыю напярэдадні акупацыі. Я ў адказ падпісала яму Адамовічава "Каханьне пад акупацыяй". На маё зьдзіўленьне, Ваха адразу пачаў чытаць і шмат чаго зразумеў.

— Твой сябра таксама сядзеў?

— Так. Толькі мы зь ім не знаёмыя.

Беларускую мову ў Чачэніі разумеюць мала. Выключэньне — некаторыя хлопцы з аўтаматамі, якія чулі ўкраінскую. Украінцаў тут увогуле згадваюць нярэдка і з павагаю. За тое, што ніколі не ваявалі за грошы.

— Мы зь імі разам сядзелі ў падвале палаца Дудаева...

— А ў нас іхныя сябры сядзяць. У іншым палацы...

Пасьля гэтых словаў тыя самыя бандыты-баевікі, якімі і мяне палохалі да першай чачэнскай камандоўкі, часам выказвалі дзіцячую наіўнасьць.

— Пайшлі хутчэй! — узрушваліся яны. — Да прэзыдэнта.

— Нашто?!

— Ну як? Хай ліст напіша. Вашаму.

Што яны разумеюць у "навядзеньні парадку"? Яны ж не расейскія кантрактнікі.

Тут мне згадаўся "Саша зь пісталетам" у тым ледзь адбудаваным гатэлі, якога ўжо няма. Ён быў п'яны бяз паху сьпіртнога, хваліўся геройствамі і запрашаў катацца на бэтээры з нарабаванымі дыванамі. Абяцаў спэцыяльна для нас распачаць буйную перастрэлку. А на калідоры тымчасам усчалася бойка паміж Сашавымі калегамі...

Кантрактнікі ў чачэнцаў выклікаюць устойлівую асацыяцыю з трыма рэчамі. Першая — разрабаваны дом са сьлядамі вялізных брудных ботаў. А яшчэ — "заградатрады" і фільтрацыйныя лягеры. Амаль канцэнтрацыйныя. Зьнявечаныя і апрацаваныя рэактывамі трупы ў скрынях з-пад снарадаў, фургоны са штабэлямі жывых людзей, у якіх рукі скручаныя дротам, "чыстка" падвалаў гранатамі... Амаль заўжды іх памяталі п'янымі. Таму іх ня толькі ня бралі ў палон ("срочнікаў" тут і цяпер шкадуюць). Кантрактнікаў, калі бралі, рэзалі, як жывёлаў. Іх ня лічаць за людзей. Зьдзекі за зьдзекі, нянавісьць за нянавісьць. Гэта страшна. Але ці бывае інакш?

"Фільтры" побач з Чачэніяй існуюць і сёньня. У Пяцігорску. У Маздоку. У апошні днямі трапіў хлопец з прозьвішчам Закаеў — ці аднафамілец, ці, можа, сваяк палявога камандзіра. Яго ўзялі проста так. Тыдзень мучылі, зьдзекваліся, цкавалі на яго сабак... Людзі, якія сталі сьведкамі, ня мелі дачыненьня да чачэнскага супраціву. Адзін зь іх працаваў у сьледчых органах пры Заўгаеве, за што пасьля зьмены ўладаў быў звольнены. Ён сёньня — у пэўнай разгубленасьці, але падставаў для наўмыснага "ачарненьня" фэдэралаў гэтыя людзі ня маюць, нашто ім хлусіць?

Вайна скончылася. Хто вам сказаў? Яна ідзе — на паперах. Пастанова нумар 434 — загад не рэгістраваць як бежанцаў асобаў чачэнскай нацыянальнасьці. Паводле зьвестак чачэнскіх службаў бясьпекі, ён ужо выконваецца на Стаўрапольлі і ў Дагестане. Альбо дарожна-камэрцыйная вайна. "Падатак" для расейскай міліцыі з чачэнцаў, што едуць у Чачэнію. Я ўжо распавядала некалі пра тое, як уцекачы ўратавалі нас ад пагрозы дэпартацыі, а мы іх — ад хабару. Ён складаў 200 расейскіх тысячаў зь бітком набітага "Ікаруса". Цяпер нас, журналістаў, не чапалі, мы не касілі пад чачэнцаў, не хаваліся за клункамі — і гэта слушна, бо так мае быць. Але ў спадарожнікаў двойчы ператрасаюць рэчы. Асаблівая ўдача — аўто з чачэнскімі нумарамі...

Вайна не сканчаецца проста так, яна жыве ў

Археалягічныя адкрыцьці сьвету

ГІСТОРЫЯ

Грабніцы македонскіх

Зрабіць сэнсацыйнае адкрыцьцё ў галіне антычнай археалёгіі Грэцыі амаль немагчыма. Дасьведчанасьць у старажытнай гісторыі гэтай краіны надзвычай вялікая. Увосені 1977 году ў Македоніі недалёка ад Тэсалёнікаў каля Вэргіны Маноліс Андранікас знайшоў царскі нэкропаль, што сталася адным з выдатных адкрыцьцяў у антычнай археалёгіі апошніх дзесяцігодзьдзяў. М.Андранікас, як і многія іншыя спэцыялісты, перакананы, што тут, каля старажытнай сталіцы Македоніі — горада Эгі, знаходзіцца грабніца цара Філіпа II — бацькі славутага Аляксандра Македонскага.

"8 лістапада 1977 году, — успамінае прафэсар Андранікас, — нам удалося нарэшце прыбраць замковы камень скляпеньня. Праз адтуліну я зірнуў у грабніцу, асьвятліўшы яе кішанёвым ліхтарыкам. Пахавальная камэра была квадратнаю, памеры яе 4,46х4,46 м. Мармуровыя дзьверы зачынялі ўваход у перадпакой. Сьцены аздобленыя досыць сьціпла — а мы меркавалі ўбачыць багаты росьпіс; можна было падумаць, што аздаблялі іх абы як і сьпешна. Аднак у пахавальнай камэры знаходзіліся дзьве групы рэчаў: у адным куце бронзавы посуд і зброя, у другім — срэбны посуд. На падлозе — куча згнілых дарэшты матэрыялаў упярэмешку з залатымі пласьцінамі. Проста пад адтулінаю я ўбачыў прастакутную мармуровую пліту, якая закрывала мармуровы саркафаг. Відовішча было ўражвальнае..."



Вёска Вэргіна разьмешчаная на паўночным схіле Піерыі, прыблізна за 70 км у паўночна-заходнім кірунку ад Тэсалёнікаў, недалёка ад горада Вэроі. Упершыню М.Андранікас, будучы студэнтам, апынуўся ў Вэргіне ў далёкім 1937 годзе. Тады ён прыняў удзел у раскопках, якімі кіраваў прафэсар К.А.Рамей. Ужо ў 1949 г. М.Андранікас стаў супрацоўнікам Грэцкай археалягічнай службы і, дзякуючы дзіўнаму зьбегу абставін, атрымаў прызначэньне ў Вэрою. Побач у Вэргіне Андранікас пачаў археалягічныя дасьледаваньні мясцовых старажытнасьцяў.

Увагу археоляга найперш прывабіў "Мегалі тумба". — Вялікі курган дыямэтрам 110 м і вышынёй 12,5 м, які паважна ўзвышаўся над іншымі шматлікімі магільнымі пагоркамі. Андранікас быў перакананы, што гэта курган элінскіх часоў і хавае пад насыпам вялікую македонскую грабніцу. У 1963 годзе, давёўшы раскоп да глыбіні 11,5 м, дасьледчык прыпыніў працу, і толькі ў 1976 годзе Андранікасу ўдалося ўзнавіць пошук падкурганнага пахаваньня.


Імпэту прыдавала тое, што ангельскі вучоны Ніклас Хаманд з Брыстальскага ўнівэрсытэту ў часопісе Athens Annals of Archaeology атаясаміў Вэргіну з старажытным Эге — першай сталіцай Македонскай дзяржавы.

Згубіўшы ў 1977 годзе больш за месяц на раскопкі Вялікага кургана і заглыбіўшы раскопкі да 15 м, прафэсар стаў губляць надзею на посьпех — пад насыпам не траплялася прыкметаў якога-небудзь збудаваньня. Аднак і гэтая праца не была марнаю, бо прымусіла працягваць пошук у іншым накірунку — паўднёва-заходнім, там, дзе пад краем Вялікага кургана ледзь заўважаўся невысокі больш старажытны з выгляду насып.

"Сьвяцілішча герояў" — так назваў М.Андранікас адкрытую пад гэтым насыпам надзвычай багатую, але разрабаваную яшчэ ў старажытнасьці грабніцу IV ст. да н.э. На верхняй частцы пахавальнага збудаваньня захаваліся фрэскі дзіўнай прыгажосьці, напісаныя на сюжэт выкраданьня Парсэфоны Плутонам. Бог падземнага царства імчыць на сваёй калясьніцы, трымаючы ў правай руцэ лейцы і скіпэтар, а левай абдымаючы аголены торс маладой багіні. "Упэўненасьць і лёгкасьць мазка, натхнёнасьць на тэму, — узрушана пісаў Андранікас, — і майстэрскае валоданьне пэрспэктывай гавораць пра тое, што гэты твор належыць пэндзлю вялікага майстра. Мяркую, што не зграшу супраць ісьціны, калі прыпішу фрэскі Нікамаху, знакамітаму грэцкаму мастаку сярэдзіны IV ст. да н.э., які часта зьвяртаўся па гэтай рэдкай тэмы і быў вядомы ня толькі дасканаласьцю сваіх твораў, але й тым, што працаваў надзвычай хутка". Гэта была першая знойдзеная ў Грэцыі фрэска IV ст. да н.э.

Аднак паўставала пытаньне: хто і чаму па-барбарску зьнішчыў пахаваньне? У Андранікаса на гэты конт быў адзін адказ: цар Пір у 274-273 гадах да н.э. Пір — цар Эпіра, прывёўшы ў Македонію наёмнікаў-галатаў, перамог яе цара Антыгона Ганата. Аднак апошні здолеў адваяваць сваю сталіцу — горад Эге, і пазьней, каб запабегчы рабаўніцтва іншых царскіх грабніц, насыпаў над імі Вялікі курган.

Разбураная наземная грабніца з рэшткамі ўнікальных фрэсак была толькі яркім уступам да незвычайных адкрыцьцяў Маноліса Андранікаса.



ПАДЗЕМНЫЯ ГРАБНІЦЫ

Раскопкі кургана ў 1977 годзе не прыпыняліся, бо ніжэй зьявіўся адмысловы фасад яшчэ адной грабніцы. Замест дарычных трыгліфаў і мэтопаў археолягам адкрывалася роўная паверхня сьцяны зь незвычайнымі росьпісамі, якія займалі плошчу 5,5х1,2 м. Асноўны сюжэт унікальнай кампазыцыі — сцэна паляваньня на дзікоў і львоў. Ужо толькі гэтыя фрэскі невядомага "мастака зь Вэргіны" маглі стаць найцікавейшым адкрыцьцём М.Андранікаса. Аднак праз нейкі час яго чакалі новыя шчасьлівыя ўзрушэньні.

Расчысьціўшы фасад грабніцы, археолягі нарэшце ўбачылі дзьверы, за якімі знаходзіўся ўваход у пахавальную камэру. Андранікасу шчасьціла — дзьверы былі цэлымі і знаходзіліся на сваім месцы. Няўжо спэцыялісты натрапілі на неразрабаваную грабніцу?!

Аднак прабірацца ў яе прыйшлося праз скляпеньні. Раскапаўшы дах пахавальнай камэры і зьняўшы адну з плітаў, археолягі 8 лістапада 1977 г. змаглі ўпершыню больш чым праз 2000 гадоў пасьля збудаваньня грабніцы зазірнуць у цёмнае склепішча...

Вышыня грабніцы дасягала 5,3 м, таму з даху ў яе апускаліся па прыстаўной лесьвіцы. На падлозе стаяла мноства бронзавых і срэбных пасудзін, ляжала вялікая колькасьць зброі. Ручкі посуду былі зробленыя ў форме галоў Геркулеса, Пана. Захаваліся рэшткі драўлянага рытуальнага шчыта, абцягнутага скураю. Яго паверхню ўпрыгожвалі шматлікія накладкі з золата і слановай косьці. Каля шчыта ляжаў жалезны шлем з грэбнем і выявай Атэны, кіраса, аздобленая львінымі галовамі з золата, рэльефнай фігураю Атэны, залатымі пласьцінамі. У драўляных, пакрытых золатам похвах захоўваўся меч.

Андранікас зьвярнуў увагу на дыядэму з золата і срэбра. Рэльефна вылучаная стужка ўвязвалася ў эфэктны вузел. Няўжо знакаміты "Гераклаў вузел", якім увенчваліся цары Македоніі? Рэчы з грабніцы, найперш посуд, паводле вызначэньняў М.Адранікаса маглі датавацца часам паміж 350-325 гадамі да н.э. Магчыма, у грабніцы пахаваны Філіп II, які быў царом Македоніі з 359 да 336 году да н.э. Філіп II Македонскі здолеў ня толькі ўмацаваць сваю краіну, але і сьцьвердзіў у 338 годзе да н.э. македонскую гегемонію над большасьцю грэцкіх полісаў.

Пад сьцяною пахавальнай камэры стаяў мармуровы саркафаг. На дне саркафага знаходзіўся залаты, цудоўна аздоблены куфэрак з прахам памерлага. Паводле тагачасных звычаяў, эліны спальвалі памерлых, зьмяшчаючы парэшткі ў пахавальную пасудзіну.

ХВОРАГА

памяці і ў падсьвядомасьці таксама. Калі ўмацоўваюцца межы і па памежных рэгіёнах бэтээры езьдзяць, як "Жыгулі", эмоцыі могуць выбухнуць. У дзень выбараў паміж Гірзэль-аулам і Хасаўюртам, на дагестанскім баку расейскі бэтээр урэзаўся ў КАМАЗ і аўтобус з чачэнцамі-выбаршчыкамі. "Чаму ён ехаў зыгзагамі? Гэта правакацыя!" — крычалі пасажыры. Расейскі вайсковец, адзіны пацярпелы (кіроўца КАМАЗа ледзь пасьпеў выскачыць з машыны, якая зьехала ў кювэт) стаяў з залітым крывёю ілбом і ўсьміхаўся Сяргею Кавалёву, як шкадлівы школьнік...

У Новых Атагах шпіталь Чырвонага Крыжа мяркуюць назваць імем Фэрнанды Палады, грамадзянкі Гішпаніі. Фэрнанда і яе калегі-місіянэры адмовіліся ад узброенай аховы, прапанаванай Шамілём Басаевым. У бальніцы зброі ня месца? Злачынцы не ўзялі са шпіталю ніводнае рэчы... акрамя шасьці чалавечых жыцьцяў. "Шпіталь трэба зачыняць, — кажуць у Міністэрстве аховы здароўя пасьля ад'езду з Чачэніі місіі Чырвонага Крыжа. — Вайны ўжо няма". А ў чачэнскіх лекараў з гэтага шпіталя — жалоба. "Гэтыя людзі павінны быць ганаровымі грамадзянамі Ічкерыі. Ім трэба паставіць помнік-абэліск, а імёнамі — назваць вуліцы". Гэтыя людзі — замежнікі, не чачэнцы, не мусульмане, але героі Чачэніі. Шпіталь у Атагах — бадай, адзіны тут, што застаўся бясплатным. Пакуль ратуе гуманітарная дапамога...

Іншыя іншаземныя героі Ічкерыі — тыя, хто ўдзельнічаў у вайне непасрэдна. Гэта грамадзяне краінаў ня толькі мусульманскага сьвету, але й былых нацыянальных ускраінаў былой імпэрыі. Для мусульманаў вайна была газаватам, зь якога, як кажуць мулы, героі з поля бою сыходзяць проста ў рай (і маюць права ўзяць з сабою да сямідзесяці зь нечым грэшнікаў, дарэчы). Чым быў газават для хрысьціянаў? Чым — для беларусаў, двое зь якіх пахаваныя на могілках — згодна са звычаем, пад мусульманскімі імёнамі, але пад назваю "Беларусь"? Чачэнцы ставяць каля такіх магілаў высокія бліскучыя слупы. Іх ушаноўваюць як магілы герояў, незалежна ад нацыянальнасьці, веры і грамадзянства. Затое ў тых "ускраінах", дзе незалежнасьць кульгае на маскоўскую міліцыю, кідаюць у турмы сваіх і чужых патрыётаў...

"Гэта наша вайна! Мы самі пра яе раскажам", — ня толькі беларускія журналісты ў камандоўках чулі гэтыя словы ад прадстаўнікоў фэдэральных органаў улады. Казахскія тэлевізійшчыкі распавядалі пра свае "чачэнскія", аналягічныя нашым, прафэсійныя праблемы. Таксама вершы падарылі — пераклад на расейскую паэмы казахскага паэта Рафаэля Ніязбэка. Паэма называецца "Ічкерыя".

Кіргіскі назіральнік расказваў, як трымаў перад домам ураду галадоўку ў знак пратэсту супраць аднабаковай інфармацыі. Лінард Мэрл, сябра Джахара Дудаева з Эстоніі, адзін з заснавальнікаў Арганізацыі непрадстаўленых народаў, прызнаўся: "Калі б Масква паспрабавала пашырыць уплыў на Эстонію — баюся, ці зможам мы аказаць гэткі супраціў, як тут". Шмат хто на былых "ускраінах" сур'ёзна задумаўся пра рэфармаваньне уласных збройных сілаў. Не кажу ўжо пра тое, што сваім "навядзеньнем парадку" Расея падштурхнула многіх былых васалаў з сацлягеру да NATO.

Адзін наш "усенароднаабраны" ў чачэнскім люстэрку адбівае ўсю нашу ўскраіну ў адваротным выглядзе. Сапраўды, хто ня цэніць чужую барацьбу за свабоду, той ня варты свабоды сам.

... У Грозным я спыталася ў сябры Эўрапарляманту Карла фон Хапзбэрга, нашчадка апошняга імпэратара Аўстра-Вугоршчыны:

— Калі б Вы былі імпэратарам — што б рабілі ў падобнай сытуацыі ў Вашым рэгіёне?

Спадар Карл адказаў, што такое можна ўбачыць толькі ў страшным сьне.

— Нацыянальныя дзяржавы мусяць мець незалежнасьць, свае мову, культуру, годнасьць. Тады пры дастатковым узроўні развіцьця будуць утварацца новыя саюзы дзяржаваў.

... На вакзале каля стэнду з раскладам руху цягнікоў мяне затрымалі хлопцы з аўтаматамі. Перапрасілі: ім трэба запісаць, хто, куды, навошта і гэтак далей. Людзі з атраду імя Радуева. Як і ўсе тутэйшыя "органы", расьсьледуюць забойства ў шпіталі Чырвонага Крыжа. Затрымалі брыгаду расейскага спэцназу: адзін чачэнец і дванаццаць асецінаў. Замоўцы забойства вядомыя, але іх не выдае пракуратура ў Маскве.

У пракуратуры Чачэніі гэта не абвяргаюць і не пацьвярджаюць. Многія злачынствы тут маюць заблытаныя, але ўсё ж часам яскравыя расейскія "карані". І ні разу не даводзілася чуць, каб "сьлед" вёў, напрыклад, у Беларусь, Украіну, Балтыю, Грузію... Кропкі над "і" у гэтым газавацэ і "навядзеньні парадку" калі-небудзь расставіць новы Нюрнбэрг. Калі ён не адбудзецца, ёсьць падставы меркаваць, што адказваць за злачынныя загады давядзецца тым, хто іх аддаваў. Іх адрасы і імёны ў Чачэніі, як і за яе межамі, ведаюць.

... Зранку ў любое надвор'е на адным са скрыжаваньняў непадалёк ад Аргуна стаіць старая і просіць міласьціну. Пра яе кажуць, што яна прыносіць шчасьце тым, хто падасьць. Бабуля бедна апранутая, на любое пытаньне адказвае: "Баркал" ("Дзякуй"), баіцца камэраў і жахаецца мужчынаў славянскае зьнешнасьці. Ніхто дакладна ня ведае, ці ёсьць у яе сваякі. Міласьціна для чачэнцаў — нетыповая рэч.

... Расейская бабулька. З тых, што "божы дзьмухавец" — сінія вочы, позірк дзіцёнка. Кватэру разбамбілі (гэта ў Грозным), туляецца па кутах. Пашпарт скралі разам з сумкай, таму пэнсію не даюць. На замену дакумэнтаў няма грошай. "Дапамажыце знайсьці гэтага чалавека, ён мой знаёмы, вялікі начальнік", — працягвае паперу. Мы ўражаныя: гэта "агітка" яшчэ з заўгаеўскіх 95-га году выбараў! "Бабуля, Ваш начальнік зьехаў за мяжу". Яна не разумее тлумачэньняў. Зноў даводзіцца тут падаваць старым. "Вось Вам на новы пашпарт". Яна ледзь ня плача: "Я не пра гэта!" Баевікі з аховы выбарчага ўчастку глядзяць на маю паперку з нулямі — "на пашпарт" гэтага мала — і моўчкі скідваюцца для сінявокай бабулькі. Яна не разумее, ідзе далей. "Дапамажыце знайсьці чалавека"...

А я не адразу паверыла расповедам пра тое, што частка расейскіх жыхароў Чачэніі зьехала, пакінуўшы тут сваіх старых. Дзе яны цяпер? "Няўжо ў Вас гэта так прынята?" — я ня ведала, што адказаць чачэнцам на такое пытаньне...

Як і мінулы раз, зьяжджаць не хацелася. Чачэнскі міліцыянт з Масквы зьдзіўляўся маім сьлязам. Але цяпер ужо больш цягнула дамоў, у Беларусь.

— У Вас там што, эпідэмія грыпу? Нехта ляжыць з тэмпэратурай? — пажартаваў чачэнец, які адчуваў часам падвоенасьць душы з-за таго, што напалову расеец.

— Але, хіба што гэтак, — засьмяялася я. — У нас — эпідэмія!..

Тацяна Сьнітко

цароў

Калі Андранікас адкрыў залаты куфэрак, то ўбачыў там прах памерлага, загорнуты ў пурпуровы пеплас і прыкрыты залатым вянком з дубовых лістоў і жалудоў.

Крэмаваныя косткі пазьней вывучалі антраполягі. Яны сьцьвердзілі, што пахаваны — мужчына 40-50 гадоў. Як вядома, Філіп II загінуў у 46 гадоў. Група ангельскіх вучоных Дж.Прэг, Дж.Мазгрэйв, Р.Ніў абсьледавалі рэшткі чэрапа нябожчыка і ўзнавілі яго абрысы. На правай скроневай косьці чэрапа заўважаліся сьляды загоенай глыбокай раны ад стралы. З жыцьцяпісаў Дыядора вядома, што Філіп II за 18 гадоў да свае сьмерці быў паранены стралою ў правае вока пры аблозе Мэтоны.

Вынікі антрапалягічнага дасьледаваньня сталі здабыткам навуковай грамадзкасьці праз нейкі час пасьля адкрыцьця грабніцы. Але, як ні дзіўна, у тыя напружаныя і адначасова шчасьлівыя дні М.Андранікасу ўдалося ўбачыць партрэт Філіпа II у адкрытай ім грабніцы.

ЦАРСКІЯ ПАРТРЭТЫ

Дасьледуючы грабніцу, Андранікас зьвярнуў увагу на рэшткі драўлянай мэблі, ад якой добра захаваліся залатыя і касьцяныя скульптуркі людзей і міфічных пэрсанажаў. Мініятуры настолькі рэалістычна перадавалі чалавечыя рысы, што ў некаторых зь іх прафэсар адразу здолеў убачыць партрэты царскіх асобаў, найперш Аляксандра Македонскага, яго маці Алімпіі і самога Філіпа II. "... Выдатная выява сталага мужчыны, крыху стомленага, зь ледзь заўважным намёкам на пашкоджаньне вока, якая выразна перадае валявы характар арыгінала," — піша пра партрэт Філіпа II М.Андранікас.

Антраполягі, якія ўзнавілі твар чалавека, пахаванага ў грабніцы, таксама прыйшлі да высновы пра яго структурнае падабенства са згаданай мініятурай. На залатым мэдальёне рымскага часу з Тарса Філіп II ня толькі падобны на выяву скульптуркі, але й паказваецца падсьлепаватым на правае вока, што пацьвярджала заключэньне Андранікаса.

Ідэнтыфікацыя партрэта Аляксандра Македонскага не выклікае асаблівых цяжкасьцяў. У музэях захоўваюцца скульптуры Аляксандра, праўда, найчасьцей зробленыя ўжо пасьля сьмерці знакамітага цара.

Андранікас прыйшоў у захапленьне ад майстэрства старажытнага скульптара. На думку прафэсара, у тыя часы на такое быў здольны толькі вялікі Леахар — атэнскі скульптар, набліжаны да царскага двара. Леахар пасьля 338 г. да н.э. выканаў скульптурныя партрэты сям'і Філіпа II. Ці ня мог той самы Леахар адначасова зрабіць у сваёй майстэрні мініятурныя партрэты сям'і Філіпа і ўпрыгожыць імі царскую мэблю?

Аднак, разам з тым, вядомая мастацтвазнаўца М.Лясьніцкая, аналізуючы стылістыку і вобразнасьць твораў з македонскай грабніцы, мяркуе, што аўтарам іх мог быць ніхто іншы як Лісіп. Тым ня менш, усе дасьледчыкі пагаджаюцца, што ў грабніцы знойдзеныя ўнікальныя скульптурныя творы грэцкага мастацтва IV ст. да н.э., якія зьдзіўляюць сваім рэалізмам і дасканаласьцю перадачы формаў.

ІНШЫЯ АДКРЫЦЬЦІ

Да пахавальнай камэры грабніцы далучалася яшчэ адно невялікае памяшканьне — пярэдні пакой. Патрапіўшы ў яго праз зробленую ў сьцяне адтуліну, архэолягі ўбачылі ўтульнае памяшканьне, атынкаванае ў белы і чырвоны колеры. Паўсюль было шмат золата, шкла. На сьценах — сьляды шыкоўных фіранак. У кутку стаяў саркафаг. Каля яго — вянок з залатых лістоў і кветак мірты.

Побач з саркафагам стаяў залаты калчан з барэльефамі, якія адлюстроўвалі падзеі Траянскай вайны. Недалёка ляжала пара паножаў, адна зь іх, левая, была карацейшая і вузейшая за правую. Паножы, ці інакш кнеміды, маглі належаць Філіпу II, бо, як вядома з гістарычных паведамленьняў, македонскі цар кульгаў.

У мармуровым саркафагу знаходзіўся куфэрак з чалавечымі парэшткамі. Косткі былі акуратна загорнутыя ў пурпуровую тканіну з залатымі ніткамі. У цемры блішчала золатам жаночая дыядэма ў выглядзе кветак і галінак.

Перад Андранікасам паўставала пытаньне: калі ў асноўнай камэры знаходзіўся прах Філіпа II, то хто тады быў пахаваны ў пярэднім пакоі. Антрапалягічны аналіз костак з саркафага дазволіў вызначыць, што гэта была жанчына 23-27 гадоў. Няўжо жонка Філіпа II? Калі так, то толькі не Алімпіяда, як мяркуе прафэсар, а Клеапатра...

Андранікас так захапіўся пошукамі, што праз нейкі час побач зь першаю грабніцай адкрыў яшчэ адну — трэцюю, якую ён таксама далучыў да ліку царскіх магілаў. Фасад трэцяй грабніцы некалі таксама аздабляўся фрэскамі. На месцы саркафага ў пахавальнай камэры стаяла срэбная гідрыя з прахам хлапчука 12-14 гадоў. Пахаваньне суправаджалася багатымі дарамі і царскімі сымбалямі. Мяркуецца, што ў грабніцы пахаваны сын Аляксандра Вялікага ад Раксаны — Аляксандар IV, якога абвясьцілі царом пасьля сьмерці бацькі, а пазьней — у 310 ці 309 годзе да н.э. забілі.

Раскопкі праведзеныя Андранікасам у Вэргіне ў 1982 годзе прынесьлі новыя сэнсацыйныя адкрыцьці. Археоляг знайшоў гарадзкі тэатар, у якім, паводле гістарычных сьведчаньняў, улетку 336 г. да н.э. быў забіты Філіп II, а яго сына Аляксандра вайскоўцы абвясьцілі царом. Удалося таксама адшукаць гарадзкія ўмацаваньні, якія сьведчылі пра тое, што Эге быў надзвычай вялікім горадам.



1987 год. Новае адкрыцьцё — грабніца, якую ў гонар прафэсара Рамея (Рамаёса) — аднаго зь першых дасьледчыкаў у Вэргіні назвалі "грабніца Рамаёса". На думку спэцыялістаў, "грабніца Рамаёса" была ўзьведзеная ў VI ст. да н.э. Гэта пакуль самая раньняя грабніца зь ліку знойдзеных у старажытнай сталіцы Македоніі.

Пасьля першых навуковых публікацыяў вынікаў раскопак, узьнікла некаторая палеміка і найперш вакол другой грабніцы, якую Андранікас упэўнена атаясамляў з пахаваньнем Філіпа II. Аналізуючы сэнс некаторых сымбаляў грабніцы, А.Ніверау спрабаваў пераканаць, што ў грабніцы пахаваны нехта іншы, ва ўсялякім разе не Філіп II. Свае аргумэнты супраць прыналежнасьці грабніцы Філіпу выказвалі Х.Юкер, А.Манцэвіч, А.Аляксееў. Швэйцарскі археоляг Юкер, не знаходзячы ў царскіх грабніцах чырвонафігурнай керамікі, росквіт якой прыпадае ў Грэцыі менавіта на IV ст. да н.э., сумняваецца ў слушнасьці датаваньня магілаў. Гарыт (калчан) з сцэнамі Траянскай вайны мае аналёгіі ў Прычарнамор'і і можа датавацца, як сьцьвярджае А.Манцэвіч, часам крыху пазьнейшым за сьмерць Філіпа II.

Аднак апанэнты ня могуць пакуль пераканаць спэцыялістаў і істотна паўплываць на ключавыя высновы Андранікаса. Па-за палемікай застаюцца яго галоўныя аргумэнты: партрэтнае падабенства скульптуры Філіпа і ўзноўленага зьнешняга аблічча пахаванай царскай асобы ў вялікай грабніцы, наяўнасьць царскіх сымбаляў і найперш царскай дыядэмы македонскіх цароў, прысутнасьць у пярэднім пахавальным пакоі пары кнемід, адна зь якіх карацей і вузей за другую, а таксама праха маладой Клеапатры — апошняй жонкі Філіпа, якую забілі на загад Алімпіяды.

Летнім вечарам 366 г. да н.э. у старажытнай сталіцы Македоніі завяршаліся ўрачыстасьці шлюбу дачкі Філіпа II з царом Малосіі Аляксандрам. Праз колькі дзён Філіп павінен быў ехаць да свайго войска, якое дзейнічала супраць пэрсаў у Малой Азіі. Філіп накіроўваўся ў тэатар, дзе ішла апошняя падрыхтоўка да заключных шлюбных цырымоніяў. Каля Філіпа, акрамя шматлікай варты і сьвіты, былі два Аляксандры — сын і зяць. У вузкі праход тэатра першымі ступілі Філіп, два Аляксандры і целаахоўнік Паўсані, варта і сьвіта адсталі. Праз некалькі сэкундаў Паўсані кінжалам забіў Філіпа.

Вялікая грабніца, якую знайшоў Андранікас, стала апошнім прыстанкам знакамітага цара. Суайчыньнікі Філіпа стварылі ў ягоны гонар грандыёзнае пахавальнае збудаваньне — адмысловы музэй раньняга элінізму. Сёньня знаходкі з царскіх грабніц старажытнай сталіцы Македоніі можна ўбачыць у Археалягічным музэі Тэсалёнікаў.

Мікола Крывальцэвіч

На здымках: выява цара Філіпа II; фасад грабніцы; саркафаг з парэшткамі цара Філіпа II.

ВОСТРАЎ СЬМЕРЦІ

"І.В.Сталіну, Р.І.Эйхе
Сакратару Нарымскага Акругкаму
ВКП(б) К.І.Левіц
(Зусім сакрэтна)
22 жніўня 1933 году.

29 і 30 красавіка гэтага году з Масквы і Менску былі адпраўленыя на працоўнае пасяленьне два эшалёны дэклясаваных элемэнтаў. Гэтыя эшалёны, падбіраючы на шляху праходжаньня падобны ж кантэнгент, прыбылі ў Томск, а затым на баржах у Нарымскую акругу.

18 траўня першы і 26 траўня другі эшалёны, якія складаліся з трох баржаў, былі высаджаныя на рацэ Обі ў вусьці р. Назіна, на востраў Назіна, насупраць асьцяцка-расейскага пасёлка і прыстані пад гэтай самай назвай (Аляксандраўскі раён, паўночная ўскраіна Нарымскай акругі)"...

(З спэцпаведамленьня УНКВД па Захсібкраю)

Пра якія "дэклясаваныя элемэнты" ішла гаворка ў такім сакрэтным дакумэнце? Аказваецца, гэтыя "элемэнты" зьявіліся ў справаздачах НКВД пасьля выхаду пастановы ЦВК і СНК СССР за 27 сьнежня 1932 году аб увядзеньні пашпартнай сыстэмы.

Менавіта на востраў Назіна 18 траўня 1933 году была дастаўленая першая партыя "элемэнтаў гарадзкога тыпу", людзей, затрыманых пераважна ў Менску і Маскве як бяспашпартных — 4900 чалавек. Другая партыя — 1174 чалавекі — паступіла 27 траўня. Да 12 чэрвеня было зарэгістравана 1473 памерлых. Да зімы загінулі амаль усе. З 10.289 чалавек, якія прыбылі ў Аляксандра-Вахтаўскую камэндатуру, да верасьня засталося 2025; 1940 — адпраўленыя ў канцлягеры, 3196 — памерлі, 3916 уцяклі. Гэта лічбы афіцыйных архіўных, нядаўна яшчэ зусім сакрэтных дакумэнтаў.

Што ж адбылася ў 1933 годзе на Назінскім востраве ў далёкім Заходне-Сібірскім краі?

На другі дзень прыбыцьця першага эшалёну, 19 траўня, выпаў сьнег, падняўся вецер, затым ударыў мароз. Галодныя, зьнясіленыя людзі, бяз даху над галавой, ня мелі аніякіх інструмэнтаў і, у пераважнай сваёй масе, навыкаў барацьбы за выжываньне, апынуліся ў безвыходным становішчы. Абледзянелыя, яны былі здольныя толькі паліць вогнішчы, сядзець, ляжаць каля агню, блукаць па востраве і есьці гнілушкі, кару, мох... Трое сутак нікому ніякага харчаваньня не выдавалася. Па востраве пайшлі пажары. Людзі пачалі паміраць.

Яны зажыва згаралі каля вогнішчаў пад час сну, паміралі ад зьнясіленьня і холаду, ад вільгаці, якая панавала навокал. Холад пераносіўся так цяжка, што адзін зь перасяленцаў залез у дупло падпаленага дрэва і загінуў там на вачах у людзей, якія не маглі дапамагчы яму: не было ні лесьвіцы, ні сякераў. У першыя суткі пасьля сонечнага дня брыгада магільшчыкаў змагла закапаць толькі 295 трупаў, непрыбраных пакінулі на наступны дзень. Новы дзень даў новую сьмяротнасьць.

Пасьля сьнегу й марозу пачаліся дажджы і халодныя вятры, але людзі ўсё яшчэ заставаліся без харчаваньня. Толькі на чацьверты дзень на выспу прыбыла жытнёвая мука. Яе пачалі раздаваць па некалькі соцень грамаў. Людзі беглі да вады і ў шапках, фуражках, галёшах разводзілі баўтушку, а большасьць проста хапалі муку ротам і задыхаліся, паміралі.

Усё сваё жыцьцё на востраве (ад 10 да 30 сутак) працпасяленцы атрымлівалі муку, але ня мелі ні посуду, ні даху над галавою. Таму сытуацыя не зьмянялася. Неўзабаве на востраве пачалося людажэрства.

Сьведчыць Меньшыкава Таісія Міхайлаўна, 1908 году нараджэньня, ураджэнка Менску: "На востраве канваір быў, Венікаў Косьця, малады хлопец. Заляцаўся да адной дзяўчынкі. Ён усё пільнаваў яе. Надумаў аднойчы паехаць памыцца, таварышу наказаў: "Вы за ёй паглядвайце", — а ён што, столькі народу... А яе прывязалі, рукі назад да таполі, і грудзі адрэзалі ёй, лыткі адрэзалі, цяглiцы — дзе толькі можна есьці, усё-ўсё... Галодныя яны, есьці трэба. Хлопцу не пашанцавала. Вось гэта такія былі зьверствы. Чалавечае мяса рэзалі і прывязвалі ў анучах на дрэвы..."

На востраве быў камэндант, стралкі ВОХР, мэдработнікі і, безумоўна, каптэрнармусы. Мука знаходзілася пад адкрытым небам і сапсавалася ад дажджу. Ня гледзячы на людажэрства, камэндатура закапвала ў зямлю тысячы кіляграмаў мукі. Рэшткі, што выдаваліся, траплялі далёка ня ўсім. Яе атрымлівалі так званыя брыгадзіры — з крымінальнікаў. Атрымаўшы мяхі на "брыгаду", яны зносілі іх у лес, а "брыгада" заставалася бязь ежы. Калі ўпершыню на востраў прывезьлі муку і хацелі раздаваць у парадку жывой чаргі, галодныя людзі скупіліся каля харчу. Тады ахоўнікі адкрылі па іх страляніну. Пры гэтым менш было ахвяраў ад стрэлаў, чым заціснутых, зьнявечаных, затаптаных у бруд галодным натоўпам.

Трэба меркаваць, што камэндатура вострава і вайскоўцы, па-першае, мала разумелі свае задачы, а па-другое, разгубіліся. Інакш нельга расцаніць сыстэму зьбіцьця працпасяленцаў палкамі і прыкладамі вінтовак, індывідуальныя расстрэлы...

Фактычна на востраве панавалі марадзёрскія банды і шайкі. Яны тэрарызавалі людзей яшчэ ў баржах, адбіраючы хлеб, вопратку, зьбіваючы і забіваючы. На востраве пачалося сапраўднае паляваньне на людзей, на тых, у каго былі грошы альбо залатыя каронкі. Іх уладальнікі прападалі вельмі хутка. Магільшчыкі закопвалі трупы з разварочанымі сківіцамі.

Марадзёрства ахапіла і некаторых ахоўнікаў, якія за хлеб і тытунь скуплялі золата, вопратку. На востраве ўсталяваліся цэны: новая сукенка альбо гарнітур — паўбохана хлеба альбо пачак махоркі; 1 пачак махоркі — 300 рублёў, два залатыя зубы альбо чатыры каронкі. Разбой узмацняўся, сьмяротнасьць расла. Якой-небудзь фізычнай вытворчай працы за ўвесь час знаходжаньня на востраве працпасяленцам не давалі. Тыя, хто ня рухаўся, паміралі першымі.

У такія самыя абставіны трапіў і другі эшалён, які хутка ўспрыняў парадкі, якія ўсталяваліся на востраве. Але набліжалася вясна. У канцы траўня пачалася адпраўка людзей на так званыя ўчасткі, г.зн. месцы, адведзеныя пад пасёлкі.

Участкі былі разьмешчаныя па рацэ Назіна за 200 км ад вусьця: да іх падымаліся на чаўнах. Гэта была глухая няжылая тайга, таксама не падрыхтаваная для расьсяленьня. Зьнясіленьне людзей працягвалася. Дастаткова прывесьці такі факт. На пяты ўчастак з вострава прыйшоў човен з 78 пасяленцамі. Зь іх у жывых засталося толькі 12.

Уцёкі, якія пачаліся яшчэ на востраве (там гэта зрабіць было цяжка: шырыня Обі каля кілямэтра, яшчэ ішоў лёд), тут прынялі масавыя маштабы. У адказ пайшлі розныя правакацыі. Найважнейшыя зь іх дзьве: маўляў, па-першае, вырашана зьнішчыць дэклясаваны элемэнт; а па-другое, — за 40 км чыгунка (у сапраўднасьці да бліжэйшай станцыі было больш за 400 км). Апошняе "пацьвярджалася" тым, што на адным з участкаў на ясным золку чуваць было аддалены гармонік, крык пеўня і гукі, падобныя да гудка. Гэта быў малюсенькі пасёлак, ад якога ўчасткі аддзяляла непраходнае балота. Людзі, ня ведаючы, дзе яны, беглі ў тайгу, плылі на плытах, гінулі або вярталіся назад.

Пасьля перасяленьня на новыя ўчасткі да будаўніцтва паўземляных баракаў, вашабоек і лазьняў прыступілі толькі ў другой палове ліпеня. Жыцьцё пачало ўваходзіць у сваё рэчышча — зьявілася праца. Аднак здароўе людзей было настолькі падарванае, што нават зьядаючы па 750-1000 грамаў хлеба, яны працягвалі хварэць і паміраць.

"ШТО ЯНЫ ВЫРАБЛЯЛІ!.."

Партызанскімі сьцежкамі — 4

Памятаю, калі малым я настойліва дапытваў дзеда, чаму ён не пайшоў у лес пры немцах, дзед адмоўчваўся ды пераводзіў гутарку на іншую тэму. Пазьней, ужо пасьля ягонай сьмерці, я даведаўся ад бацькі, што дзеда вадзілі на расстрэл партызаны. Яны хацелі, каб ён зьняў з ног свае боты і аддаў ім. Дзед нават перад пагрозаю сьмерці не хацеў аддаваць начным прыблудам сваё дабро. Толькі выпадак выратаваў яму жыцьцё...

Ня думаў я тады, што мне давядзецца прайсьці партызанскімі сьцежкамі, на якіх было болей гора і крыві, чымся геройства і подзьвігаў. Але ўжо ў той час я адчуў, як нэгатыўна настроеныя былі вяскоўцы да савецкай партызанкі. Ня ведаў я тады галоўных прычын гэтага дый не хацеў іх шукаць, бо ўсё яшчэ адчуваў узьдзеяньне мэмуарнай літаратуры былых савецкіх партызанскіх камандзіраў. Трэба прызнаць, што чытаюцца гэтыя кнігі зь цікавасьцю, як дэтэктыўна-прыгодніцкія раманы. Цягнікі дзясяткамі ляцяць з рэек, паліцаі сотнямі здаюцца ў палон, немцы толькі й робяць, што шастаюць па лясах, шукаючы партызанскай кулі, а насельніцтва з радасьцю аддае камісарам свой пажытак.

Усё пачалося выпадкова. Неяк былы эсбээмавец Уладзімер Ш. сказаў мне, што жыве ў горадзе стары антыкамуніст, у якога "старыя рахункі з бальшавіцкімі бандытамі". Пасьля першай кароткай размовы з Васілём Струпаўцом я і вырашыў прайсьці партызанскімі сьцежкамі.

***

У невялічкую вёску Я-чы (Слонімшчына) я прыехаў у пачатку жніўня. Лес абкружае яе з усіх бакоў і пачынаецца адразу за панадворкамі. Шмат хатаў ужо пустуе: гаспадары або паўміралі, або зьехалі ў недалёкі Слонім. У сваю чаргу, слонімцы пачынаюць будаваць каля вёскі свае лецішчы. Гадоў праз дзесяць Я-чы стануць звычайным "дачным поселком"...

Васіль Струпавец паказваў мне хату, дзе савецкія партызаны расстралялі ягоную сям'ю. У гэты момант да нас падыйшла старая жанчына. Я запытаўся ў яе пра савецкую партызанку.

— Рабавалі яны нас кожны Божы дзень, — гаворыць Яўгенія Афанасеўна Ш., — Што яны выраблялі!.. Ад немцаў у нашай вёсцы ні адзін чалавек не загінуў, а партызаны забілі 45 вяскоўцаў. Толькі некаторыя пахаваныя па-людзку, на могілках. Большасьць людзей вазілі ў лес, там забівалі, там і закопвалі... Маю сястру, Надзю, забілі, пакінулі пяць яе дзяцей сіротамі. Зарэзалі, каб забілі!.. 70 ран ёй зрабілі — паролі кінжалам. Грудзі адрэзалі, язык... А да таго па чарзе хадзілі да яе (гвалтавалі)... Адкуль я гэта ведаю? Сын Надзі там быў. Калі партызаны прыехалі на возе ў вёску і забралі Надзю, ён пабег за імі ў лес. А яны прымушалі яго, каб ён памагаў ім родную маці рэзаць! Сярожа сказаў ім: "Расстраляйце мяне, а я рэзаць ня буду". Дык партызаны заставілі яго ім кроў з рук змываць... Пасьля далі яму каня і ён да нас прыехаў. Я пытаюся ў яго: "Сярожа, а дзе мама?" "А я ня знаю, я ня бачыў мамы," — адказвае. Гэта ўжо пасьля ён расказаў усё людзям.



Васіль Струпавец. Восень 1996 году.

Шмат фактаў злачынстваў савецкіх партызанаў запісаў я ў той вечар. Запісаў і прозьвішчы катаў (некаторыя яшчэ жывуць), а таксама іх палюбоўніц ("сувязных"), якія падказвалі, каго трэба паставіць да сьценкі. Усе яны ў героях ходзяць, таму пакуль ня буду называць іх прозьвішчы, як і прозьвішчы забітых і сьведкаў тых злачынстваў, бо не хачу прынесьці шкоды гэтым людзям, якія й так мелі досыць гора. Пачакайма лепшых часоў.

Васіль Струпавец, які цудам выжыў пасьля расстрэлу яго сям'і, распавёў мне пра той красавіцкі дзень 1943 году:

— Я ведаў гэтых партызанаў, бо мы, падлеткі, іх кармілі, употайкі ад бацькоў. Спачатку яны хаваліся ў нас то ў стозе, то ў гумне. А на пачатку 1943-га яны ўжо пачалі па вёсках езьдзіць і ўжо не пыталіся, а самі забіралі ў людзей, што хацелі. Заўсёды п'яныя былі, і камсамолка нейкая зь імі, усё зь вінтоўкаю хадзіла...

Першую выбілі сям'ю Мікалая С. — 5 чалавек. У яго скуранку патрабавалі, што ён з Францыі прывёз (нехта сказаў ім пра яе, але ж скуранку С. ужо прадаў)... Раніцай мы прыйшлі ў іх хату... На ложку дзьве дзяўчынкі ляжалі. Мазгі і кроў былі на сталі, на сьценах... Маці на падлозе ляжала. Гаспадар цераз парог пераходзіў, там і ляжаў. А бабуля на печы была — яе там з нагана застрэлілі...

Ну, далей наша чарга прыйшла... Гэта быў чацьверты дзень Пасхі. Прыехалі да нас пяць партызанаў на конях: З. (камандзір атрада), Пеця "Чубаты" (начальнік штабу), "Сібірак" і яшчэ двох. А бацька ляжаў на ложку, адпачываў. Газэту ці кнігу чытаў, ня памятаю ўжо. Мы прыбеглі ўсе ў хату. А ў нас хрысьціны былі — на стале водка стаяла. Пеця, як зайшоў у хату, адразу за стол сеў, выпіў стакан гарэлкі. А астатнія партызаны на вуліцы стаялі, пад вокнамі, нібыта нешта вырашалі.

Пеця забраў са стала мой ножык у кішэню. Я стаў прасіць: — Дзядзя Пеця, аддайце ножык! А ён гаворыць: — А он тебе больше не понадобится.

Падняўся бацька. У яго Пеця забраў пашпарты і пайшоў на вуліцу. Хвіліны праз тры нікога не было... Заходзіць у хату З. з кулямётам. І Ваня "Сібірак" зь вінтоўкай (Пеця застаўся на вуліцы). Сказалі яны на нас брыдка, матам, сагналі ўсіх у вугал хаты. — К стенке! — крычаць. І ўцякчы няма куды — за вокнамі нас чакаюць... Адным словам, сталі мы разьвітвацца, а ён нешта з кулямётам капасецца. Я яшчэ сказаў бацьку: "Тата, ды яны шуцяць!" — Сынок, бандыты ня шуцяць... Бацька мой гусарам быў, служыў у царскай ахове, меў тры георгіеўскія крыжы, а пасьля рубаў чырвоных у грамадзянскую вайну. Ён мог абараніцца і кулямёт адабраць, каб ня я. Я яму перашкодзіў, калі кінуўся на шыю... З. страляў з кулямёту. Першым быў забіты бацька, пасьля разрыўная трапіла ў галаву маме, пяць куль увайшлі ў мяне... Я не згубіў прытомнасьці. Я чуў, як яны запальвалі паперу на твары ў бацькі, як ботамі разьбівалі галоўку маёй маленькай сястрычцы (яна была яшчэ жывая), як дабівалі штыхамі і прыкладамі маіх братоў і мяне. Мне прыкладам дзьве рабрыны зламілі. Партызаны білі п'яныя, інакш я ня выжыў бы... Пасьля яны вынесьлі з хаты ўсё, што можна было вынесьці і запалілі яе.

Ня ведаю, як Бог даў мне цярпеньня і сілаў, каб перажыць усё гэта... Памятаю, як яны выходзілі, З. сказаў: "Пусть б... коптятся".

Цяжка паранены Струпавец здолеў патушыць полымя і адпаўзьці ў другую хату. Толькі раніцай яго знайшлі суседзі і адвезьлі, разам з параненым братам Аркадзем, у слонімскую бальніцу. Там яму зрабілі некалькі апэрацыяў. Ён выжыў, але застаўся на ўсё жыцьцё інвалідам.

Тады да яго ў бальніцу часта прыходзілі аднавяскоўцы. Ад іх ён даведаўся, што бацька, маці, два браты і сятра былі пахаваныя, але партызаны вельмі злаваліся, што засталіся жывыя сьведкі. Пасьля таго сьведкаў яны ўжо не пакідалі — стралялі людзей у патыліцу... А Праскоўю Д. з 13-гадовым сынам зьвезьлі ў лес, зьвязалі

Натуральна, сьмяротнасьць можна было скараціць да мінімуму. Трэба было выдаваць хворым сухары. Пры адсутнасьці мэдыкамэнтаў гэта выратавала б сотні людзей. Велізарны запас галетаў ляжаў у палатках і на базах, але... Не было загаду, ці могуць карыстацца гэтымі галетамі працпасяленцы.

Усё апісанае вышэй стала бытам, настолькі прымільгалася начальнікам і работнікам участкаў, што трупы, якія ляжалі на сьцежках, у лесе, плылі па рацэ, прыганяліся да берагоў, ужо не выклікалі эмоцыяў. Чалавек перастаў быць чалавекам.

У выніку з 6100 чалавек, якія выбылі з Томску, плюс да іх яшчэ 600-700 чалавек (дакладна ўстанавіць не ўдалося), перакінутых на назінскія ўчасткі зь іншых камэндатур, на 20 ліпеня 1933 году засталося 2200.

Усё гэта, асабліва востраў, засталося незабыўным таўром на памяці ўсіх, хто выжыў. Востраў быў празваны Востравам сьмерці, Сьмерць-востравам (радзей — Востравам людажэраў). Мясцовае насельніцтва засвоіла гэтую назву, а пагалоска пра тое, што тут адбылося, пайшла ўніз і ўверх па рэках.

У канцы 1933 году сюды з Навасібірску прыйшлі адразу два параходы з пустымі баржамі. Сіблаг вырашыў эвакуяваць тых, хто застаўся жывы. Палова назінцаў не маглі сваёй хадою прайсьці па трапах на баржы, настолькі яны былі хворымі альбо зьнясіленымі. Іх несьлі на насілках і складвалі радамі ў трумах. Катэр "Хуткі" на малых баржах падвозіў тых, хто застаўся жывы на ўчастках.

Напрыканцы "эвакуацыі" Аляксандраўска-Ваханская ўчастковая камэндатура "ладвяла вынікі". Прыняла яна звыш 6000 чалавек, а адправіла 2856. Астатнія пайшлі на "натуральную страту".

Колькі ўсяго іх было — цяжка сказаць. Таксама цяжка сказаць, ХТО яны, таму што дакумэнты адбіраліся і пры арыштце, і ў эшалёнах і баржах (рэцыдывістам на паленьне). Тое, што засталося, было зьнішчанае часткова на востраве, часткова потым органамі дзяржбясьпекі. Для ліквідацыі сьлядоў злачынства.

Ігар Кузьняцоў

рукі дротам і кінулі ў калодзеж...

Была расстраляная і сям'я Т. Перад расстрэлам партызаны па чарзе гвалтавалі 17-гадовую Іру, а пасьля прымушалі яе граць на гітары. "Павесяліўшыся", каты паставілі ўсіх да сьцяны...

Спачатку мне не хацелася верыць у гэта. Нас прывучылі, што з такім цынізмам забівалі сваіх ахвяраў толькі эсэсаўцы. А тут злачынствы ўчыняла кіраўніцтва савецкага партызанскага атрада, не якія-небудзь шараговыя "разложившиеся элементы". Сярод іх былі ня толькі "ўсходнікі"-акружэнцы, але і мясцовыя. Сапраўды, гэта не былі партызаны, гэта была БАНДА. Яе структура адпавядала крымінальным законам: тут табе і "пахан", і "шасьцёрка", і "мужыкі", якіх пасылалі на "заданьні", тады самі п'янствавалі, забівалі, гвалтавалі.

Пасьля я спрабаваў зразумець, чаму людзі ня помсьцілі за сваіх забітых крэўных? На вачах сына забівалі маці, ён бачыў, хто гэта зрабіў, але нават і не падумаў пра помсту. Чаму?.. Васіль Струпавец кажа:

— Я дабіваўся, каб гэтых бандытаў судзілі (З. і "Сібірак" жылі пасьля вайны ў Слоніме, абодва ўжо не жывуць). Бо я адзін застаўся. Зь пяці сем'яў нікога не засталося наогул. Пісаў Хрушчову. Прыяжджаў да мяне палкоўнік КГБ зь Менску. Гаворыць, што З. у бальніцы ляжыць, а "Сібірак" недзе на рыбалцы, яго не знайшлі... І гэта мне гаварыў палкоўнік КГБ! Я ня вытрымаў, кажу: "Я сам яго заб'ю!" Кажа: "Отвечать будешь". Ну дык давайце судзіць, народ іх будзе судзіць. З. не адзін будзе! — кажу, яшчэ зь Менску тут многія будуць. Тут уся Беларусь замешана будзе ў гэтым". Ён толькі сказаў: "Твоё дело". Я яшчэ восем гадоў змагаўся, а пасьля паехаў у Сібір...

Усё ж некаторыя злачынцы з гэтай банды былі пакараныя. У ліпені 1944 году, калі ўжо немцы ўцяклі, галоўны кат прыйшоў у вёску па самагон. Ня ведаў ён, што ў вёсцы ўжо быў аддзел Чырвонай Арміі. Людзі зьвярнуліся да афіцэра і паказалі на бандыта і забойцу. Салдаты раззброілі яго і пасьля кароткага суда расстралялі.

А адна "сувязная" бандыцкага адтрада даведалася пра гэта, пабегла ў лес і крычала: "Цякайце, Чырвоная Армія прыйшла, А. забілі!.."

Сяргей Ёрш

P.S. Усе ўспаміны мною задакумэнтаваныя.

ГІТЛЕР — "ВЯЛІКІ" ЦІ КОЖНЫ З НАС?

Сёньняшняя "хваля Гітлера" трапляе на добры момант глябальных пераацэнак. Адно з пытаньняў, якія ставіць сучасная кінэматаграфічная і кніжная "гітлерыяна", — ці быў Гітлер вялікім?

Распад СССР падахвочвае да параўнаньняў нямецкага нацызму і савецкага камунізму. Адсюль зацікаўленьне ў сьвеце двухтомнай працай Алана Балака "Гітлер і Сталін", у якой дзьве раўналежныя біяграфіі засяродзілі вузлавыя моманты гэтага стагодзьдзя: рэвалюцыю, дыктатуру, ідэалёгію, дыпляматыю і вайну. Спрэчка на тэму параўнальнасьці абодвух таталітарызмаў, вызваленай імі сацыяльнай энэргіі, зьняволеньня асобы і чалавеканенавісьніцкай дэструкцыі, называная зазвычай спрэчкай гісторыкаў, усё яшчэ ня вырашаная.

Не сьціхаюць дэбаты й наконт таго, кім былі таталітарныя дыктатары? Вялікімі Спакусьнікамі, абдараванымі, быццам шаманы, незвычайным інстынктам узьдзеяньня на падсьведамасьць масаў? Ці хутчэй прадуктам нараджаных тады масавых грамадзтваў, якія, ужо свабодныя ад традыцыйных рэлігійных повязяў, стваралі сабе новых ідалаў, жрацоў сьвецкіх рэлігіяў на тое, каб давесьці сябе, як піша ў кнізе "Маса і ўлада" Эліяс Канэці, да своеасаблівага дэлірыюму, да стану асалоды і экстазу?

Фактычна такі сэнс маюць бурныя дэбаты, што больш як паўгоду вядуцца ў Нямеччыне і Злучаных Штатах вакол кнігі Голдхагена "Руплівыя Гітлеравы каты". Ці — як гэта абвострана сфармуляваў "Шпігель" загалоўкам на вокладцы — Гітлер быў руплівым выканаўцам нямецкай волі дэструкцыі, "элімінацыйнага" антысэмітызму і глыбока ўкаранелага пагарджаньня "паўлюдзьмі" з Усходу? Ці — наадварот — ён і ягоныя каты спакусілі і тэрарызавалі нямецкае грамадзтва, якое ў сваёй масе ня мела нічога агульнага са злачынцамі і, уласна кажучы, таксама можа лічыцца ахвярай, а не віноўнікам таталітарызму?

НАШ БРАЦЕНІК

Часткова зацікаўленьне Гітлерам — гэта, відавочна, своеасаблівая гістарычная парнаграфія, увага да гіганцкага злачынства і падгляданьне вялікага злачынцы. Нават калі ў нас няма прычыны, каб прымаць на свой рахунак словы Томаса Мана, што Гітлер — гэта "наш брат", мы, аднак, можам у ім бачыць у нейкай меры таксама й нашага браценіка. Бо ніводнае грамадзтва ня можа быць цалкам упэўненае ў тым, што яно не паддасца зьнішчальнай сіле дэмагогіі, як толькі спакусьнік выступіць у адпаведным убраньні і націсьне адпаведныя клявішы.

У біяграфіі Адольфа Гітлера шукалі ўсяго: псыхапаталёгіі сынка-пестунка, ускраіннага комплексу (габрэйскага або чэскага), генэтычнай заганы дзіцяці, народжанага з амаль кровазьмяшальнага шлюбу, або ахвяры бацькавай фрустрацыі, ажно рабіліся акультныя інтэрпрэтацыі, паводле якіх Браўнаў над Інам, дзе Гітлер прыйшоў на сьвет у 1889 годзе, — гэта рассаднік паталягічных і мэдыюмічных характараў.

Разам з тым многія выдатныя псыхолягі, як Эрых Фром, падкрэсьлівалі нармальнасьць дзяцінства Гітлера, зьвяртаючы ўвагу на тое, што ягонай пазьнейшай "місіі" ніяк ня ўдасца зваліць на так званае цяжкое дзяцінства або нейкія відавочныя псыхічныя анамаліі. Гітлер — гэта насамрэч everyman, кожны з нас.

Зь якіх жа пластоў сваёй асобы браў ён энэргію? Што яго падганяла? Эрых Фром сьцьвярджае, што — незадаволенасьць у дачыненьні да тых, каму пашанцавала, і, значыцца, зайздрасьць і нянавісьць. А пасьляваенная фрустрацыя і прыніжэньне Нямеччыны Вэрсальскім трактатам, натоўпы выкінутых крызысам на нішто людзей палегчылі перанясеньне сваёй няўдачы на няўдачу Нямеччыны. Незадаволенасьць, як піша Ганс-Юрген Айтнэр у "Псыхаграме Адольфа Гітлера", бывае крыніцай найбольш ідэальных і найбольш нікчэмных этычных імпульсаў, "аніякі посьпех, аніякі трыюмф, аніякае ўзьнясеньне ня могуць зьмякчыць ягонай нянавісьці і ягонай незадаволенасьці, і ў выніку незадаволенасьць сягае піку пры забіваньні зь вялікім размахам". Мастака творчы неспакой наводзіць часам на катастрафічныя візіі, рэакцыя на якія выяўляецца пазьней у творах. Для Гітлера полем выжываньня ўласных эмоцыяў стала палітыка, увянчаньнем якой быў катастрафічны хэпэнінг II сусьветнай вайны і зьнішчэньня Эўропы ў сапраўды вагнэраўскім стылі.

Вось жа, многія біёграфы задумляюцца, ці быў Гітлер "вялікім". Без сумневу, ён быў чалавекам не абы-якога таленту, вельмі чуйнай душы, дасканала адчуваў настрой натоўпу, але і ў камэрным коле патрапляў пакінуць добрае ўражаньне. Самавук, ён набыў даволі шырокія фрагмэнтарныя веды з многіх абсягаў, што дазваляла яму блефаваць у размовах нават з адмыслоўцамі. Ён меў дар хутка схопліваць істотныя рэчы, а душа артыста ці хутчэй азартоўнага гульца (што часам аказваецца тым самым) дазволіла яму часам знаходзіць наватарскія разьвязаньні, якіх не заўважалі нават спэцыялісты. У адрозьненьне ад Сталіна, ён аказаўся сапраўды таленавітым вайсковым камандзірам. Праўда, Сталін пасьля першых няўдачаў абапёрся на выдатных спэцыялістаў, Гітлер іх паадстаўляў і страціў кантакт з рэчаіснасьцю, верачы, што сам усё можа найлепшым чынам. У сваіх мастацкіх упадабаньнях быў эпігонам, але ж ён аўтар пэўных урбаністычных рашэньняў, якія выкарыстоўваюцца сёньня ў гарадах усёй Эўропы. Зоны для пешаходаў, дзе забаронены рух транспарту, — гэта, здаецца, ягоная ідэя.

Маральнасьць, на жаль, мае невялікі ўплыў на тое, ці будзе нехта прызнаны вялікім. Шэльмы і злачынцы ўжо ўваходзілі ў пантэоны. Але гэта не пра Гітлера. Сэбаст'ян Гафнэр слушна піша ў сваіх "Разважаньнях пра Гітлера", што нават калі б Гітлер памёр ці стаў ахвярай забойцаў у часе піку сваіх "мірных" посьпехаў або нават яшчэ пасьля захопу Польшчы ці Францыі, то ўсё адно б не заслугоўваў на прыстаўку "вялікі", бо ягоны III Райх ня быў творам, здольным на эвалюцыю, ня меў аніякіх мэханізмаў, якія б давалі магчымасьць вярнуць парлямэнцкую дэмакратыю або хаця б забясьпечыць функцыйнае разьвіцьцё нямецкай дзяржаўнасьці. Пасьля сьмерці правадыра Нямеччыне так ці йначай пагражала б катастрафічнае разбурэньне.

З такога гледзішча вялікія — гэта толькі будаўнікі, і рэдка калі — заваёўнікі. Вялікі князь літоўскі і польскі кароль Казімер — так, вялікі, але ўжо Аляксандар, ягоны сын, — не. Напалеон (толькі за кодэкс) — так,



але Гітлер — ні ў якім разе. Клопат быў бы са Сталіным. Ці выйграньне вайны з Гітлерам і стварэньне савецкай імпэрыі складаюць ягоную "вялікасьць", ці генэралісымус быў фактычна такой самай эфэмэрыдай, як Гітлер, толькі што больш расьцягнутай у часе? Урэшце, і ягоны твор — СССР — аказаўся няздатны на арганічнае разьвіцьцё і распаўся: Расея пазбавілася бальшыні сваіх здабычаў за апошнія 300 гадоў.

Ці, такім чынам, абодва — гэта "славутасьці, што ня маюць вартасьці"? Выглядае, што абодва застануцца ў гісторыі як найбольшыя каты за ўсе тысячагодзьдзі чалавецтва, нават калі адзін зь іх і дапамог вызваліць сьвет ад другога.

ІНФАНТЫЛЬНАЯ АНТЫРЭЛІГІЯ

Калі-нікалі можна пачуць меркаваньне, што з часоў Францускай рэвалюцыі не было гэткіх агрэсіўных ідэалёгіяў, як нацызм і камунізм. Першы ўзносіў сілу волі, аўтарытэт, гвалт і вайну, абвяшчаў герархію расаў і сфармуляваў ідэалёгію, якая вяла да прамысловага зьнішчэньня цэлых народаў. Другі, заганяючы ў зман гуманістычнай утопіяй роўнасьці і прагрэсу, давёў да імпэрскай дыктатуры сталінскай манапартыі, да генацыду, праводжанага традыцыйнымі мэтадамі, да тэрору, дэпартацыяў і працы, што вынішчала ў імя клясавай ідэалёгіі. Пры такім парадку мысьленьня Асьвенцім, Гулаг (а для некаторых яшчэ й Хірасіма) маюць быць найяскравейшай хворай праявай рацыяналізму пары Асьветы, які пахаваў маральны лад, угрунтаваны на хрысьціянскай традыцыі, і ўвагнаў Эўропу ў катастрофу рэвалюцыі, нацыяналізмаў і двух таталітарызмаў.

Толькі праўда, Гітлер зусім ня быў рацыяналістам. Многія дасьледнікі нацызму адзначалі тэатралізацыю Гітлерам палітыкі паводле ведамых яму каталіцкіх узораў: вайсковыя праходжаньні, што капіявалі працэсію, партыйныя зьезды, якія напаміналі гіганцкія мшы, парарэлігійная сымболіка і фразэалёгія. У "Размовах пры стале" Гітлер, зрэшты, адкрыта параўноўвае сябе з творцамі вялікіх рэлігіяў: з Хрыстом, Магамэтам, Будам. У сваю чаргу Герман Раўшнінг у "Размовах з Гітлерам" прыводзіць значэнныя словы "правадыра", якія, праходзячы чырвонай ніткай праз усё ягонае палітычнае жыцьцё, адмаўляюць хоць якую традыцыю Асьветы: "Мы стаім ля краю эпохі розуму. Дэспатычны розум стаў хваробай Жыцьця... Надыходзіць новая эпоха магічнай інтэрпрэтацыі сьвету, інтэрпрэтацыі, што вынікае з волі, а ня зь ведаў..." Уважаючы сябе за "палітычнага Збаўцу", ён піша ў вязьніцы сваю біблію, а даручаючы Спээру праектаваньне гіганцкіх збудаваньняў, патрабуе, каб прыцьмілі яны базыліку сьв. Пятра ў Рыме.

Ганс-Юрген Айтнэр, складаючы падрабязную псыхаграму Гітлера, паказвае мэнтальнае падабенства паміж прарокамі, артыстамі і гэтым дылетантам, які меў сапраўды "складаны талент", але як артыст быў нятворчы, як мужчына — ніколі ня стаў дарослым (12 гадоў супольнага жыцьця з Эвай Браўн, што можна вычытаць з кнігі Карла Грунбэрга, — гэта прыклад няздольнасьці ўстанавіць псыхічны партнэрскі кантакт з жанчынай), а як палітык быў чалавекам, няздатным на рацыянальны аналіз рэчаіснасьці: "Гітлер, гэты артыст-палітык, нібы павесялелае дзіця, будуе сабе нерэальны, але ўгрунтаваны на рэальнасьці, сьвет, сьпярша — як аснову свайго посьпеху, а пасьля — як зыходны пункт для свайго падзеньня. Гітлер замест таго, каб быць простым, як дзіця, вельмі часта па-дзіцячаму выбуховы. Скрыты ў ім артыст — гэта ў пэўнай ступені вечна лятуценнае дзіця, а скрыты ў ім палітык — гэта дзіця вечна чуйнае, заўсёды сталае".

Такім чынам, у Гітлеру трэба бачыць ня столькі выпраменьваньне грахоў пары Розуму, колькі нэўратычную спробу вярнуць архаічную інфантыльную "рэлігійнасьць", якая б надала нейкую форму гарачай і дэструкцыйнай энэргіі раздражнёнага народу і яго "правадыра", што ўцякаў у сьвет фантазіі і ірацыянальнай волі моцы.

ДАМОВА З Д'ЯБЛАМ

Нямецкая спрэчка, хто менавіта вінаваты ў эўрапейскай катастрофе нацызму і II сусьветнай вайны: нямецкі народ, які (прынамсі, яго траціна) узьнёс Гітлера да ўлады і фактычна аж да самага канца не праявіў яму паслушэнства, ці толькі "новы Антыхрыст", які зьвёў прыніжаны няўдачамі народ, — гэта (апрача лёгкага звальваньня пачуцьця сораму на кепскае начальства) спрэчка пра Зло і Злодзея ў гісторыі.

Ці насамрэч Гітлер — выканаўца мэтафізычнага Зла, а можа, нават Істы Д'ябал? Безь перабольшаньня. Людзі, апантаныя ўладай, сьмерцяносныя фанатыкі ідэі, небясьпечныя, бо робяць уражаньне, што дзеяць для дабра шырокіх колаў (народу, клясы), а не з эгаістычных матываў. Гэтаксама й Гітлер сьцьвярджаў, што дзеіць з найдабрароднейшых матываў, хочучы падняць нямецкі народ зь нізінаў зьняслаўленасьці, а ў сапраўднасьці кінуў яго на ўдзел у бяспрыкладным злачынстве арганізаванага генацыду і выклікаў на яго вайну; як што не ўдалося выйграць яе, мела яна скончыцца загубай Нямеччыны, якая аказалася "нявартай свайго правадыра".

Гітлер, як піша Айтнэр, займае месца недзе паміж вычварэнцам і абсалютным забойцам. Ён уважае сябе за чалавека, які знаходзіцца над маральным законам, за Збаўцу, што лечыць сьвет ад "жыдоўскай заразы". Ён па-за Дабром і Злом, бо, як сьцьвярджаў, "геніі асаблівага тыпу ня маюць аніякіх абавязкаў перад нармальнымі людзьмі".

Ганс Франк, гітлераўскі "польскі кароль", перш як павіс на шыбеніцы, пытаўся ў спавядальніка: "Ці Бог хоча гэтага гіганцкага памолу масаў, пасылаючы час ад часу тых, што развальваюць усё?" Таксама й Томас Ман, перш як у "Доктару Фаўстусу" апісаў нямецкі дагавор з д'яблам, задумляўся, ці ня ёсьць Гітлер прыладай, якой карыстаецца "Воля Сьвету" для дасягненьня мэтаў, што ляжаць далёка па-за змрочнай сьведамасьцю Гітлера. Якіх мэтаў? Правядзеньня зьменаў у сьвеце, стварэньня адмоўнага прыкладу, паказаньня твару Антыхрыста? Бачаньне ў Гітлеру каральнай рукі Бога азначала б рэлятывізацыю вельмі канкрэтных злачынстваў, учыненых руплівымі катамі фюрэра III Райху на ягонае распараджэньне толькі таму, што ён намовіў сабе і народу, што ён — германскі Мэсія.

Шуканьне ў Гітлеравым абсалютным злачынстве вышэйшых мэтаў падобнае да сутаргавага пошуку нейкага вышэйшага сэнсу ў тым, што ад справы Гітлера стала зь Нямеччынай і празь Нямеччыну. Гэтага вышэйшага сэнсу няма, ёсьць толькі канкрэтная віна канкрэтных віноўнікаў, канкрэтныя пакуты канкрэтных ахвяраў і калектыўны сорам немцаў за падатлівасьць на зьвядзеньне й руплівае выконваньне загадаў правадыра.

Адам Кшамінськi,
Polityka

100 твораў мастацтва XX стагодзьдзя

Напярэдадні другога тысячагодзьдзя аддзел мастацтва "Нашай Нівы" падводзіць свае вынікі. З нумару ў нумар мы будзем друкаваць выяву аднаго з ста найвыдатнейшых твораў беларускага мастацтва XX стагодзьдзя разам з тэкстам — спробаю пераацэнкі савецкіх стэрэатыпаў. Летась 22 ліпеня ў "НН" быў надрукаваны ўступны артыкул гэтай сэрыі, апошні тэкст зьявіцца ўжо ў наступным тысячагодзьдзі. Калі, вядома, усё будзе добра. А сёньня на старонках "НН" — славутая карціна Фэрдынанда Рушчыца "Зямля".

Secessio (з лаціны: secedo — сыходжу) — дэманстратыўны сыход плябееў са старажытнарымскае супольнасьці за мяжу горада



1898, алей, палатно, 164 см х 219 см, Варшава, Нацыянальны музэй

ФЭРДЫНАНД РУШЧЫЦ. ЗЯМЛЯ

Напісаная ў самым канцы мінулага стагодзьдзя "Зямля" Фэрдынанда Рушчыца перадвызначыла кірунак нацыянальнага пэйзажнага жывапісу ў XX ст. Сымбалічны твор стаў сымбалем Беларусі.

... На мяжы двух стагодзьдзяў, мінулага і нашага, стыль мадэрн перажываў росквіт. У нацыянальных школах ён набываў свае адметныя рысы. У гэты самы час фармуецца тэорыя стылю, майстры прагнуць праравацца ў новую мастацкую эпоху. У Аўстрыі, якая ў 90-я гады ці не ў найбольшай ступені спрычынілася да фармаваньня мадэрну, ён атрымаў назву "Sezessionstil" (ад лацінскага secessio). Сэцэсія стала новым тыпам аб'яднаньня мастакоў. Такія суполкі ўзьніклі ў Вене, Будапэшце, Мюнхене, Бэрліне. Гэтак пачалі называць гэты стыль у Чэхіі і Польшчы. У Беларусі, куды мадэрн пранікаў пераважна з Польшчы, яго называлі часьцей па-просту — "новы стыль".

... Прынцыпы формаўтварэньня ў мадэрне базуюцца найперш на натуральнасьці, арганічных формах і на імітацыйнасьці. Узьнікае своеасаблівая форма мімэзісу — падробка самога твору, альбо ягонай часткі (неба, расьліны, фактура матэрыялаў) пад натуральны аб'ект, што пры ўмоўнасьці вобраза стварае эфэкт парадоксу. Мімэзіс набывае мэтафарычны характар.

... Стыхійнасьць, віталізм, самаразьвіцьцё выяўленых формаў, прадвызначаюць адзін з законаў мадэрну — дынамічную раўнавагу. Гэты закон майстры мадэрну запазычалі з жывое натуры, якая заўсёды імкнецца да дынамічнае раўнавагі па-за сымэтрыяй. Раўнавага дасягаецца ў супастаўленьні рытмаў і тыпаў руху (вецер, чалавечая хада, рух жывёлы), ствараючы агульны вобраз.

... У жывапісе мадэрн зазвычай ператварае прастору ў плоскасьць, часам наўмысна сутыкаючы пляскатую выяву з імітацыяй прасторы (напрыклад — рэзкі контур, пляма на тле натуралістычнага ляндшафту). Пляма атаесамляецца з абрысам, пэўна і трывала акрэсьленым. Аб'ём ператвараецца ў пляму, прастора — у плоскасьць.

Фэрдынанд Рушчыц як мастак сфамаваўся ва ўмовах цэнтральнаэўрапейскага сымбалізму, у ягоных працах уплыў сэцэсіі відавочны. Моцны абрыс, пругкія і ломкія лініі, умоўнасьць прасторы сьведчаць пра тое, што гэта мастак мадэрну, хоць сам ён ніколі не дэкляраваў свае прыналежнасьці да тых ці іншых кірункаў.

Першым выкладчыкам маляваньня ў Рушчыца пад час вучобы ў Менску быў расеец Ермакоў, выхаванец Пецярбурскае Акадэміі мастацтваў. Пасьля сканчэньня Менскае гімназіі Рушчыц паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбурскага ўнівэрсытэту. Але хутка зьмяніў унівэрсытэт на Акадэмію мастацтваў. Юнак зь Беларусі адразу патрапіў у абдоймы сталічных акадэмістаў. Праўда, скончаць Акадэмію яму давялося ў майстэрні Куінджы, самага нетрадыцыйнага мастака традыцыйнае школы.

Перад заканчэньнем Акадэміі, у 1898 г. Рушчыц быў выпраўлены на студыйнае падарожжа па Эўропе. Зь дзёньніка Рушчыца: "Мілян. 14.VIII.1898. Можна застацца верным Бацькаўшчыне, ня гледзячы на розныя спакусы... Гледзячы і дзівячыся на пекнасьць іншай краіны, аддаем ёй даніну... а ўсё ж любім толькі сваю, адчуваем, што яна належыць нам, а мы ёй". Пасьля напісаньня гэтых радкоў, дарога Рушчыца пралягла праз Вэрону, Вэнэцыю, Мюнхен, Вену. Менавіта ў гэты час там буяла сэцэсія. Гадаванец расейскае Акадэміі, прагны да вучобы і ўражаньняў, быў захоплены магіяй "новага стылю", хоць, як вынікае зь ягоных дзёньнікаў, гнаў ад сябе гэтае пачуцьцё. Малады Рушчыц не губляў надзеі скарыць акадэмічны Пецярбург.

... 28 жніўня ён у Багданаве. Мінае колькі тыдняў (месяц пасьля Міляну): "Намаляваў вугалем "Зямлю". Карыстаючыся выдатным надвор'ем, ідзем з Мамай і Татам у поле, дзе капалі бульбу..." На наступны дзень: "Пачаў маляваць "Зямлю". Уласны досьвед Зямлі імгненна ператвараўся ў досьвед мастацкі.

Заходні імпрэсіяністычны пэйзаж быў маловядомы Рушчыцу. У расейскай Акадэміі напрыканцы мінулага стагодзьдзя імпрэсіянізм ігнаравалі цалкам. У Варшаве таксама. Падарожжа ў Эўропу мала што зьмяніла ва ўяўленьнях пра імпрэсіянізм маладога мастака, ён па-просту ня мог яго пабачыць у музэях і салёнах Італіі, Аўстрыі і Нямеччыны. Імпрэсіянізм быў "нямодны". Таму Рушчыца цікавілі не нюансы аптычнае гульні сьвятла і колеру ў прыродзе, не імгненнае ўражаньне, якое ледзьве кранае паверхню рэчаў і зьяваў, не мастацкае бачаньне каляровае гармоніі, а Клімат. Не Настрой, а Сэнс, схаваны пад вобразам вільготнае натуры, які неадрыўны ад генаў мастака...


Дзякуючы Рушчыцу, нацыянальны беларускі пэйзаж праміну́ў імпрэсіянізм, акадэмічны рэалізм і паўстаў на сьцежцы мадэрну. Станіслаў Жукоўскі, Вітальд Бялыніцкі-Біруля, Пётра Сергіевіч (ягоныя "Эміграны" — фактычна перыфраз "Эмігрантаў" Рушчыца), замацавалі гэтую традыцыю.

... Бітва цяжкіх аблокаў, што, нібы тэатральная запавеса, зіхцяць сьвятлом і ценем, прыўзьдымаюцца над Зямлёю, на якую выходзіць галоўны герой... Груваcткі абрыс валоў (дарэчы, у дзёньніках Рушчыц часта называе гэтую рэч "Валы"), сылюэт чалавека — толькі сымбаль.

Карціна ня мела вялікага посьпеху ў Пецярбургу (ігнараваньне анатоміі і пэрспэктывы, сумнеўны палітычны кантэкст), настаўнікі Рушчыца раілі яму разьвіваць лепей тэму млыноў ды ручаёў. Неўзабаве Рушчыц пакідае Расею назаўжды. З 1904 году ён — прафэсар жывапісу ў Варшаве. Але праз чатыры гады — зноў на Бацькаўшчыне... Да канца.

"Зямля" — цяжкі згустак матэрыі, які пакінуў глыбокі сьлед у гісторыі айчыннай культуры. Гэтую карціну рэпрадукавалі бясконца і ў Беларусі, і ў Польшчы, і ў Літве. Яе копія — у музэі Якуба Коласа. Яе выявы — у беларускіх школьных падручніках, часопісах і нават на новых паштовых марках Беларусі. Ворыва, плуг, жывёлы, араты ператварыліся ў адзін беларускі сымбаль, што лучыць нашую Зямлю зь Небам.

СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ



Фэрдынанд Рушчыц (1870, в. Багданаў, Ашмянскі павет Віленскай губ., (сёньня Валожынскі р-н Менскае вобл.) — 1936, тамсама), мастак, пэдагог, грамадзкі дзяяч. Аўтар твораў "Зямля", "Баляда", "Nec mergitur", "Ля касьцёлу" і інш. Творы зьберагаюцца ў музэях Вільні, Менску, Варшавы, Кракава, Львова, Пецярбургу.



ПАДЗЕІ ГОДУ

525 гадоў таму завяршылася падарожжа "за тры мора" Апанаса Нікіціна, расейскага падарожніка, цьвярскога купца. Гэта было падарожжа ў Пэрсію і Індыю. На адваротным шляху Нікіцін наведаў Самалі, Маскат у Арабіі, Турцыю. Падарожныя нататкі Нікіціна — каштоўны літаратурна-гістарычны твор.

500 гадоў таму ангельскі падарожнік італьянскага паходжаньня Джавані Кабота адкрыў бераг Паўночнай Амэрыкі. Джавані Кабота быў бацькам іншага італьянскага падарожніка Сэбасьцяна Кабота, які дасьледаваў краіны Лацінскай Амэрыкі.

500 гадоў таму распачаў свой марскі шлях вакол Афрыкі ў Індыю Васка да Гама. Васка да Гама першы праклаў марскі шлях з Эўропы да Паўднёвай Азіі.

475 гадоў таму Э.Картэс адкрыў Мэксыку. Адкрыцьцё суправаджалася заваёвай краіны і ўсталяваньнем там гішпанскага ўладараньня. У той самы год Эрнан Картэс стаў губэрнатарам Мэксыкі.

475 гадоў таму скончылася падарожжа вакол сьвету праз Магеланаў праліў і Ціх. акіян Ф.Магелана і Х.Элькана, якое цягнулася амаль год. Але завяршаў вандроўку толькі Элькана, бо Магелан быў забіты ў бойцы зь мясцовымі жыхарамі на Філіпінскіх Выспах.

450 гадоў таму зьявіўся першы падручнік гульні ў шашкі. Аўтарам яго лічыцца Антоніа Тарквэмада, які ня мае нічога агульнага зь вядомым Тамасам Тарквэмадам, галавой гішпанскай інквізыцыі.

375 гадоў таму за ўдзел у вайне супраць Расейскай дзяржавы шляхціц Цэзар Грандэзолі атрымаў маёмасьць памерлага мешчаніна Лукаша Багушэвіча.

300 гадоў таму В.Атласаў адкрыў Камчатку. Гэты сібірскі казак быў першым падарожнікам, які даў зьвесткі пра Камчатку і Курыльскія Выспы.

225 гадоў таму чатыры майстры ганчарнага цэху зь Менску ўпершыню ў гісторыі цэхавых статутных дачыненьняў скардзіліся на тое, што цэхмістры абклалі іх падаткам звыш рэестру на 10 злотых.

225 гадоў таму швэдзкі хімік-вынаходнік, паводле прафэсіі аптэкар К.В.Шэле адкрыў хімічны элемэнт кісларод (O). Гэта самы распаўсюджаны хімічны элемэнт на Зямлі. У спалучэньнях ён складае каля 1/2 масы зямной кары.

175 гадоў таму возера Чад упершыню наведалі тры эўрапейцы Х.Клапэртон, Д.Дэнэм, У.Аўдні. Возера Чад — бясьсьцёкавае слабасалянаватае возера ў Афрыцы, якое разьмешчаная на тэрыторыі трох афрыканскіх дзяржаваў (Нігер, Нігерыя, Чад). Яго глыбіня ад 4 да 11 мэтраў. Тады ж гэтыя падарожнікі перайшлі Сахару й давялі, што Чад не зьвязана з ракой Нігер.

150 гадоў таму ў ЗША былі пастаўленыя першыя паштовыя штампы.

PROMENA

БЕЛАРУСКІ КАНТРАСТ

На таварышаву прапанову разьвеяцца праз вандроўку ў Нясьвіж, я, гарадзкая дзеўчына, якая, акрамя як па мамінай радзіме, Шклоўшчыне, па Беларусі ня езьдзіла, пасьля пераконваньня ў класнасьці нясьвіскага гатэлю, згадзілася.

Уражаньні пачаліся з аўтобуса, у якім нашыя пярэднія месцы былі занятыя чырванатварай кампаніяй з пахам семак, гуркоў і кілбаснага кмену — вось дзе тлумачэньне, чаму кіроўца ігнаруе час адпраўкі. Асьляпіўшы мяне залатымі фіксамі, цёця ў залюрэксаванай "ангорцы" прапанавала заняць вольныя месцы, назваўшы сваю кампанію рэвізорамі. Гогаль — прарок. Падсьлепаватаму мужчыну са "Свабодаю" пад пахаю, што прэтэндаваў на месца нумар 1, "рэвізоры" разам з кіроўцам гаркнулі — 21-е, з чаго вельмі пасьля весяліліся.

Аўтастанцыя Нясьвіжу адразу дэманструе, што горад крочыць у нагу з краінай рэфэрэндумаў. Гразюка пад нагамі і лукашэнкаўская сымболіка над галавою, паралельна якой — герб Нясьвіжу (арол, другая палова якога перавязаная жоўтай, чырвонай і сіняй стужкамі) на фоне зялёна-чырвонага сьцягу. Нясьвіж — горад стара-даўні і малады. Менавіта пад такою шыльдаю на галоўным пляцы гораду на калябеларускай мове прадстаўленая гісторыя Нясьвіжу: дзеячы "адыгралі значную долю", "знайходзіцца" больніца на "400 наведваўняў", пэрыядычна не перадаецца дзеканьне. Стэнд для турыстаў завяршае тыпова беларускі правінцыйны ансамбаль, які ствараецца завялікім для Нясьвіжу будынкам райвыканкаму, вялізарнай для гораду крамай "Книжный мир" з наяўнасьцю ўсяго дзесяці найменьняў беларускіх кніжак, абшарпанай жоўценькай ратушай, на якую кідае свой, відаць, вечны цень алюміневага колеру Ленін. Заплаціўшы ў гатэлі за апартамэнты (для Беларусі — апартамэнты) і вельмі зьдзівіўшы гэтым адміністратарку, мы з таварышам рушылі ў пошуках паесьці, прычым хацелася нечага беларускага. Рамантычныя апэтыты скончыліся небагатым выбарам каўняў "Церамок" і "Несьцерка": у апошняй можна наесьціся дваццацьма блінцамі і напіцца гарэліцай "Стараславянскаю" за паўтара даляра. Каля будынку выканкаму рэакцыя на беларускамоўных інтэлігентаў у політах была такая — БНФаўцы, "якое заданьне маеце", а так вельмі часта ветлівая ўсьмешка плюс стараннае вымаўленьне — "нясьвіскае". Яшчэ вельмі цікавіліся, ці муж з жонкаю. Сапраўды, гэта мае вялікае значэньне: асабліва пад час фатаграфаваньня на асноведзі Слуцкай брамы і дыскусіі пра стан беларушчыны ў Нясьвіжы...

Засмуціў Радзівілаўскі палац, перароблены саўком у "Межколхоззздравницу" зь більярдамі для абраных і сінімі, разоў шэсьць перафарбаванымі, сьценамі, ад якіх, бы з сораму, пачырванела блакітная кроў беларускіх шляхціцаў. І супакоіў абсалютна пусты ўзімку парк, які дыхае аўрай Радзівілаў, Коласа, Сыракомлі і Тамаша Макоўскага, стваральніка на просьбу Мікалая Радзівіла Сіроткі карты Вялікага Княства Літоўскага. 16 гадоў Макоўскі рыхтаваў карту, надрукаваную ў 1613 годзе ў Амстэрдаме. Цяпер нашая каштоўнасьць, якая вытрымала 5 выданьняў, перахоўваецца ва ўнівэрсытэцкай бібліятэцы гораду Упсала ў Швэцыі.

Першы сёлета вечар у рэстаране: у кожнай з 8-мі салатаў бурак, сьвініна — у найлепшых традыцыях гумарыстаў, Таня Буланава на 80 дБ, "бацька", які палохае сваімі сувэрэнітэтнымі аргумэнтамі, шчасьлівы ў чаканьні таварыш і, нарэшце, нясьпешлівая вячэра. Успамінаецца рэкляма новазэляндзкага сыру, якасьць якога забясьпечваецца разьмераным і старамодным жыцьцём. Можна ўявіць, як нам не стае спакою, калі беларуская правінцыя лечыць ад мітусьні ў галаве за суткі...

Ранкавае сонейка прысьпешыла працяг экскурсіі. Выдатнае памяшканьне Дома культуры, дзе прапануецца актуальная п'еска Г.Марчука "Дэфіцытны жаніх", мясцовая бібліятэка, дзе на адзін нумар "ЗЮ" — два нумары "Свабоды" (кожны бачыць тое, што хоча бачыць?) і вечнае нясьвіскае выданьне "Чырвоны сцяг" з накладам па падпісцы большым, як у "Культуры". Трэба адзначыць яшчэ адну культурную ўстанову — каўню "Чабарок", на рамонт якой наракаў кожны другі, абавязкова нападпітку, нясьвіскі мужчына. Там было таньней. Павіталіся з Будным, моўчкі падумалі на адлегласьці пра палацава-паркавы комплекс і паехалі праз Гарадзею дадому.

Аўтобус, натуральна, спазьніўся, што выклікала паўтарагадзіннае чаканьне электрацыі ў Гарадзеі, дзе на кожныя 50 мэтраў — унівэрсам. Сытыя, стомленыя, з нанова акцэнтаванымі старымі каштоўнасьцямі, загрузіліся ў электрацыю. Але нават у ёй немагчыма пазбавіцца пачуцьця сваёй ідэалягічнай нацменшасьці — гарласты хлопец рэкламаваў на продаж дэтэктыў за 13 тысячаў р. У суцяшальную нагрузку — Беларуска-расейскі слоўнік. Бясплатна.

Вольга Караткевіч

150 гадоў таму Ўсходняя Аўстралія была адкрытая ангельскім падарожнікам Т.Мітчэлам.

125 гадоў таму ўпершыню наладжаная прамысловая вытворчасьць Дынама-машыны (электрычнага генэратара сталага току). Гэта зрабіў Зэнаб Грамэ, электратэхнік, які нарадзіўся ў Бэльгіі, але пасьля працаваў у Францыі.

Сакавік

200 гадоў таму Андрэ-Жак Гарнэрын скокнуў з вышыні 6.500 футаў у Мансю Парку ў Парыжы з парашутам 23-футавага дыямэтру.

150 гадоў таму ў сусьветнае падарожжа з Тэмзы адправілася самая першая яхта Нэнсі Даўсан (шхуна), якой кіраваў Робэрт Шэдэн (Вялікабрытанія) з камандай.

100 гадоў таму быў арганізаваны першы нацыянальны баскетбольны турнір у ЗША. Арганізаваў яго Аматарскі атлетычны саюз. Сама гульня ўзьнікла тамсама, у ЗША ў 1891 годзе.

75 гадоў таму пабудаваная другая лінія знакамітага чыгуначнага тунэлю ў Альпах (Швэйцарыя — Аўстрыя) Сымплян. Яго працяглась 19,7 км. Першая лінія была пабудаваная у 1906 г.

20 сакавіка

У 1947 у Антарктыдзе савецкай кітабойнай флятыліяй "Слава" быў злоўлены другі па велічыні асобнік сіняга кіта сямейства паласатых. Даўжыня гэтай самкі была 27,6 м, а вага — 190 т. Вага языка і сэрца жывёлы склала, адпаведна, 4,29 і 698,5 кг.

22 сакавіка

75 гадоў таму памёр вядомы шатляндзкі вынаходнік Аляксандар Грэям Бэл, адзін з вынаходнікаў тэлефона. З 1891 працаваў у ЗША. У 1876 атрымаў патэнт на 1-ы практычна прыдатны тэлефон.

24 сакавіка

150 гадоў таму ў мястэчку Мако (Вугоршчына) нарадзіўся вядомы выдавец Ёзаф Пуліцэр. Прэміяй ягонага імя ўзнагароджваюцца ўсе высокія дасягненьні ў галіне выдавецкай справы і журналістыкі ЗША.

Сустрэча з "Нашай Нівай"

26 сакавіка (серада) **"Наша Ніва"** ладзіць сустрэчу з чытачамі ў Менску ў кінатэатры **"Зьмена"**. Будзе дэманстравацца дакумэнтальны фільм **"Віленскі зборнік"** — пра віленскі пэрыяд аднаўленьня газэты **(1991 — 1995).** У вечарыне возьмуць удзел супрацоўнікі рэдакцыі. Зь песьнямі "віленскага пэрыяду" выступіць **Зьміцер Бартосік.**



Пачатак вечарыны а 18 гадзіне. Праезд да кінатэатру "Зьмена" трамваямі №3, 6, 7, 9, аўтобусам №19.

БІБЛІЯТЭКА

Помнікаў стала больш...

К.Шыдлоўскі. Архітэктурная спадчына Браслаўшчыны. Гістарычна-архітэктурны нарыс. — Менск: Полымя, 1996. 158 с. ("Помнікі беларускага дойлідзтва")



Калі ў Беларусі пачалі сьведама ўзрываць бажніцы? Як толькі ў Расеі зьявілася дастаткова піратэхнікі. А менавіта з пачатку XX ст. Да таго расейскія акупацыйныя ўлады карысталіся старым, малаэфэктыўным спосабам — разьбіралі бажніцы, ратушы, замкі ўручную. Працэс зьнішчэньня здабыткаў беларускае старасьвеччыны расьцягваўся на шмат гадоў. Як, да прыкладу, адбылося зь менскай ратушай, якую, ня гледзячы на загад расейскага імпэратара Мікалая І, дадзены ў 1851 годзе, разабралі толькі ў 1857.

Але бегам гадоў зьнішчэньне ўсяго "нерусского" ў Беларусі набыло сыстэматычны і эфэктыўны характар. Яскравы прыклад прыводзіць аўтар новае кнігі: руйнаваньне касьцёла Сьв. Ружанца і кляштара дамініканаў у Друі. Акупацыйныя ўлады зачынілі гэты кляштар ў 1832 годзе. Выдатныя расейскія архітэктары Полазаў і Прозараў, якія ў самой Расеі зь вялікім піэтэтам ставіліся да архітэктурнае спадчыны, раілі зьнішчыць друйскую сьвятыню. Справа зьнішчэньня расьцягнулася да 1891 году, калі пажар дашчэнту выпаліў касьцёльнае ўбраньне. Аўтар кнігі, К.Шыдлоўскі, піша пра неаднаразовыя спробы расейскага дойліда Чагіна не дапусьціць да зьнішчэньня касьцёла і кляштара. Атрымліваецца, што сярод расейцаў былі адзінкі, якія не маглі быць саўдзельнікамі барбарства? Не. Чагін імкнуўся "выбіць" сабе замову на перабудову касьцёла пад расейскі сабор. Гэты спэцыяліст да таго часу ўжо перабудаваў тагачасную царкву Сьв. Тройцы ў Вільні на маскоўскі капыл, у 1899-м ён спахабіў Фару Вітаўта ў Горадні. Яшчэ Чагін пашчыраваў у Берасьці, Менску, Наваградку... Цікава, што ніводзін зь ягоных "твораў" не дайшоў да нашых часоў, часьцей за ўсё пазьнейшыя пакаленьні ачышчалі бажніцы ад чагінскіх "наваротаў".

У 1909 годзе касьцёл узарвалі на загад Сталыпіна. Таго самага, рэфарматара. Як напісаў сам сп. Шыдлоўскі: "Адзін з фатаздымкаў, які дайшоў да нашага часу, зафіксаваў пачатак разбурэньня касьцёла. Прыгажосьць аказалася бездапаможнай перад грувасткай, бяздушнай бюракратычнай машынай і ўзрыўчаткай". Унікальны твор выбітнага дойліда з Генуі Антоніа Парака быў ператвораны ў друз. Пасьля гэтага злачынства ацалела толькі касьцельная брама і капліца Сьв. Антонія, але і іх зьнішчылі пасьля апошняй вайны. Некаторыя з шэдэўраў Парака ацалелі ў Літве і Латвіі, у прыватнасьці, у Латгаліі. Гэта касьцёл Сьв. Людвіга у Краслаўцы (1755-1767) і касьцёл дамініканаў Сьв. Крыжа ў Пасейнах (1761-1770). Касьцёл у Пасейнах, настолькі блізкі з выгляду да касьцёла дамініканаў у Друі, што ствараецца ўражаньне адзінага праекту. Касьцёл у Пасейнах сёньня лічыцца адным з найвыбітных помнікаў дойлідзтва ў Латвіі.

Сам здымак выбуху 1909 году мог бы, бадай, стаць сымбалем лёсу нашае культуры ў абдоймах усходняга суседа. На жаль, аўтар не спаслаўся на крыніцу, зь якое ўзяты здымак. Навуковы ўзровень выданьня мог быць вышэйшы, калі б кожны з архіўных здымкаў быў забясьпечаны анатацыяй. У іншых выпадках аўтар згадвае здымак і крыніцу ягонага захаваньня, інтрыгуючы чытача, але не зьмяшчае самога здымку, напрыклад, мячэту ў Відзах (1934).

У кнізе зьмешчана багата недрукаванага раней факталягічнага матэрыялу. Дзякуючы кнізе сп. Шыдлоўскага, чытач глыбей пазнаёміцца з творчасьцю дойлідаў, чые імёны доўгія гады сьведама замоўчваліся. Атрымалася, што ўпершыню ў Беларусі ў кніжным фармаце (не беручы энцыкляпэдычныя выданьні апошніх гадоў) выкладзеная біяграфія Лявона Вітана-Дубейкаўскага і каротка прааналізаваныя ягоныя творчыя прыёмы. Гэта сьведчаньне таго, што імя Дубейкаўскага, як клясыка архітэктуры, спакваля займае сваё пачэснае месца ў пантэоне Беларусі. Вялікую ўвагу аўтар надаў і асобе Юліюша Клоса, славутага архітэктара зь Вільні, імя якога неадрыўна зьвязанае з нашым Паазер'ем. Менавіта дзякуючы намаганьням Клоса, Браслаў 30-х гадоў заслужыў славу тутэйшае Ніцы.

У кнізе зьмешчаныя падрабязныя зьвесткі пра ўсе помнікі Браслаўшчыны, пачынаючы з нэаліту да нашых дзён. Многія са здабыткаў ня ўлічаныя ні ў "Зборы помнікаў" ні ў іншых даведніках. Такім чынам, кніга становіцца ўнікальнай крыніцай інфармацыі і для навукоўцаў. Сярод помнікаў, пра якія раней амаль нічога не публікавалі: цэрквы ў Друі, касьцёл у Бяльмонтах, цэрквы старавераў у Кірыліна, Булавішках, Мінкавічах, мячэт у Відзах, шматлікія капліцы ў розных кутках Браслаўшчыны. Вялікую каштоўнасьць мае і публікацыя праектаў касьцёлаў у вёсках Богіна і Далёкія.

Асабліва цікавыя матэрыялы, прысьвечаныя дойлідзтву Браслаўшчыны 20-30-х гадоў. Да нашага часу з ідэалягічных прычынаў маштабы і ўзровень будаўніцтва ў Заходняй Беларусі цалкам ігнараваліся як у дасьледчыцкай, гэтак і ў папулярнай літаратуры. У 30-я гады недзе ў Беларусі будаваліся касьцёлы, цэрквы, мячэты?... Гэта было па-за ўяўленьнем новага пакаленьня жыхароў БССР. Аўтар кнігі ў нарысе "Паэзія даўніх муроў" красамоўна давёў, што "зорным" часам для горадабудаўніцтва і архітэктуры на Браслаўшчыне былі менавіта 20-30-я гады, калі тут працавала цэлае сузор'е дойлідаў, дасьледчыкаў і мастакоў. У тыя часы ўзводзілася багата бажніцаў усіх канфэсіяў, прамысловых, жылых і адміністратыўных комплексаў. "Калёнія для ўрадоўцаў" у Браславе, пабудаваная паводле праекту прафэсара Клоса ў 1926 годзе — сапраўдны шэдэўр беларускага урбанізу, зьнявечаны ў савецкія часы.

Увядзеньне сп. Шыдлоўскім у культурны ўжытак новых помнікаў — галоўная каштоўнасьць ягонае працы. Магчымасьць па-новаму зірнуць на тое, што атачае нас, але было і да нас — першы крок да ўсьведамленьня каардынатаў, у якіх мы існуем. Аўтар кнігі прапануе нам усьведаміць значнасьць комплексу ГЭС "Дружба народов", як гістарычнага мэмарыялу і як помніка савецкае архітэктуры 50-х гадоў, які паводле свае эстэтычнае праграмнасьці лічыцца клясычным узорам. Сам аўтар дэкляруе сваю задачу:"... помнікаў не становіцца менш... З часам мяняюцца нашыя ўяўленьні аб тых каштоўнасьцях, якія трэба шанаваць і захоўваць... За вельмі кароткі час яны становяцца адзінымі сьведкамі прамінулага этапу пэўнай цывілізацыі".

Аўтар не хавае і свайго прыватнага стаўленьня да гісторыі краю і да асобных помнікаў: з захапленьнем ён распавядае таямнічыя паданьні, гісторыі сьвятых цудадзейных абразоў з Браслава і Угары, з болем і адчаем — пра барбарства расейскіх і савецкіх уладаў.

Чытач дазнаецца і пра тых, хто ачольваў беларускі супраціў рабаўнікам і асымілятарам: пра сьвятара Міхала Букляроэвіча, кіраўніка пабудовы касьцёла Божага Цела ў Іказьні, які ўзьняў антыбальшавіцкае паўстаньне ў 1919 годзе і быў расстраляны разам зь сястрою (іх магілу на касьцельным цьвінтары маскоўскія акупанты зьнішчылі ў 40-я, але цяпер людзі аднавілі гэтую сьвятыню), пра айца Віктара Шутовіча, які служыў у касьцёле Сьв. Язэпа ў Барадзінічах і зрабіў сваю парафію цэнтрам беларускага адраджэньня, за што зазнаў рэпрэсіі з боку палякаў, а пасьля і бальшавікоў, пра кляштар аа. марыянаў у Друі, які да 1938 г. быў апірышчам беларушчыны на ўсю Заходнюю Беларусь.

"Ставіць кропку ў пошуках рана... А значыць, трэба чакаць новых адкрыццяў", — так сканчае сваю кнігу сп. Шыдлоўскі.

Сяргей Харэўскі

Богуміл Грабал

ШТО ТАКОЕ КАРЧМА

Што такое карчма — карчма ў маім разуменьні? Гэта месца, якое мае свае бяспрэчныя правілы, бяспрэчны рытуал, бяспрэчныя дагматы, але, разам з тым, гэта месца, дзе гасьцей цешыць ня столькі game, колькі play — п'еса-гульня, якой яны давяраюцца пад уплывам хвалі, — гульня дарослых дзяцей. Карчма — гэта як бы абарона ад стэрэатыпу, урэшце, гэта тое месца, дзе самыя звычайныя людзі могуць імправізаваць, могуць аддацца рытму натхненьня і фантазіі. Карчма — гэта тое месца, якое добры карчмар здольны ператварыць у тэатар; у Ілове была на плошчы карчма, якую празвалі "У Грубіяна", дзе гледачы, бавячыся, чакалі, калі прыйдзе яшчэ нехта, хто тут яшчэ ня быў, чакалі таго моманту, калі госьць сабе замовіць піва ці каўку, чакалі, калі карчмар, як заўсёды, яму падасьць...

Ну што казелісься, гавары ці абаранкам насяры, сустракае мне неяк той карчмар. Хачу піва, адказваю я, а Грубіян паварочваецца да ўсёй карчмы: гэты ёлуп думае, што я яму буду наліваць піва! налі сабе сам... Пачатак Грубіян кожны раз разыгрываў інакш. Гэта карчма, у якой можа дзеіцца хоць што, гэта вольны тэатар, не раўнуючы як калісьці пан Ёнтэк прывёў да карчмы пана Клоўзка, які завецца Ярошкам, жывога каня, гэта тая хвіля, якой пачынаецца паэзія, калі ўжо ў адзінаццаць гадзінаў раніцы, калі мароз аж трашчэў, увайшлі тры дзецюкі з Храсту, калі ўжо была распаленая печка маркі Філакова*, а пад цёплымі трубамі адагравалі свае зьмерзлыя косьці пэнсіянэры, у кутку, на лаўках, над якімі і цягнуліся тыя трубы. Што мы для вас можам зрабіць? запыталіся тры дзецюкі з Храсту. Ведаеце што, пакуль я вам нацаджу піва, выцягніце печ на дарогу! сьмеючыся сказаў Ярошак. І пакуль хто пасьпеў ачомацца, тры дзецюкі выдралі тую трохмэтровую распаленую печ, выцягнулі дымавыя трубы, чапляючы старых, што пад імі грэліся, і вынесьлі курную яшчэ печ і паставілі проста пасярод вуліцы, а ўсе госьці ўсталі і праводзілі тое вынашэньне печы маркі Філакова, празь дзьверы і вокны дзівіліся тым найвышэйшым тэатрам, і сам Ярошак быў зьдзіўлены, сьмяяўся, трымаючыся за піўны кранік. Тры дзецюкі ўвайшлі, селі; ранішняя карчма была поўная дыму і Ярошак сказаў: гэты дзень для мяне пекна пачынаецца, будзе вам піва... а дзецюкі з Храсту прагна пілі і карчма была поўная дыму і таямнічасьці, якую перарвалі гукі аўтобуса, што спыніўся, біткам набіты, перад печкай маркі Філакова, і трубіў, і тады Ярошак прыйшоў, просячы... Гэй, хлопцы, прынясіце зараз печ назад, дастанеце ад мяне сотню. А тры вісусы з Храсту казалі... Грошы наперад! І аўтобус трубіў і гукаў, і Ярошак выцягнуў свой кашэль з задняй кішэні, паклаў сотню каля трох дапітых піваў і казаў з усьмешкай: ну й дзянёк сёньня выдаўся... І ўсе госьці разам павярнуліся да вакна і тры дзецюкі з Храсту, не згаворваючыся, як па знаку, выбеглі на вуліцу, а былі то ня нейкія асілкі, але звычайныя хлопцы, схапілі печку маркі Філакова і ўмомант зьніклі за дзьвярыма і паставілі печ акурат там, дзе яна стаяла, карчмар на стале трымаў у газэце трубу і ўставіў яе на месца, а госьці зараз жа селі да свайго піва. Так пачынаецца праўдзівы тэатар у прыстойнай карчме, дзе госьці не мерцьвякі, але жывыя людзі, якія, раздумляючы, вымысьляць заўсёды нешта, што падобнае да імправізацыі, варыяцыі на тэму, fair play. Гэта месца, дзе бяздайпрычыны пачнуць біцца аб заклад — ці пані карчмарова мае грудзі дзявятага ці адзінаццатага памеру, — гульня, якая скончыцца на вачах усёй публікі тым, што пані карчмарова пачне ўціскаць сваю цыцку ў паўлітровы куфаль, а муж будзе ёй радзіць, надаваць адвагі і падахвочваць. Такая карчма — гэта сцэна і заля разам, памяшканьне, куды заходзяць з вуліцы, а тады выходзяць, калі-нікалі ўся карчма выкуліцца дадому — карміць трусоў, гатаваць вячэру; тады карчмар застанецца адзін і можа пад'есьці спакойна, але той карчмар наш пан Ярошак, той любіць есьці поліўку ў абед і пад вечар, калі ягоная карчма ўжо поўная, калі сербане некалькі лыжак поліўкі і ідзе наліць і разьнесьці піва, каб потым зьесьці некалькі лыжак поліўкі, а потым устаць і падаць цыгарэты і піва на вуліцу, усьміхаючыся, хоць бы што, раздаючы ўсім па слоўцу: Калі плаціш, будзь вясёлы, ці: Жыхордзе, будзь мужны... і так, як даеў сваю халодную поліўку, каб зьесьці і тыя свае кнэдлікі з падлівою і мясам, і каб уставаць і тэатральна наліваць піва, падаваць цыгарэты і салёнае печыва, адказваць гасьцям, якія выдумляюць несусьветныя парады, нелягічныя рэчы. І карчмар ім аддзячвае тым, што калі разносіць штофлікі на падносе, заўсёды паставіць адзін і для сябе, прыгубіць з гасьцямі і гаворыць сьціпла: гэта мне — за выкананьне службовых абавязкаў.

Карчма — тое месца, дзе калі каму захочацца, дык возьме куфаль ды паставіць сабе на галаву і рытуальна зь ім танчыць, а калі захоча, то заточыцца ў кут і сядзіць надзьмуты-насуплены і ні з кім не гаворыць. Захочацца раптам некаму засьпяваць, дык засьпявае, нейкі госьць ідзе з прыбіральні і ў задуменьні зашпіляе памачы; найбольш сымпатычныя тыя шынкі, дзе ёсьць тэлевізар, дзе акрамя тэатру госьці яшчэ бачаць тэлевізійныя праграмы і нічога не прапусьцяць і прамовы з тэлевізара заглушаць сваімі, камэнтуючы здарэньні і спартовыя трансьляцыі. І ва ўсіх гасьцей будуць паднятыя галовы, таму што экраны ў шынках бываюць, як правіла, досыць высока, у кутку, на рэйцы, каб госьці не зьвярнулі тэлевізар плячамі ці галовамі, ва ўсіх аднолькава павернутыя твары, адкінутыя назад шыі, а вочы вядуць да адной кропкі, і гэта павышае забаўнасьць фізычнага і псыхічнага абмежаваньня, бо рука зь півам нейкім разам абмінае вусны, а рука з цыгарэтай абмінае губы і, так, дзякуючы тэлевізару, шынок набывае дадатковае вымярэньне... Гэта калектыўнае стварэньне карчмы, дармовы спэктакаль для кожнага, хто прыйдзе, перавернутыя куфлі на сьвежым абрусе, прапаліны на ім, круталобыя спрэчкі, месца для непадробнае бойкі задарма. Карчма — гэта яшчэ й месца, дзе ўжо нельга знайсьці цішыні і самоты, бо тады зьяўляюцца прыкметы сьмерці, забарона гуляць у карты, прадаваць алькагольныя напоі людзям нападпітку, шафёрам і малалеткам, і забарона весьці палітычныя гутаркі. Ну зразумела! Карчма мае нешта надзвычайнае ў сваіх рытуалах, дзе госьці ўвесь час поўняцца то ўзаемапавагай, то ўзаемаіроніяй, то ўзаеманянавісьцю, то абыякавасьцю — усім, толькі не санлівасьцю, а калі так і прыпадае, то не кладуцца на канапе, як дома. Людзі ў шынках нястомныя, да таго ж і трымаюцца на публіцы, калі б яны былі дома, то гэтым часам іх бы ўжо адолела мляўкасьць, і драмалі б, і бубнелі; шынок таксама месца, дзе сканчаюцца службовыя абавязкі і забароны, шынок месца, дзе людзі людзкуюцца, дзе строяць зь сябе таго, кім бы хацелі быць, месца, дзе ў жывых гульнях і вобразах можна ўявіць недасяжнае, дзе неўсьвядомлена можна ўзьнесьціся да вяршыні, вартай асуджэньня, і ўпасьці да скаргі на самога сябе. З карчмы людзі вяртаюцца ажыўленыя і ўзрушаныя, кідаюць сябе на ложак, каб не заснуць да раніцы ці заснуць як п'яніцу прадаўшы, з карчмы заўсёднік выносіць спадзяваньні на карчму заўтрашняга дня, або прысягае сабе, што ў

Богуміл Грабал

Богуміл Грабал адляцеў у іншы сьвет загадкава. З лютага, кормячы галубоў, ён выпаў з вакна пятага паверху праскага шпіталю. 82-гадовы стары, які любіў пісаць без чарнавікоў, любіў піва, любіў птушак і кошак, зрэшты, мог страціць раўнавагу проста ад усьведамленьня сябе рэліктам адмерлай эпохі. Дзесяць гадоў таму на працягу некалькіх месяцаў ён пахаваў жонку, брата і блізкага сябра. Тэма разьвітальнага падзеньня адкрыта ўваходзіць у ягоныя тэксты: "Некалькі разоў я хацеў скочыць зь пятага паверху, з гэтай маёй кватэры, дзе кожны пакой робіць мне балюча, але анёл заўсёды ўратоўваў мяне ў апошнюю хвілю..." Гэта навэла "Чароўная флейта", 1989 год.

Дык выпаў ці скочыў? — пытаюцца чэскія газэты. Прыяцелі пісьменьніка не выключаюць, што Грабал *мог* разыграць сваю сьмерць — жывыя п'есы, непаўторныя сюжэты кожнага дня — таксама адна зь яго сталых варыяцыяў. Фінальны сюжэт Грабала застаецца да канца неразгаданым спалучэньнем помыслу і выпадку, як неразгаданымі застаюцца разьвітальныя палёты нашых паэтаў — Купалы, Семашкевіча, Янішчыц...

У шэраг лепшых пісьменьнікаў нашага стагодзьдзя Богуміла Грабала ставяць ня толькі чэхі: паводле папулярнасьці ў сучасных перакладчыкаў ён даўно пераўзышоў Чапэка і Гашака. Да гэтай кампаніі распаведнікаў-баюноў яго далучалі пэўны час — але Грабал вырас зь яе. Ён пайшоў глыбей і далей, апрабоўваючы найноўшыя стылі, ставячы экспэрымэнты мастацкага словавыяўленьня, што, урэшце, і зрабіла яго адным з бліскучых суаўтараў літаратурнага мадэрну канца XX ст. Сувымерны з Грабалам у літаратурнай славе Мілан Кундэра (які эміграваў з савецкай Чэхаславаччыны і цяпер жыве ў Парыжы) мяркуе так: "Калісьці будзе забытая расейская акупацыя і пра тыя гады будуць гаварыць як пра часы вялікай чэскай культуры, калі жыў Грабал, які напісаў "Я прыслугоўваў ангельскаму каралю" і "Вялікую самоту".


Пасьля весткі пра сьмерць Грабала я сустрэлася з чалавекам, які быў блізка знаёмы зь пісьменьнікам. Гэта ягоны сябра, адзін з рэдактараў і ўкладальнікаў так званай Грабаліяны Мілан Янковіч. Мы спаткаліся на глухой праскай вулічцы На гразі, дзе калісьці Грабал з жонкай жыў у паднайме. Цяпер таго дому няма, вуліца рэканструяваная пад час будаўніцтва мэтро. Але пры зносе хацінаў тут укаталі ў асфальт маленькую бронзавую дошку з напамінам пра Грабала. Так чэхі тварылі зь яго легенду яшчэ пры жыцьці.

— Фатальных матываў у Грабала было дастаткова, — распавядаў мне Мілан Янковіч, калі мы абыходзілі стары лібеньскі квартал. — Вось тое ж страсеньне мозгу. Уявіце, ягоны верш "Вечны Сыльвэстар" ("Вечны Новы год") зьявіўся яшчэ да 1948 году. Там сказана: "Без страсеньня мозгу нельга мне жыць. Нельга нас адлучыць ад свабоды, браты". У 1952 годзе, калі Грабал працаваў на сталеплавільні, сарваўся гак пад'ёмнага крана і разьбіў яму галаву... Ён мае матывы, якія спачатку напісаў, а потым пражыў.

Грабал атрымаў юрыдычны дыплём Карлава ўнівэрсытэту — але юрыстам не працаваў ні дня. Быў кандуктарам на чыгунцы, страхавым агентам, дзяржурным сцэны ў тэатры. Пасьля той траўмы на гуце вымушаны быў шукаць лягчэйшую працу — і ўладкаваўся ўпакоўшчыкам макулатуры...

Пісьменьнікам сябе доўга не прызнаваў, першую кнігу выдаў у 49 гадоў. Пісаў пераважна "зь першага разу", не асабліва дбаючы пра шліфоўку — пэўны час ён заставаўся па-за афіцыйнай літаратурай, чытаў напісанае толькі сябрам. А пісаў, паводле Мілана Янковіча, не таму што карцела публікавацца, а таму што *гэта зь яго пёрла*. Адсюль — ягоны стыль. Гэта проста ток, плынь думак і ўяўленьняў, гэта вір рытму і інтанацыі, празьмерны гратэск і пунктуацыйнае нагнятаньне косак. Гэта зьмяшаньне грубага простанароднага слова, слэнгу піўнушкі і высокаінтэлектуальных пасажаў. Гэты стыль можна параўнаць хіба з роспаведзьдзю старога пры куфлі піва — дзед ужо крыху ахмялеў, ён зьвязвае ў адзін ланцуг згадкі з розных месцаў і розных часоў, чапляючы адно, пераскоквае на іншае і зноў вяртаецца...

Праская карчма "У Залатога тыгра" стала турысцкай славутасьцю, дзякуючы яе заўсёдніку Грабалу. І цяжка сказаць, каго больш сярод прыхільнікаў пісьменьніка — аматараў літаратуры ці аматараў піва. Чаму яго так цягнула ў карчму — адказ у адной з даўнейшых, але надрукаваных толькі летась Грабалавых навэлаў "Co to je hospoda..." У перакладзе ўжытае менавіта слова *карчма* як найбольш адпаведнае беларускім этнаграфічным уяўленьням. Хоць, вядома, каб дакладна акрэсьліць тое, што чэхі называюць *hospoda, hostinec* трэба ўжыць шмат сынонімаў: гэта піўны склеп, бар, кабачок, шынок і сярэдняй рукі рэстаран.



Алена Ціхановіч

такое кодла больш да сьмерці — ні нагой. Карчма — гэта месца, куды госьць сьпяшаецца толькі дзеля таго, каб даведацца ад іншых, што казаў і што рабіў, каго пакрыўдзіў і каго слаўна перамог у той вечар, мінулы. Карчма — і месца, дзе кажаш тое, што ў іншым месцы ня скажаш, хоць і ведаеш, што рызыкуеш паплаціцца пратаколам, які ўжо склалі ці складаюць супрацоўнікі VB**.

Карчма — гэта таксама і біржа працы, тут пры піве можна нават дамовіцца пра будоўлю ўласнага дому пад ключ, знайсьці памагатых, якіх ня знойдзеш нідзе, акрамя як тут, карчма яшчэ й месца, куды прыходзяць маладыя дзяўчаты па піва, пакуль карчмар цэдзіць піва ў збанкі, дзеўкі сочаць, каб не даліў, усе госьці змоўкнуць, і ня тое што разглядаюць прыгожыя целы ў джынсах ці грудзі ў блюзачках, але проста так сьціхнуць, таму што мімалётным вокам госьці дакрануліся да красы, а тая ніколі не на вуліцы, але найперш у карчме, калі каля стойкі стаіць маладзіца і ведае, што хаця на яе і не глядзяць, але ўсе мужчыны ўражаныя тым, што міжволі прынесла яна ў карчму, і гэта толькі ўсьцешыла маладзіцу, пацьвердзіла ёй, што яна мае тое шчасьце, што ўзнагароджаная прыгажосьцю. У Яроўшка, калі прыходзілі дзьве маладзіцы на піва, чарнявая і рыжая, калісьці і я быў уважаны тым, што глядзеў у другі бок, але добра бачыў тое агульнае асьляпленьне ад тых дзьвюх дзевак у джынсіках... Ніколі і нідзе тыя дзеўкі, нават на футболе, не выглядалі так пекна, як каля піўной стойкі, калі Яроўшак наліваў ім піва і таксама, як і астатнія, ня мог гаварыць... Калі тыя дзеўкі адыйшлі са збанкамі, яшчэ доўга было ў карчме ціха, памалу, блытаючыся ў хадзе гаворкі, у словах, госьці вярталіся да размовы і развагаў, і банальнасьцяў, якія, як сказаў бы Поль Элюар, былі перарваныя зьяўленьнем запаленых лямпаў у белы дзень. Карчма — рухомы маятнік, прыгожае і брыдкае, тут і там, нуда і розварух, каралеўства недасьледаванай прастаты. Напружанасьць, калі ўвойдзе нетутэйшы, чужынец. Шынок, дзе госьці сядзяць на дотык локця, хаця, калі некаторага госьця дакранецеся локцем, адчуеце як бы электрычны разрад. У пэўных шынках, як часам ў "Златым тыгры" і "У Ёлінка", госьці на лаўках так прыціснутыя, што адзін зьліваецца з бокам другога, толькі што і вольная адна рука, каб дацягнуцца да вушка куфля. Госьці прыціснутыя як сьвятыя на тымпаноне Porta Coeli***. Адметнасьць "Тыгра" — калі там нехта на лаўцы ў куце пад вакном ці пад вялікімі рогамі хоча ў прыбіральню, усе хапаюць стол і разам з куфлямі падымаюць яго да люстры, і толькі з прыхіленай галавой увойдзе госьць у прыбіральню, а калі вяртаецца, то пачынаецца тое самае падыманьне стала, каб той, хто адыйшоў, вярнуўся туды, адкуль выходзіў. Шынок — гэта таксама месца, куды прыходзяць мужыкі і тыя, якія даўно ня бачыліся, тыя, у каго сьвята ці дзень нараджэньня, так міла-міла абдымуцца і расцалуюцца так старазапаветна, уціраючы шчырыя п'яныя сьлёзы са зморшчаных павек. Так у тых маіх шынках, калі ў некага сьвята, дзень нараджэньня, дык адкуль ні вазьміся на стале букет, цэлы дарагі букецішча. На стале абрус, ніхто яшчэ не прыйшоў, стан чаканьня, але для іншых прысутных тут госьці ўжо як бы былі. Прыходзяць госьці, зьбіраюцца заўсёднікі і той, для каго прыбраны стол зь вялізным букетам. І зноў сьлёзы, усьмешкі, стрыманыя парывы. Любіў я той доўгі стол, апошні стол у шэрагу, дзе сядзеў пан Дэйл, той кут з доўгім сталом "У Залатога тыгра", дзе зьбіраліся, як заўсёды, кожны чацьвер удзельнікі бунту ў Каторскай затоцы****. Пан Прахазка падаў ім напоўніцу налітыя куфлі, саставіўшы іх як судны на Каторскім вэрфе, і бунтары ўсталі. Яноўшак даў каманду, той Яноўшак быў наймешны, астатнія ўдзельнікі былі здаровыя мужыкі, — і па той камандзе пілі з паўнюткіх куфляў і тады, калі ўжо мелі шостае піва па камандзе, трымаліся героямі як пры першым, толькі Яноўшак ап'янеў, але па камандзе трымаўся, аж пакуль урэшце не заснуў на плячы старэйшага з паўстанцаў. Цяпер ужо зьбіраюцца выпіць недзе ў іншым месцы, і па іх ня сумна, забыліся мы, аднак, на тых віцязяў. Ёсьць і такія шынкі, пры якіх цэлы дзень сядзіць, а потым ляжыць сабака. Напрыклад, на Панскай вуліцы ля піўной стойкі ляжаў цэлы дзень бэрнандын; такога ажыўленага ходніка як на Спаленай вуліцы ня знойдзеш, але і на тым ходніку ад паўдня спаў расьцягнуўшыся бэрнандын, людзям трэба было саступаць на дарогу, а пёс спаў, таму што ягоны гаспадар адскочыў на адно піва. З усіх краінаў на сьвеце для мяне наймілейшая Грэцыя, быў там у карчме, і туды прыйшоў пан з сабакам, пілі ўзо, шмат узо, а сабака сабе лёг пасярод — ня ходніка, але дарогі. А паліцэйскі стаў ля таго пса, ля таго астраўка, утвораната сабачым целам, і кіраваў рухам так, каб ніхто не пераехаў пса, а той пёс спаў доўга, і гэтак жа доўга кіравала паліцыя дарожным рухам, каб ніхто не пераехаў сьпячага пса, яго ж гаспадар піў узо ў маленькім бістро пры дарозе.

Карчма — усё ж калектыўны тэатар, happening. Мільёны корчмаў і карчомак штодня асьвятляюць людзкімі тварамі месты і вёскі, і хутары, звычайныя людзі ўздымаюць тут сваё звычайнае жыцьцё да мяжы жыцьця і сьмерці. А ўсё тут пачынаецца гульнёй і першай фразай, якая заўсёды задуманая інакш. Ад гэтага *інакш* пачынаецца зрушэньне сэнсу, людзкая гамонка як працоўны станок, які, аднак, робіць і брак. Гэтым бракам пачынаецца happening. Развал картачнага доміка. Карчма — гэта таксама такое месца, у якім найменш за ўсё клапоцяцца пра зьмяненьне сьвету, пра рэвалюцыю, пра контрарэвалюцыю. Карчма ёсьць месца, якое больш за ўсё супраць вайны. Хто ходзіць у карчму, не жадае скончыць сваё жыцьцё салдатам, забітым на чужой зямлі, зрэшты, як не жадае загінуць і на радзіме, у тым горадзе, мястэчку ці вёсцы, дзе стаіць яго карчма. Ягоная мара жыцьця — памерці ў той самай карчме, у якую ходзіць. Такое здараецца рэдка, але ў тым і бляск заўсёдніка карчмы. Мяркую, што ўсе тыя ваякі, якія мелі час думаць і задумацца пра свой лёс, калі паміралі са зброяй у руках на чужой зямлі — будзь у іх магчымасьць цудам вярнуцца ў сваё мінулае — яны б не пажадалі нічога іншага, як яшчэ раз вярнуцца да сваёй піўнушкі, апынуцца сярод сваіх сяброў і не хацелі б нават, каб іх арміі перамаглі. Наведніку карчмы хопіць у жыцьці працы, яго сям'і і яго карчомкі. Гэта надзвычай мала, але ўсе ідэалёгіі надзвычай нядобразычлівыя і непрымірымыя да піцейных месцаў. Усе канфліктныя сытуацыі, якія маюць простыя людзі, можна вырашыць за куфлем піва. Гэта мала, але гэта так. Асабліва калі кажуць, што першы выбух атамнай зброі будзе каштаваць жыцьця мільярдам людзей, а тэмпэратура на зямлі ў той час ўпадзе на мінус дваццаць пяць градусаў. (Таму спажываньне піва) — гэта вялікая канцэпцыя, вялікая сіла, тая ж вялікая бітва за мір. Дваццаць пяць градусаў марозу — ды па кветках, ды па касулях, ды па людзях. Аж вось не наведнік карчмы давёў сьвет і чалавецтва да гэтага! Баязьлівасьць часам бывае найвышэйшай мужнасьцю, недавярак найлепшым вернікам, асьцярожнасьць найвышэйшай агрэсіўнасьцю. Абмежаваньне малым ёсьць найвышэйшая вартасьць. Спаліць сьвет у вайне, спаліць сьвет у рэвалюцыі і гвалце ёсьць злачынства ня (толькі) супраць людзей, але супраць карчмы — той самай дурной, самай банальнай карчмы.


Богуміл Грабал у карчме "У залатога тыгра".

Пераклад з чэскай Алены Ціхановіч

Філакова – горад у Славаччыне, дзе здаўна займаліся вырабам паліванага посуду, сталёвых і чыгуновых печак, таксама паліваных.

***VB – Veřejná bezpečnost, у Чэхаславаччыне – органы грамадзкага парадку, міліцыя.*

****Porta Coeli – манастыр у мараўскім мястэчку Цішнор, паблізу Брна.*

*****Бока Каторска – затока на ўзьбярэжжы Адрыятычнага мора ў Чарнагорыі, дзе ў 1918 годзе адбылося паўстаньне аўстра-вугорскіх маракоў.*

Аляксандар Лукашук

Піва з тыгрыцай

У карчму "У залатога тыгра" я патрапіў, калі Богуміл Грабал яшчэ быў жывы і штодня, як папярэднія трыццаць ці сорак ці, можа, пяцьдзесят гадоў зьяўляўся ў тую самую гадзіну на вуліцы Гусава, 17, штурхаў старыя дзьверы, прыпыняўся ля стойкі, абменьваўся парай слоўцаў з карчмаром і йшоў за свой столік. Несьлі піва ў асабістым куфлі, першае зь ягоных чатырох, і народ млеў: Богуміл на месцы, значыць у сьвеце ўсё ў парадку — Зямля круціцца, жанчыны нараджаюць, піва бродзіць. Апошні год ён прыяжджаў на інваліднай калясцы, што аднак ніяк не адбівалася на колькасьці выпітага і якасьці напісанага.

На праўду, да "Залатога тыгра" я патрапіў не праз любоў да літаратуры, а дзякуючы прэзыдэнцкаму органу. Напярэдадні леташняга рэфэрэндуму мы правялі гутарку за круглым сталом Радыё Свабода. Менская газэта, якая спэцыялізуецца на злодзеях у законе, абуралася тым, што адзін з удзельнікаў перадачы, Сяргей Навумчык, заклікаў людзей на плошчу, а сам сядзеў у Празе і папіваў Праздрой.

Увагу выклікала не натацыя наконт заклікаў, якіх не было, — чаго не прымроіцца органу прэзыдэнта? — а заява, што мы п'ем Праздрой.

У Празе ёсьць сякі-такі выбар піва: Пльзенскае, Будзёвіцкае, Старапрамен, Златы Трыюмф, Старобрно, Лоўнска дэсітка і Браніцка дэсітка, Бэрнард, Лоўны дункель, Мештян, Прымус, Радгаст, Гамбрынус, Велькапаповіцкі Козел, Крушовіцэ сьветлае і чорнае, і "лежак" — якому даюць спачатку вылежацца, такая яго натура.

Гэта тое, што прыйшло на памяць, але і з гэтага можна здагадацца, дзе жывуць піўныя чэмпіёны сьвету: 160 літраў у год на кожную чэскую душу пакідаюць далёка ззаду душы баварцаў, ірляндцаў і ангельцаў. Піва ў Празе ёсьць — але вось менавіта Праздрою, якім папракала прэзыдэнцкая газэта, мы ніколі ня бачылі і не пілі. Няўжо ў сталіцы СНГ лепш ведаюць, што п'юць у сталіцы Піва, дзівіліся мы, пакуль знаёмы бармэн не пацьвердзіў: так, у Празе сапраўды прадаецца чэскі Праздрой — разьліўное піва вышэйшай катэгорыі, якое можна пакаштаваць у карчме "У Залатога тыгра" — калі туды пашанцуе патрапіць. Там сваё кола заўзятараў, прэзыдэнт Вацлаў Гавал прыводзіў туды на піва прэзыдэнта Біла Клінтана, там наталяў смагу самы тоўсты тэнар сучаснасьці Лючыяна Павароці, там штодня разглядае сьвет праз шкло куфля легенда чэскай літаратуры Богуміл Грабал...

У невялікай, столікаў на пятнаццаць, выцягнутай кішкою карчме было людна і шумна. Цудам знайшліся самыя лепшыя месцы: мы селі ў куце, зь якога адкрывалася ўся дыспазыцыя.

Пад стольлю плаваў тытунёвы дым, бармэн пускаў пругкі залаты струмень у куфлі, якія адразу падхоплівалі кельнэры ў зялёных камізэльках, на сьцяне вісела карціна "Пяшчотны грубіян і красуня-тыгрыца", падораная Грабалу ягоным сябрам мастаком Здэнэкам Залэшакам: там над галавой пісьменьніка ў аблоках лунае тыгрыца з жаночай галавою; пад карцінай у куце нехта граў на гітары і прыемным барытонам вёў песьню, і прыпеў падхоплівалі ягоныя субутэльнікі (хоць бутэлек там не бывае), сярод якіх вылучаліся дзьве дзяўчыны нішто сабе...

Чалавецтва дзеліцца на дзьве часткі: тыя, хто ходзіць на піва, і тыя, хто ня ходзіць. Мяжа тут не гастранамічная, а філязофская: паход на піва ёсьць адказам на пытаньне: як жыць? Дзеля мэты ці проста кожнай хвілінай? Ставіць на выйгрыш і чакаць яго, усё падпарадкаваўшы зорнаму моманту, які прынясе пераможны трыюмф? Такую публіку цяжка ўявіць за куфлем — хто хадзіў на піва з Напалеонам ці частаваў воблай Цэзара?

Другая частка чалавецтва выбірае піва. Ейны выбар — шлях, а ня мэта, працэс, а ня вынік. Толькі тады, сьцьвярджае гэтая філязофія, ты ніколі не прайграеш; бо калі ты жывеш дзеля таго, каб дасягнуць нейкай мэты, і не дасягаеш яе — ты прайграў; калі ж ты жывеш дзеля працэсу і маеш задавальненьне кожны дзень — ты ніколі не пацерпіш паразу, бо тваё ўжо пражытае ніхто не адбярэ, нават Пан Бог. Так жывуць паэты, сяляне, манахі і блудніцы.

І ёсьць толькі адно месца, дзе гэтая тайна раптам адкрываецца астатнім, хто яшчэ не рабіў выбару, дзе кожны становіцца паэтам, манахам, і жанчыны цяжкіх паводзінаў чуюцца лёгка, як Афрадыты ў пене — гэта карчма, півярня, шынок.

Кельнэры ў прыстойнай карчме ўмеюць чытаць думкі. Як толькі паказвалася дно куфля, перад намі зьяўлялася новая пара, і дадавалася новая рысачка на цэтліку, што ляжаў на стале, і рысачкі праз некалькі гадзінаў ужо нагадвалі няроўны штыкетнік, які валіўся на бок — і Богуміл Грабал па-свойску падміргваў нам з карціны пра сябе і красуню-тыгрыцу.

— Тыгрыца з жаночай галавой ці жанчына зь целам тыгрыцы, спрачаліся мы зь сябрам. Тыгрыца, даводзіў я, зірні толькі на кіпцюры. Жанчына, не адступаў сябра, бачыш, якая ў яе далікатная шыя; А хвост, што ты маўчыш пра хвост, націскаў я; А што хвост, ня гэта галоўнае, паглядзі, якія ў яе цыцкі, адказваў сябра. Цыцкі сапраўды былі зайздросныя, што тут скажаш, але што рабіць з тулавам драпежнай кошкі? Ня злобцеся, пане, умяшаўся сусед па століку, а ці было б лепш, калі б цела было жаночае, а галава тыгрыцы, — глынуў ён са свайго куфля і працягваў: — Любая жанчына — гэта тыгрыца, скажы, Эва; я табе скажу, я табе потым усё скажу, пяшчотна абяцала Эва, і карункавая пена зьмяілася на залатой паверхні куфра, які вільготна зьзяў у ейнай вузкай і моцнай далоні.

На пачатку лютага тыгрыцу захінулі чорнай хусткай — у "Залатога тыгра" была жалоба па Богумілу Грабалу — чалавеку, якому жылося, як пісалася, і ён сам напісаў сваю сьмерць у палёце. Ягоны дэвіз: "Той, хто хоча жыць у Цэнтральнай Эўропе, павінен заўсёды быць нападпітку" — ёсьць не запавет заўсёдніка карчмы, а вынік духоўнага досьведу XX стагодзьдзя. Богуміл Грабал, пяшчотны грубіян і ягоная красуня-тыгрыца будуць заўсёды глядзець на наведнікаў "Залатога тыгра", дакладней, крыху вышэй, над галовамі, ягоны позірк туды, за нас, куды і як мы ідзем і жывем, ці смакуем кожную хвілю, як кожную кроплю залацістага Праздрою, якім Злата Прага памінала свайго залатога сына.

Прага 12 лютага 1997

Адам Глёбус

Апавяданьне

ЛІСТЫ ЗЬ ЛЯКАРНІ

1.

Зоня, вітаю.

Трапіў у Феадосію і адразу апынуўся ў траўматалёгіі.

Цэлы тыдзень ляжу на сьпіне. Крышку паламаўся... З вакзала пайшоў на пляж. На грудзях — заплечнік, на сьпіне — палатка. Убачыў мора, падвярнуў нагу. Упаў на голень разам з палаткай і заплечнікам.

У бальніцы сустрэлі ветліва.

2.

Лепей быць багатым дый здаровым, чым хворым у Крыме.

Помні, Зоня: хірургі — садысты.

3.

Думаю толькі пра пераламаныя косткі. Пераломы... І ніводнае думкі.

4.

Пішу табе, Зоня, паклаўшы руку на здаровае сэрца. Хірургі сказалі — матор моцны.

Замест крабаў на дне марскім лаўлю прусакоў на сьцяне.

Крымскі прусак мае шэсьць непаламаных лапаў. Кожная падзяляецца на тры часткі — сьцягно, голень, ступак. Прусак вельмі хутка варочае ступакамі і ляціць у начной цішыні, пляскаючы падэшвамі па вэртыкальных паверхнях.

Прусачынае тулава мае паласаты жывот з рабрыстай паверхняю, каб рэзка тармазіць на люстраных плоскасьцях. Тулава бывае пляскатым ці пукатым, залежыць ад напханасьці.

Вочы гараць і сьвецяцца фосфарам, калі прусак хоча есьці, піць або спарвацца.

Дробныя зубы рассыпаныя па ўсім роце да самага жывата.

Доўгімі вусішчамі феадасійскі прусак расчышчае шлях пад час імклівага бегу.

Ліст пра прусака высылаю замест абяцанага чарнаморскага краба.

5.

У палаце №35 ляжыць дзед Жудаеў. Шэсьць дзён яго не наведвалі.

На сёмы дзень дзед паклікаў сястру міласэрнасьці і сунуў ёй у руку паперку.

— На, Іра, пазвані па гэтым нумары і скажы: "Жудаеў памёр!"

— Нельга.

— Скажы: "Жудаеў здох!"

— Не магу.

— Тады кажы пра цяжкі, перадсьмяротны, крытычны стан.

На наступны дзень, а восьмай раніцы да дзеда прыйшло дванаццаць маладых людзей — разьвітацца.

З кожнага адведніка Жудаеў браў на крэмацыю па трыццаць тры грыўны.

У Жудаевых жудаеўскае жыцьцё.

6.

Зараз усё сьпіць, зусім рана.

Сусед Андрый учора вучыўся хадзіць і ўвесь час падаў. Як сам выказаўся: дупай мераў калідор. Тэрмін крымскае прапіскі сканчаецца. Хутка буду. Зоня, сьцялі пярыну.

12.02.1997



Здымак Алены Адамчык

Ігар Бабкоў

БАЛКАНСКІ

Галава Ёхана Ота сунулася па зямлі. "У бруд мяне выкачаюць... — падумаў ён. — Ды нічога. Заўтра я буду цьвярозы... І гэты кашмар скончыцца назаўсёды".

Справа дымілася возера, падобнае да мора. Празь цьмяны морак былі бачныя горныя вяршыні. Охрыд. Хрыплыя вятры прадзімаюць цябе з усіх бакоў. Аўтобус паступова падымаецца па горным сэрпантыне, вяршыні так блізка. Дамы лепяцца да зямлі, да схілаў, адзін да аднаго, разам і паасобку, як быццам з кожным стагодзьдзем яны мусяць ускарасквацца ўсё вышэй і вышэй. І адразу колеры: розныя адценьні барвовых, брудна-шэра-зялёныя, сьветлыя, амаль белыя на абломах скалаў. Чырвоная дахоўка і сіняе, амаль без аблокаў, неба. Белыя стрэлы мячэцяў з чорнымі дзюбамі, пракаветная бізантыка цэркваў, краявіды, якія могуць адно прысьніцца. Мы стомлена маўчым. Македонія.

Падарожныя нататкі не атрымоўваюцца, і гэта натуральна. Праўдзівае падарожжа — унутранае, тое, што цябе зьмяняе, у табе застаецца. Тое, што ты гатовы ў сабе пакінуць.

Балканы для Беларусі могуць быць толькі сном: прыгожым, нечаканым, небясьпечным, фантасмагарычным, нерэальным. Сном, які не забываецца пры абуджэньні, сном, які трывожыць, ад якога ня хочацца прачынацца... Балканская таямніца — "гэтыя праклятыя прасторы не даруюць інтэлектуальна й духова ўзьнёслым". А якія даруюць?

Дарагая сястра, я пішу табе ліст, каб сказаць табе, што ўсё нармальна ў нас. Толькі дождж палівае ня дзень і ня два, і ня тыдзень. Але гэта звыкла.

ІНШЫЯ

У горнай мясьціне

"То ж ён у Мілфард-Хэйвэне: чытай далей, скажы, ці гэта блізка..."

(Шэкспір, Цымбэлін, 3.2.49-50)

"Не магу ўявіць сабе валійца, які аддаў бы сваё жыцьцё за бацькаўшчыну" — гэтак завецца артыкул Шосава МакГрыаны (Seosamh MacGrianna), надрукаваны ў перакладзе ў Planet, часапісе зь дзівосным падзагалоўкам "Валійскі інтэрнацыяналіст".

Не хвалюйцеся, гэта ня мае нічога агульнага з інтэрнацыяналістамі, якія гавораць толькі на адной мове... Рэдактар гэтага часапіса аднойчы напісаў кнігу "Валійскі экстрэміст", назоў якой уяўляе сабой іншую варыяцыю на тэму нацыяналізму, правакацыйна выбраўшы правакацыйную шыльду, каб адстойваць нацыяналістычную справу ў рамках ангельскай тэрміналёгіі, цытуючы сярод іншых Орўэла ў абарону сваіх пазыцыяў. Варта кінуць адно хуткі позірк на зьмест некалькіх нумароў часапіса, каб пераканацца, што (інтэр)нацыяналізм Planet — гэта спосаб выявы салідарнасьці прыгнечаных нацыяў, кельцкіх і ўсялякіх іншых.

Шосаў МакГрыана — адзін з пакутнікаў ірляндзкай літаратуры. Пасьля дзесяцёх гадоў перакладаньня на ірляндзкую мову ангельскіх раманаў за мізэрную плату, у 1930-х гадох ён узяўся пісаць свае кніжкі — і падарожнічаць, як Падрыг О Конара (Padraig O Conaire), асабліва ў Валіі. "Мой шлях" — завецца ягоная найбольш вядомая кніга. Апошнія 50 гадоў свайго жыцьця ён правёў у шпіталі для вар'ятаў.

Аднак сёньня я хацела напісаць не пра Шосава МакГрыану. Я й сама скаштавала Валіі, і таму назоў ягонай кнігі адгукаецца ўва мне чароўнымі адгалоскамі. Усе яны сыходзяцца вакол постаці паэта Уолда Уільямса (Waldo Williams). Аднак падыйдзем да яго здалёк...

Я пачала вучыць валійскую мову, бо праз вуліцу насупраць маёй працы былі вячэрнія курсы. І таму што валійская мова выглядала лягчэйшай за ірляндзкую: проста вымавіць слова, запісанае пэўным правапісам, здавалася цалкам магчымым у першым выпадку і зусім немагчымым у другім. Да таго ж, валійскую мову некалі вывучыў Джэрард Мэнлі Хопкінс (Gerard Manley Hopkins). У мяне былі знаёмыя, якія захапляліся валійскай паэзіяй, я прачытала кнігу "Валійскі экстрэміст" у мясцовай бібліятэцы, і гэтая кніга вельмі адпавядала агульным настроям сямідзясятых гадоў...

Гэта былі часы, калі нейкі момант было модна разважаць пра малыя нацыі, прынамсі калі чытаеш адпаведныя часапісы ("У малым — прыгажосьць!"), калі людзі песьцілі летуценьні аб "балканізацыі", калі нацыяналісты з ангельскіх рэгіёнаў зьбіраліся на канфэрэнцыю ў Уіндзары — было ў гэтым нешта ад рамантычнага сярэднявечча ў духу Чэстэртонавага "Напалеона з Нотынг-Хілу", вядома ж, ня гледзячы на зусім рацыянальную сутнасьць падзеі...

А валійская мова, у пэўным сэнсе, была проста яшчэ адной мовай. Тымчасам як узяцца за вывучэньне ірляндзкай — мовы, якой я ў сваёй пратэстанцкай школе была пазбаўленая — было б палітычным актам (улічваючы падзел Ірляндыі), а я яшчэ была не зусім гатовая, каб адкрыта на гэта наважыцца.

Ці важкія прычыны? Дастаткова важкія. Я вывучыла даволі, каб пагаварыць пра кухонны стол (вельмі важна!), каб адчуць, што мова яшчэ жывая ў Паўночнай Валіі, хоць нідзе не было відаць пісанага слова (гэта было ў сямідзясятых гадах — цяпер, дзякуючы актывістам, усё выглядае іначай) — выразны кантраст з ірляндзкай сытуацыяй, дзе мова выступала на паверхні толькі ў афіцыйным пісьмовым кантэксьце.

Уолда Уільямс не адыгрываў вялікай ролі ў "Валійскім экстрэмісьце". Ня гэтак, як Сандэрс Люіс (Saunders Lewis) і Гуэналт (Gwenallt). У пасьляслоўі, напісаным на 20 гадоў пазьней, аўтар прызнаўся, што яго хвалілі за радкі: *"палі* зялянейшыя і мора сінейшае дзякуючы нябачнай прысутнасьці *былых пакаленьняў"* — якія былі міжвольнай цытатай з аднаго з Уолдавых вершаў (пра шкілет дзяўчыны з нэалітычнага пахаваньня). Так, Уолда сапраўды *найбольш цытаваны* з усіх сучасных валійскіх паэтаў.

Спачатку я ня ведала, што ён квакер, надзелены квакерскім пачуцьцём неабходнасьці "выказваць праўду ўладам". І хоць мая школа, якую я назвала пратэстанцкай, якраз і была квакерскай — ясная справа, што я даведалася пра "выказваньне праўды ўладам" значна пазьней! А квакеры, якіх я ведала, былі занадта занятыя разьвянчаньнем прапаганды аб "расейскай пагрозе" (уклад у раззбраеньне?), каб мець час на падазронага *нацыяналіста*...

Тым, каму квакеры не знаёмыя з "Арабесак" Мыколы Хвылёвага, патлумачу, што яны найбольш вядомыя супольным маўклівым сядзеньнем і чаканьнем прасьвятленьня, знаку духовага *сьвятла*, не жадаючы падманвацца штампаванымі фразамі.

Я адчула да яго блізкасьць толькі калі мой валійскі настаўнік, колішні баптысцкі прапаведнік, сказаў: "Можа вы зь ім калі сустракаліся на квакерскіх сходах у Мілфард-Хэйвэне?" — хоць Мілфард-Хэйвэн быў для мяне толькі назовам мясцовасьці з Шэкспіра (Цымбэлін: "У Валіі, горная мясцовасьць зь пячорай" — зь пячорай Беларыюс), я там ніколі не была! А пасьля мне трапіліся рукапісы, якія за непатрэбнасьцю выкідала мая старая сяброўка: яна працавала машыністкай у Дасьледным Інстытуце Малочнай Прамысловасьці, але ў вольны час друкавала кнігі біскупам і прафэсарам тэалёгіі (з надзеяй знайсьці ў іх аргумэнты ў падтрымку сваёй схільнасьці да Свэдэнборга і Тэяра), і адзін зь яе прафэсараў вывучыў валійскую мову, каб чытаць паэзію накшталт той, што пісаў Уолда.

Квакер Уолда Уільямс, навернуты ў рыма-каталіцызм Сандэрс Люіс, хрысьціянскі сацыяліст Гуэналт, кальвініст Бобі Джонс (Bobi Jones) і англіканскі (у Валіі) сьвятар Юрэс Боўэн (Euros Bowen) — усе яны пісалі паэзію ўсхваленьня, расчараваныя больш стрыманай ангельскай традыцыяй. (Выразны кантраст з Ірляндыяй, дзе ўсё станоўчае ў рэлігіі, калі такое ёсьць, цалкам аддадзенае сьвятарам, тым часам як пісьменьнікі займаюць аж занадта крытычную пазыцыю — вось калі ўлада Рыму выходзіць бокам!)

У мяне была адна ягоная кніжка. Маленькая, старонак на сто. 1956. І валійскі слоўнік. Аднак мець пад рукою пераклады — зусім іншая справа.

Уолда Уільямс (1904-1971) вывучаў валійскую мову на вуліцы, яшчэ хлопчыкам перасяліўшыся з англамоўнага рэгіёну. Ягоныя вершы ў бальшыні сваёй прывязаныя да палітычных падзеяў і праблемаў: змаганьне супраць абавязковай службы ў войску (1938-1956; ён памяняў працу, каб мець магчымасьць адмовіцца ад сплаты падаходных падаткаў, і ў выніку адседзеў некалькі тэрмінаў у турме), а адразу пасьля Другой сусьветнай вайны — супраць акупацыі пагоркаў ягонага дзяцінства брытанскім войскам, якое зладзіла там яшчэ адзін палігон.

Ён быў не адзіным вялікім валійскім паэтам, які прыбегнуў у палітыцы да непасрэднага дзеяньня. Сандэрс Люіс у 1936 годзе сымбалічна падпаліў помнік ранейшага ўварваньня брытанскага войска ў валійскія сьвятыя мясьціны, а сваю абарону ў судзе (у выніку беспасьпяховую) ператварыў у паказальны працэс у змаганьні за нацыянальную справу.


Яшчэ адзін кантраст з Ірляндыяй — гэтая адмова ад гвалту. Модна казаць, што Падрыг Пірс (Padraig Pearse), наш вялікі ідэоляг, як мага стараўся скапіяваць ангельскія інстытуцыі, накшталт "публічных" (г.зн. элітарных!) школаў і скаўтынгу, уваскрашаючы або выдумляючы ірляндзкія спартовыя гульні на замену ангельскім, і г.д. І заахвочваў сваіх вучняў быць гатовымі да пакутніцкай сьмерці... Тым часам як Уолда, падобна як Гандзі, выбраў для перайманьня забытую (паўночна)ангельскую традыцыю (а не імпэрскія інстытуцыі) і павярнуў яе супраць цэнтру...

Адсюль, мабыць, гвалтоўнасьць ірляндзкага супраціву, нават галадоўкі дзеля пакутніцтва ад роспачы, а не дзеля дасягальных палітычных мэтаў, як у Гандзі... Як шкада, што ірляндзкая і валійская традыцыі могуць камунікавацца толькі праз пасярэдніцтва ангельскай мовы (бо нашыя мовы значна больш далёкія міжсобку, чым ірляндзкая і гэйльска-шатляндзкая, або валійская і брэтонская) — нам, ірляндцам, ёсьць чаму павучыцца!

Я зайздрошчу Уолдавай афарыстычнасьці. Сапраўды квакерскі талент — выказваць тое, што думаюць іншыя! Загалоўкі ягоных вершаў гавораць самі за сябе: "Мова", "Міратворцы", "Братэрства", "Валія заадно"... Назоў кнігі, "Лісьцё дрэва", адсылае да Апакаліпсісу 22:2: *"І лісьцё дрэва на аздараўленьне народаў"*. І да Кітсавага ліста з 1818 году: "што калі паэзія не паяўляецца гэтак сама натуральна, як лісьцё на дрэве, дык хай бы лепш яна зусім не паяўлялася".

(Аднак першай мне прыйшла на думку цытата зь Ейтса, "Па прысадах у Салі-Гардэнс": "Кахай мяне так проста, як расьце на дрэве лісьцё" — асабліва ў выкананьні Clannad зь сямідзясятых гадоў. Але ў заўвагах у канцы кнігі пра гэта няма ніякай згадкі!)

Вось колькі прыкладаў, адвольна гартаючы Planet. *"Мы не заўважылі яе. Яна была сьвятлом, бяз фарбаў і адценьняў"*. ("Мова") *"Вось горы. Толькі адна*



СОН



Ляндшафты: няма анічога больш адрознага ад беларускай прасторы, зь яе архетыпамі лесу, балота, твані — і адначасова шырокіх прастораў, — чым гэты край бясконцых уздымаў, вечных вышыняў, гасьцінцаў-сэрпантынаў, што блукаюць па схілах, пяшчотна абвіваючы горы, ахутваючы іх пракаветным памкненьнем узьнесьціся. Неба? Неба блізка. Але ад гэтага ягоная недасяжнасьць яшчэ больш пужае. Што значыць жыць у штодзённай прысутнасьці неба?

Інакшасьць гэтае прасторы можна зразумець, прыгадаўшы фальклёрны вобраз падарожжа... Клубочак коціцца, герой выпраўляецца ў бясконцыя блуканьні, прастора размыкаецца, вядзе наперад. Балканы — замкнёная прастора. Тут усё адбываецца больш інтэнсіўна, больш балюча, больш непасрэдна. Тут няма выйсьця. Тут ёсьць глыбіні й вышыні. Клубочак коціцца ў неба, альбо ў пекла.

Мы жывем на балоце, мы любім яго, пра яго мы сьпяваем і пішам палотны, і таму пад даждЖом мы як рыбы ў вадзе.

Ідэнтычнасьці: Мы ідэнтыфікуем баўгарскае віно, у чаканьні аўтобуса да Скоп'е. Віно завецца "Сафія", як і места нашага чаканьня. Сафія, мэтраполія Ўсходу. Турцыя, Грэцыя, Альбанія, Баўгарыя. Славянства тут — прыгожая легенда, замацаваная мовай, культурай, стэрэатыпамі ўспрыняцьця. Мэнтальнасьць, антрапалёгія — ад Усходу. Вір жыцьця. Чаканьне Цара Сымэона Другога. Файная турэцкая кава. Францускія постструктуралісты па аднаму даляру ў Францускім Інстытуце.

Чаму Юлія Крысьцева й Цьвятан Тодараў не вяртаюцца ў Баўгарыю? Ёрдан Ефтымаў, рэдактар Літаратурнага весьніка й аўтар паэтычнага зборніка "Мэтафізыка мэтафізікі" замаўкае надоўга. Можа таму, што тут ёсьць адно тэкстуальнасьць і аніколі — тэксты?

Канфэрэнцыя таксама пра ўсё гэта. Ідэнтычнасьці, тэксты, тэкстуальнасьці. Шматмоўе. Lingua franca ня мае аніякіх шанцаў на гэтых прасторах. Тут магчымыя адно лінгвы франкі.

Гардана Стойкаўска, гаспадыня нашае сустрэчы, сэрбка. Піша па-македонску. Яе раман "Колер бясчасься" ляжыць у мяне на стале. Яго перакладуць на беларускую мову. Ад пэўнага часу мяне менш цікавяць мёртвыя клясыкі, чым жывыя сучасьнікі. Наіўнае разуменьне юнацтва — вось прачытаеш Лао Цы, Сэлінджэра, Гайдэгера, Рыльке — і зьменісься незваротна — гэтага адчуваньня больш няма. Гардана вядзе дыялёг з Арыстотэлем, з адмыслова македонскім, апакрыфічным Арыстотэлем (беларускі Міцкевіч таксама культурны апокрыф), распавядае яму пра Дажджбога, пра балканскі злы лёс. Зрэшты, мы ўсе — культурны апокрыф, усе мы распавядаем камусьці пра восень, пра ідэнтычнасьць невялічкіх фрагмэнтаў быцьця, у якіх мы жывем. Валянцін Акудовіч апантана распавядае камусьці пра вайну культураў і пра перамогу ў ёй адзінай мэтакультуры. У гэты час Віктар Халіпаў сядае ў Гумілёўскі "Трамвай" і пачынае выпраўляць квіткі ў кожнага слова. Ён — кантралёр з клясычнай структуралісцкай школы. Даніца Андрэевіч гаворыць пра Кнігу. Ана Пэйчынава — пра паэтычнае быцьцё як вяршыню ідэнтыфікацыі. Я — пра полікультурнасьць. Балканы ў маёй крыві.

Дарагая сястра, тут адныя крычаць, тут плачуць другія, а трэція скачуць. І ў гэтым гармідары словы пачуць немагчыма. А гэта значыць, што дождж ня спыніцца колькі гадоў, і будзе дождж, і будзе слота.

Мультыкультуралізм: Тэарэтыкі мультыкультуралізму гавораць па-ангельску. Іхныя стэрэатыпы, мэнтальныя звычкі і рэакцыі паўсталі на подзе адной з найбольш самадастатковых мэтакультураў. У іхным разуменьні мультыкультурнасьць — гэта адзіная мэтамова з рознымі адсекамі для групавых ідэнтычнасьцяў. Ці здольны хто-небудзь зразумець і прыняць культуры, у якіх "найбольшая разнастайнасьць існуе ў межах найменшае прасторы"? Культуры, якія напісалі свае тэксты на розных мовах, якія маюць традыцыю, што належыць адразу некальком культурам і адначасова — ніводнай аднаасобна.

Каму належыць Меша Сялімавіч? Басьняк паводле нараджэньня, югаслаўянін паводле сьвядомасьці. Ягоны раман "Дэрвіш і сьмерць" (які таксама будзе перакладацца на беларускую мову) — гэта экзыстэнцыйная эпіка, унутраная Адысея басьняцкага дэрвіша Ахмеда Нурудзьдзіна. Каму належыць меша сялімавіч? Ахмэд Нурудзьдзін належыць толькі сабе. Так ён думае.

Другая Эўропа: Нарэшце. Мы ўтвараем міжнародную групу інтэлектуалаў. З гэтай жа назвай — "Другая Эўропа". Гэта навонкі, каб было зразумела, пра што. Унутраная назва — "Галеб". Невялічкі гатэль на беразе возера, дзе адбывалася нашае сумоўе. Пераклад з македонскай занадта паэтызуе сытуацыю. Галеб — гэта кірля, чайка. З розных частак сярэдняй, другой Эўропы. Мы належым толькі сабе. Нам не належыць нішто.

Дарагая сястра, тут усё харашо, тут паблізу Масква, тут Масква ў галаве, тут Масква ў тэлевізары і ў газэце, тут расейскія песьні развучваюць дзеці, і гэта нармальна, сястра.

Менск, 1987

P.S. Аўтар выказвае падзяку Драга Янчару, Мешу Сялімавічу, Касі Камоцкай і Лявону Вольскаму — тэксты й думкі якіх прысьніліся і пачуліся падчас Балканскага сну. А таксама БФС, без падтрымкі якога не абыходзіцца апошнім часам ніводная вартая рэч.

ПРЫКЛАДЫ

зь пячорай Беларыюс...

мова можа ўзьняць іх / і прыкласьці ў іхнай волі да песьні неба". ("Валія: зямля і мова") "*Усё чалавецтва ўплецена / у таемную сетку Божую, / і толькі ў яе злавіўшыся / вызваляемся мы...*" ("Братэрства"). "*І прыйдзе дзень, калі ўзьвялічыцца малое*" — радок, цытаваны ў песьні пратэсту. "Што ёсьць жыцьцё — знайсьці прастору / між цесных сьцен, / Пазнаньне — трывалы корань / што моц дае галінам, / *Любоў да Краю — трымаць свой дом / у аблоку сьведкаў*" (гл. Пасланьне да Гэбраяў, 12.1) — гэтыя гнамічныя вызначэньні таго, "Што ёсьць Чалавек?" канчаюцца вобразам сусьвету як калыскі, і таму ўсё гэта разам гучыць больш як гімн, чым як верш. Гімны, асабліва ад васямнаццатага стагодзьдзя, складаюць славу валійскай традыцыі — тым часам як ангельскія гімны вылучаюцца моўнай нязграбнасьцю і назольным віктарыянствам.

Я сказала "гнамічныя", бо слова, перакладзенае мною як "пазнаньне" (*adnabod*), мае ў адным іншым вершы разгорнутую на 40 радкоў дэфініцыю, якая сканчаецца гэтак: "Сонца прабіваецца скрозь хмары: / ты — ягоны водблiск на траве", а нейкі камэнтатар, называючы гэта сэрцам сапраўднага нацыяналізму, прапануе (больш абстрактна) "глыбокае асабістае веданьне, блізкае разуменьне, пазнаньне іншага, самога сябе ў гэтым іншым і іншага ў самім сабе".

Гэтыя праграмныя творы вянчаюцца двума візійнымі вершамі "Летняя хмара" і "У двох палёх" (у першым ставіцца пытаньне "Хто я?", у другім — "Што гэта было?") і мартыралёгіяй.


"Летняя хмара", пачаўшы з пераліку ангельскіх хатніх іменаў, пераходзіць да велічнасьці каровы, якая вяртаецца з вадапою, "сваім вымем расхіляючы чараты", і да велізарнага духа-асілка, з чым зьяўленьнем чараты вырастаюць у лес і зьнікаюць "у сьвеце, які завялікі, каб быць", пакідаючы паэта самога там, "дзе сышоўся пачатак з канцом" — пакуль ён не знаходзіць дарогу дадому, намацаўшы шула ў браме, і чуе стукат матчыных драўляных падэшваў па падлозе ў кухні. Візія "прыгожага ў малым"?

Дзіўна, пасьля ангельскіх іменаў на пачатку валійскае заканчэньне гучала б гэтаксама добра і па-ангельску (калі гэтая розьніца ня выклікае спрэчак наконт клясавага паходжаньня аўтара-героя!) — за цытатай зь Бібліі ідзе апошні радок, дзе амаль усе словы гучаць прыблізна аднолькава ў абедзьвюх мовах: "... новае неба і новая зямля: / матчыны падэшвы на падлозе ў кухні грукаюць для мяне" (mum's clogs on the kitchen floor to me).

"У двох палёх" — візія імгненная, якую цяжэй падсумаваць. Яе акалічнасьці складае гульня сьвятла паміж цёмнымі хмарамі і закатам дня. І тут зноў мы маем пэўную *прысутнасьць*, і імя гэтай прысутнасьці бярэцца з аднаго ірляндзкага верша АЭ.

АЭ (Джордж Расэл (George Russell), 1867-1935) — гэта чалавек, які паяўляецца ў "Улісе" як "верхаводны містык" з "натоўпу гермэтыстаў апалавага маўчаньня", дзе ён пасьля стэрыльнага вэгетарыянскага абеду гаворыць зь неахайна апранутай дзяўчынай пра двухгаловага васьмінога: калі зьясі карову, яе вочы "будуць перасьледаваць цябе ўсю вечнасьць..." Ягоны верш пачынаецца "Часам, калі адны, / на змрочным схіле дня / людзі бачаць выгнаную веліч / і сьпяшаюцца прэч".

Гэты Выгнаны Кароль, перад якім расступаюцца чараты, становіцца героем Ўолдавага верша. Гэта прынамсі ясна. "Хто стрэліў трапна, хто раптоўна прасьвятліў?" Хто агарнуў вялікай ціхай "стрывожаную чаек мітусьню"? "Хто там схаваўся ў гушчы словаў?"



Аднак у спробе перадаць ідэю братэрства ("так ціхі паляўнічы на нас накінуў сваю сетку!") аўтар верша йдзе занадта далёка, ня надта распрацоўваючы дэталі: чаму *два* палі? ці *прагал* у агароджы — гэта "брэш" у ваенным сэнсе? ці слова adnabod (гл. вышэй) можа вытрымаць вагу, ускладзеную на яго трайным паўторам на працягу аднаго радка? Дый вобраз фантана, чыя вада ападае, як лісьце, "для загаеньня ран народаў", даволі недарэчны сярод чаратоў. АЭ больш тактоўна выявіў акалічнасьці візіі, больш гатовы да прыняцьця непераадальнасьці містычнага досьведу...

Можа, праблема ў тым, што я спачатку прачытала пераклад? Паўтарэньні спалучэньняў зычных у валійскай прасодыі бясспрэчна гучаць гэтаксама перакананча, як трапныя рыфмы ў іншых паэтычных традыцыях. Аднак для праясьненьня мэты мне спатрэбілася аўтарава заўвага: "толькі гэтая самота, праз пасярэдніцтва Выгнанага Караля, можа прывесьці нас да сапраўднай згоды паміж людзьмі".

Ўолда выступіў за рамкамі верша зь яшчэ большым прызнаньнем: верш быў пратэстам супраць прысутнасьці брытанскага войска на Кіпры ў 1956 годзе. Ідэя братэрства паўстае ў новым сьвятле. Квакеры традыцыйна адзначаюць час і месца, абставіны сваіх перажываньняў, аднак пазьбягаюць будаваць сыстэмы і не выяўляюць дачыненьняў паміж праблемамі, што іх трывожаць, і візіямі.

Братэрскі вобраз "поля, поўнага народу", магчыма, больш прывязваецца да вялікай *ангельскай* паэмы 14-га стагодзьдзя "Пятро-Араты" (Piers Plowman), чым спраўна ўпісваецца ў структуру візіі. І зноў мы можам запытацца: ці гэта сьведчаньне залежнасьці ад ангельскай літаратуры? Або (дабрачынная інтэрпрэтацыя!) гэта зварот да другога боку, да ангельскага шэдэўру (з часоў найбольшае славы валійскай паэзіі), занядбанага ў параўнаньні з Чосэрам, бо напісанага далёка ад цэнтру?

Аднак, хоць і нельга не падзівіцца Ўолдаваму прымірэнчым абдымкам з ангельшчынай і сьмелым ужываньнем паляўнічых вобразаў для апісаньня духовага бою (ня гледзячы на ягоны пацыфізм!), усё ж "вочы той каровы" значна больш пераканаўчыя! Мне ён больш падабаецца ў найкарацейшых формах, як у пары радкоў пра жыцьцёвыя карані, якія ўсё яшчэ цэлыя пасьля катастрофы (Ўолдава візія названая апакаліптычнай): вавёрка ладзіць гняздо сярод разварочанага бруку. Або калі Выгнаны Кароль зноў паяўляецца ў Ўолдавай радыёгутарцы "Чаму я квакер". Усяго 4 вершаваныя радкі: "Ён не пляце карункаў гожых / зь нягодаў нашых: ён прыходзіць / каб патаемна, неспадзеўна / падаць руку".

Хоць у санэце "У дні Цэзара" з нас якраз плятуцца гожыя карункі, бо Зьбіральнік у пустэльні запісвае нас словамі сваёй оды!

Бачыце, што перада мною за праблема? Голае выдае мяне, як кажуць: не такі фрывольны, як звычайна... Эмацыянальна я з Ўолда, аднак я ведаю, што пабожныя надзеі нікуды не прывядуць. Я хачу сказаць, што Ірляндыі было б лепей, калі б яна ставілася да АЭ, каапэрацыйнага вэгетарыянца, больш сур'ёзна — ня гледзячы на ягоны расплывісты містыцызм. Аднак я ведаю, што Джойс з сваёй "езуіцкай казуістыкай" (Larbaud) запраста кладзе яго на лапаткі, калі ўдзецца пра словы.

І я ўпэўненая, што Ўолда — вялікі паэт, як бы шчодра ён ні быў цытаваны; аднак ён і сам сказаў бы (маючы на думцы папрок, які Гандзі выказаў Тагору: "ад цябе няма нічога апрача словаў"), што справы важнейшыя за словы: ён выдаў сваю кнігу толькі тады, калі мог падмацаваць яе нечым большым, чым словы. Пісаць сёньня па-валійску — ужо само па сабе значыць быць нацыяналістам, як сказаў Сандэрс Люіс; але гэта ня значыць, што дастаткова адных словаў. Ўолда паставіў перад сабой сьціплую задачу рабіць занатоўкі, што да квакерскіх справаў, выказваць у некалькіх словах тое, што яны называюць пачуцьцём зборнасьці; можа, ён быў бы рады, калі б яго назвалі добрым слухачом.

Цяпер зноў вернемся да пачатку. Мартыралёгія — плён найбольшых намаганьняў Ўолдавай увагі. Гэта квакерскае маленьне "пасьля стагодзьдзяў маўчаньня" за забытых каталіцкіх пакутнікаў першага рэфармацыйнага стагодзьдзя. "Корань веры адзіны і я рады, што ведаю / душы, злучаныя з жывымі ў аснове быцьця. / Злучаныя са сьвятлом..."

"Джон Робэртс з Траўсвініду, сьвятар для бедных..." "Цесьля Джон Оўэн, які руплівы памочнік.." (які будаваў "сьвятарскія катушкі" ў вялікіх дамах, што належалі каталікам): "Вялікія і славутыя былі б яны ў Тваёй гісторыі, / О, Валія, калі б ты была сапраўдным народам".

У апошнім радку валійцы, якія не гавораць па-валійску, адчуваюць папрок; аднак верш гэты не пра мову як гэткую, а проста пра страту гісторыі з прычыны чужынскага ярма...

Я не зьбіраюся падтрымваць або аспрэчваць рэзкае выказваньне МакГрыаны, працытаванае напачатку: яно зьявілася ў валійскім часапісе, а значыць валійскія рэдактары палічылі яго вартым развагі. Аднак яно падкрэсьлівае цікавае адрозьненьне паміж валійскай і ірляндзкай традыцыяй: валійцам хапае ўжо тых пакутнікаў, якіх можна знайсьці ў мінуўшчыне...

ГРАМАФОН.

Ананім

НАЙ...

Найлепшыя часіны,
Я баўлю час адзін,
І лепшы падарунак —
Аб гэтым напамін.

У грукаце спакою
І цемрадзі ўсіх слоў,
Ў нактурных пацалунках,
Адсутнасьці званкоў,

Дзе чорныя абрысы,
Размаляваны твар,
Дзе блікі цыгарэты
Выбітнейшай з пачвар,

Калі ўсяго няма
І ў той жа момант ёсьць,
Калі ўладарыць той,
Хто мае ў сэрцы поўсьць.

Памножаныя рухі
На розьніцу ідэй,
Слабейшы вінен тым,
Хто ўсіх заўжды слабей.

Адсоткі хваляваньняў
Ня варты перамог:
І ваяры жывыя,
І не забіты цмок.

Тарас Антонаў

***

На нашыя рэкі, лясы і азёры,
Лугі і палі, гарады і людзей
Яшчэ сьвеціць сонца,
  яшчэ зьзяюць зоры,
Ды блізіцца цемра
  хутчэй і хутчэй.
Яна ўжо так блізка,
  што можна ўбачыць
І нават руку працягнуць да яе,
Яна можа зьнішчыць,
  забіць ці з'iначыць,
З гразёю зьмяшаць
  і цябе, і мяне.

Нам трэба змагацца,
  але немагчыма,
Нам трэба бароніць
  краіну сваю,
Але не маўчаць,
  як нямая цагліна,
Словам здабыць перамогу ў баю.
Трэба закончваць небу маліцца
Аб вечным шчасьці, хлебе, вадзе:
Калі хочаш піць —
  пайсьці і напіцца —
Не перашкодзіць вораг табе.

Аляксандар Антончык

НАД ДУНАЕМ

Пад вярбою пад Дунаем
Дрыгавіч канае.
Ён ляжыць зьбялелы ціха
Дом свой ўспамінае.

Цячэ кроў з грудзей прабітых
Волахам магутным.
Рука рану закрывае,
Ў вачах сум пакутны.

А дружына яго князя
Праз лясы і рэкі
Пайшла ў землі, на якіх
Пражываюць грэкі.

Трэба воінам сабраць
Золата, тканіны:
Усё тое, што даюць
Ў якасьці даніны.

Пасьля гэтага вярнуцца
Ў край, дзе Нёман чысты
Цячэ стужкаю блакітнай
Між гаёў цяністых,

Дзе цаніць іх навучылі
Мужнасьць і адвагу.
А да продкаў і матуляў
Прывілі павагу.

Раптам воін прыўзьняўся
Над сырой зямлёю,
Бо ўбачыў Перуна ён
Ўверсе над сабою.

Той ласкава ўсьміхаўся,
Сказаў ціха й важна:
"Бачу, сынок родны, бачу,
Як табе тут цяжка.

Ты кідай зямную службу
І ўсе пакуты зь ёй.
Цябе сьмерць мая сястрыца
Прывядзе ў полк мой.

Будзеш вечна ў ім служыць
Роўным сярод роўных,
Зьдзейсьніш подзьвігаў нямала
Слаўных і цудоўных.

Ну, ідзі да нас. Застаўся
Толькі крок кароткі.
Тут душу тваю чакаюць
Ўзрушаныя продкі.

Вам нарэшце разам ўсім
Выпала сустрэча.
Бачыш, кожны зь іх
Ад шчасьця сьмяецца.

Пакінь цела сваё Зьнічу,
І другім багам,
І ўваходзь рашуча й сьмела
Ў новы вечны храм.

Воін выдыхнуў у трывозе
Дух з сваіх грудзей.
Разам зь ім узьляцеў у неба,
Зьнік з быцьця людзей.

Пад вярбою ад ран цяжкіх
Дрыгавіч сканаў.
Па ім у полі вецер вольны
Плакаў і стагнаў.

Віктар Асіпін



ТРОХКУТНІК

Пакутуе целам
У сваіх трох кутах
Толькі тады,
Калі мае аснову
З паветра зьверху,
Унізе — з глебы,
Або з чыстага белага
Аркуша добрай паперы...
Вось толькі чаму
Добрай?

УЗІМКУ

Хочацца ліць сьлёзы
Замест восені
І сьмяяцца
Замест вясны.

Тацяна Будовіч

Зімовай вяргіні квецень
На зьмерзлым тваім вакне.
Як хочацца — да вар'яцтва! —
Стаць гэтай вяргіняй мне.

Пагляд ты б ня змог адвесьці
Ад кветкі вакна твайго.
Яна прырасла б навекі
Пялёсткамі да яго.

Язэп Вісарыёнаў

АГЕНТУ "МЕТАЛИНУ"
АД РЭЗЫДЭНТА "ОСОХОВА"

ІНСТРУКЦЫЯ №[illegible]

сакрэтна

(пры азнаямленьні зьнішчыць)

"Стратэгія — ёсьць
  наступу пачатак!
І тактыка — ідэяў рухавік!
"Народ, калі ён цёмны, —
  гэта статак!", —
Казаў адзін вядомы бальшавік.
Народ — натоўп!
  Зачмураная маса!
Галоўнае — [illegible] правадыр,
Які б сьцьвярджаў,
  што будуць хлеб і мяса,
Што патаньнеюць малако ды сыр!
Маніць патрэбна, —
  калі ёсьць патрэба!
Дабро — ж ня сыплецца,
  як ураджай з куста.
Ва ўсе часы відовішчаў і хлеба
Жадаў народ, як міласьці Хрыста!
Каб не шалеў той-сёй
  занадта з жыру,
Каб не злаваў зьнямоганы народ, —
Каму — ня важна:
  мэру ці банкіру,
А перацісьнуць трэба кісларод!
Часьцей палохаць!
  Каб цягнулі справу,
Як цягне воз замардаваны бык!
Калі ж ня ўцямяць, —
  дык садзіць на лаву, —
Туды іх, — дзе й кантроль ёсьць
  дый улік!
Чытаў я Леніна яшчэ
  ў партыйнай школе,
Дзе рыхтавалі зьмену Ільлічу.
Там навучаўся ўліку ды кантролю, —
І недарэмна, — як цяпер лічу.
Набыў я ў школе досьвед
  вельмі плённы,
Бо на выдатна скончыў факультэт,
І абавязак зараз мой штодзённы, —
Абранцу мацаваць аўтарытэт!
Ягоны — найгалоўныя дарадца!
І рада я ягонай й бюро.
Заўжды ў пашане, —
  бо магу трымацца,
Як трэба, за пісьмовае пяро.
Пішу даклады здольна, як раманы,
Каб пад Яго: сэнсоўна ды ў зацяг!
Партыйнай воляй я сюды засланы, —
Каб бальшавізм знайшоў
  сабе працяг!
Вазак краіны! Бо трымаю лейцы
Ў сваіх руках! За гэтае, ці не
Тутэйшыя сьвядомыя "парцейцы"
Турнулі з парты,
  як ворага, мяне!
За ўсе пралікі зараз я ў адказе, —
Моў: "Разбураў партыйны апарат!"
Згадзіцца зь імі, —
  ды ні ў якім разе!
Яны мне — шах, а я ім двойчы —
  мат!
"Камуна-дэмы"! Ач-жа камунары!
Вы — ПэКаБэ, а я КаПэ-эСэС!
На "Валадарцы" Вас чакаюць нары,
Як толькі скончыцца
  "Горбатого" працэс!
"Камуна-дэмы" Вы,
  ці "дзермакраты", —
Чакайце часу! Без суда й віны
Пакідаем мы хутка Вас за краты, —
Шпыралі як "нацдэмаў" да вайны!
Усіх на ўлік, "Металин",
  неадкладна!
Кантроль за мной, —
  калі ня так чаго.
Загад Вам дадзены, а Вы,
  як падуладны, —
З руплівасьцю выконвайце яго!"

ЯЎГЕН ГУЧОК

***

Цікавяць іх ня кніжкі і ня Бог,
А колькі грошай водзіцца
Ў кішэні ў суседа.

***

Калі ня прыступка ім кніга
  да даходаў,
Тады навошта ім
Яна?

***

У нас такі пратэстантызм прыймальны,
Каб горай, чым табе,
Было твайму сабрату-суайчыньніку.

***

Мужы дзяржаўныя усё перабяруць:
І праваслаўе, і каталіцызм, і унію...
Забыўшыся на Бога і Радзіму.

***

Ўсё пераварыць страўнік чалавечы,
Вось толькі мудрасьць Божую
Узяў і адштурхнуў.

Андрэй Захаранка

НОЧ

Паціху на старым раялі
Мігцелі сьвечы...
Мы маўчалі...
І косы сьветлыя на плечы
Табе спадалі.
Мглісты вечар
У імгле растаяў...
Ціха сьвечы
Мігцелі на старым раялі...

Як сьвечы на старым раялі,
Гарэлі вочы...
Сонцам сталі
Для сэрца раптам, серад ночы,
Тугія хвалі
[illegible] дзявочых,
[illegible] ў далі —
Толькі вочы,
Бы сьвечы на старым раялі.

А сьвечы на старым раялі
Мігцелі ціха...
Ў змрочнай далі
Магчыма, дзе блукала ліха,
А мы кахалі...
Сумна крыху...
Змрок ночы таяў,
Сьвечы ціха
Мігцелі на старым раялі...

МЫ

Пэўна хтосьці папракне:
Гэта ж ірацыянальнасьць!
На двары дваццаты век,
А ў цябе — нацыянальнасьць!

Ад жыцьця ты, брат, адстаў
[illegible] марш рацый.
Зараз іншы час настаў
І эпоха інтэграцый!

Гэта ўжо анахранізм,
Перажытак стараветны,
Калі хутка у арганізм
Аб'яднаемся сусьветны!

... Я панура схамянусь
І пайду з усьмешкай сумнай...
Я кахаю Беларусь!
Можа нават неразумна...

Хочу, каб ласкалі слых
Пералівы мовы роднай,
І каб меней думак злых
Стала ў роспачы народнай.

У суседзяў — дзеляжы
Галасоў і аблігацый...
Божа мілы! Сьцеражы
Ад бясконцых інтэграцый...

БОЛЬ

(На сьмерць К.М.Манкевіча)

Дзе, скажэце, болей болю,
Чым калі за шклом шпітальным
Гасьне сьвечкай у няволі
Ціхі подых разьвітальны?

Здэцца бы, суняў пакуты...
Як суцешыў... Боль адкінуў...
Толькі дзьверы ўсе закуты
Ланцугамі карантыну.

Пэўна, самае цяжкое —
Шчэ калі жыцьцё бруіцца,
Ля прыемнага пакою
За вакном пустым маліцца.

А калі дагэтуль млосны,
А цяпер нязвыкла ветлы,
Выйдзе доктар — гэта проста,
Гэта, можа, нават сьветла...

Лявон Зялёнагорскі

НЕ ЗАБІВАЙ ПРЭЗЫДЭНТА

Властитель слабый и лукавый,
Плешивый щеголь, враг труда,
Нечаянно пригретый славой,
Над нами царствовал тогда.
. . . .

А.С.Пушкин

На ўсіх зямных жыцьця палетках
Здавён да сёньняшняй пары
Па-над грахоўнымі людзямі
Ўставалі іх правадыры.

Пакуль злаба і ганарлівасьць
І зайздрасьць у людзях жыве,
Яны такога хочуць пана,
Які з жывога скуру рве.

Каб ён душыў, страляў і вешаў
Усіх, хто праўды смак пазнаў.
Каб помсьціў ім і іхнім дзеткам,
І страх у душы наганяў.

Калі ж Настаўнік Неба ласкай
Любоў паселіць ў душы нам,
Тады бяз гвалту і праклёнаў
Пад плотам пан сканае сам.

Мікола Кананович

КАЛЯДЫ 1997

Абяцаньні — пустыя гукі —
Даверлівых ловяць.
Лётаюць белыя мухі.
Званы яшчэ звоняць.
Нехта як бы сьвяткуе
(Чума вельмі любіць сьвяты).
Сьвятар "Слова..." так трактуе,
Каб ня трапіць за краты,
Бо валадарыць д'ябал
(Служка божы прызнаўся п'яным).
Сусед трое сутак запар
Калядуе на грошы мамы.
Пасінеў ад крыштальна-белай,
Адзінай сваёй уцехі,
Вольны і ў дошку сьмелы
Ўсыпаць вам на гарохі:
"Бізьнісьмены, інцылягенты
І ўсякія, хто мяшае..." —
Лепш самі злазьце са сцэны —
Люмпэн гуляе.
Зброд чыноўны аб гэткіх дбае,
Таму на пэнсію маці
Трое сутак сусед гуляе,
Каляду абувае ў лапці.
Хто ж заплоціць за апахмелку,
Гегемону паабяцае
І на скварку, і на бутэльку? —
Воўк тамбоўскі і той ня знае...
Не кусаюць зімою мухі.
Белы сон над зямлёй пануе.
Не страляюць, як недзе, "духі",
Не Чачня ў нас тут — калядуем.

Мікола Кулік

***

Нетаропка іду
Па прадмесьці Траецкім.
Прадчуваю бяду
У вартаньні савецкім.

Мне падказвае сэрца:
"Не ідзі на хаўрус!"
Я ня буду расейцам,
Бо я — беларус.

Мы нашчадкі твае,
Каліноўскі Кастусь!
Твая справа жыве,
Будзе жыць Беларусь!

ВЯЗЕНЬ

Я жыву у краіне,
Што рабуе мяне.
Тут свабоднае гіне
І халуйства ў цане.

Рэфэрэндум на шыі
Цягне ў бездань палонкі.
Тут пааты чужыя
І ва ўладзе падонкі.

Я гляджу ў ваконца
На аблокаў абсяг.
Мо шчэ вернецца сонца
Ў беларускі ГУЛАГ?

ЗАБОЙЦУ

Майго дзеда забіў ты
  яшчэ ў трыццаць сёмым.
Вымый брудныя рукі свае,
  "вертухай"!
Прайшло шэсьцьдзесят год,
  і дзяцей маіх сёньня
"Вэртыкальны" нашчадак твой
  гоніць у рай.
Гаспадар твой ушчэнт
  разьбівае краіну,
Бо нічым кіраваць
  не навучыцца ён.
Зьехаў з добрай дарогі
  кудысь ў каляіну
І зайздросьліва брэша
  усім наўздагон.
Кола часу ня зьверне
  ні майстар забойстваў,
Ні хлусьліва-лісьлівы
  былы палітрук.
Чалавеку агідны такія рамёствы.
Бойся скону свайго,
  бездухоўны байструк!

Агата Нагорная

КАЛЯДНЫ ХОЛАД

Праваслаўнае Раство.
Холад ў кватэры,
Ды ня грэе нас пітво,
А тым болей — вера.

Як лядзяшкі стынуць нэрвы —
Гэта вам ня жарты!
Бацька з сынам для сугрэву
Рэжуцца у карты!

І тусуюць па чарзе
Пульхную калоду —
Ёсьць для сьвята у чарцей
Добрая нагода.

Яны смажаць на агні
Вернікаў азартных:
Млосна, цёпла ад маны,
Ад гульні ўпартай!

Ціснуць пальцы потныя
Караля гаротнага,
І шукаюць даму
Рукі сярод хламу.

Адступаюць маразы,
Ажываюць целы,
Сьвецяць чырванью насы
Над абрусам белым!

Ацяпляе арганізм,
Стылую кватэру
Праваслаўны атэізм —
У бязьвер'е вера!

***

Якое дзіва — дачакацца ранку,
Калі зямлю схавае першы сьнег,

Калі чароўным, казачным фіранкам
Лядок зайграе на маім вакне,

Калі суцішыцца бадзяга-вецер,
Прыляжа адпачыць на курганы,
І хараством цнатлівейшым у сьвеце
Зазьзяюць дыямэнтаў дываны.

Сяргей Патаранскі

ЛЮДОВІК XIV

Аблітыя парфумай, абвітыя парчою,
твае дзяўчынкі п'юць віно.
Явіў ты гонар нацыі сабою,
яго згубіўшы ў пожадзі даўно.

Дзяржава ты і прыклад для народа —
сьмярдзючай чэрні і калек.
Тваіх парадаў жаскіх мыльны подых
прынес жалезны і бязьлітны век.

Пасьля цябе патоп або навала.
Краіна бедная пра ўсё забудзь,
калі яго асоба пажадала
ахвяру новую у ложак зацягнуць.

МАНАЛЁГ ЯКАБІНЦА

Я ня знаю такога народа,
я ня ведаў такой краіны,
дзе шануюць царом прыроды
шчанюка ад бадзяжнай гісіны.

Я ня знаю такога племя,
я ня ведаў такой дзяржавы,
дзе ў пагардзе свабоды семя,
дзе сьвятыні — аб'ект забавы...

Я ня знаю людзей падобных,
я ня ведаю месца такога,
дзе законы — з намераў подлых,
а ўся праўда ў дурня сьвятога.

Я ня знаю, як жыць з такімі,
я ня ведаю, як там прыжыцца,
каб забыць, што жыву з чужымі,
што ня там даў мне Бог нарадзіцца.

ДАМ'Е

Наша краіна —
  месца штодзённых папоек.
Наша краіна —
  месца штодзённага блуду.
Што нам рабіць? Мы час свой
  праводзім ля стоек.
Мы хворыя духам
  І не чакаем цудаў.

Наша краіна —
  княства няўдачаў і суму.
Наша краіна —
  царства лахвы і падману.
Сьцерліся твары ў бойках,
  сэрцы запылены тлумам,
а каля плоту сабака
  залізвае раны.

Наша краіна —
  месца адвечных здрадаў.
Наша краіна —
  месца сусьветных плётак.
Любая паслуга тут
  зьдзейсьненая па блату,
і ўсе адкрыцьці адкладзеныя
  на потым.

Сяргей Пралеска

КАЛЯБАРАНТУ

Не зразумеўшы й напалову,
На што ён руку падымае,
Ён пляжыць звычаі і мову,
Што беларус спрадвеку мае.

Але надыйдзе час расплаты,
Расплаты хуткай і суровай,
Бо не даруюць Герастрату
Ні нашы звычаі, ні мова.

Броніслаў Пяткевіч

МОЙ ПРАКЛЁН

Калі былі мы маладымі
Бяз думак цяжкіх і турбот,
Свае пачуцьці на ўздыме
Заўжды трымалі на ўзлёт.
Чыталі кніжкі і газэты,
Не марнавалі дух жыцьця,
Кірункі бралі ў паэты,
А хто быў — вечнае дзіця.
Ня ведаў лепшай асалоды,
Чым браць навуку за вяршкі
І спаць да поўдня з той нагоды,
Што ноччу біў аб плот гаршчкі.
Сусьвет, вядома, розналікі:
І чэрці ёсьць, і ёсьць багі,
Багаты, бедны і вялікі,
Ня кожны есьць тут пірагі.
Я зьведаў шчасьце лепшай долі,
Бацькі далі мне ведаў ген,
Бо хараство любіў на волі
І пах смалы у зрубе сьцен.
Сярод лясін у адзіноце,
Калі суніц засьвеціць жар,
Мне лета столькі чар прыкоціць,
Што не зьмяшчаў мой кошык мар.
Ня кіс за печкай з павукамі,
Карості жменяй не скабліў,
Не дакучаў і плачам маме,
Ляжаў, чытаў у лоне сьліў.
Са мной заўжды: ці то Купала,
Ці Янка Маўр, альбо Жуль Вэрн,
Цікавасьць рознасьцю трымала
Зайсьці ў вігвам, пад дах таверн.
Як пасьвіў статак кожным летам,
Нырца даваў у глыбіню,
Сярод сваіх я слыў атлетам
І мог адзець аброць каню.
Спачатку час даў сямігодцы,
Затым забраў мяне рабфак,
Сустрэў каханьне ў гэтай лодцы,
Адчуў прыемны яго смак.
Як стаў студэнтам інстытуту,
Камэне сплёў са слоў вянок,
Ня краў парадку ў статута,
А падрабляць хадзіў у док.
Але ў зэніце захапленьня,
Увесь аздоблены жыцьцём,
Папаў у пастку ачмурэньня,
Злы дух павёў другім пуцём
Этапы, турмы, холад, голад,
Экран хлусьні, над праўдай зьдзек,
З калючак дроту "серп і молат",
Вэртэпам зла паўстаў генсек.
Такіх, як я, былі мільёны,
На сто працэнтаў безь віны,
Ад кожнай нацыі імёны,
Бацькі, іх дочкі, іх сыны.
Да працы хто быў вельмі дбайны
І паважаў улад статут,
Таму прыслала сьмерць камбайны,
Каб пахаваць іх косьці тут.
Памерлі Жукавы, Чапаі,
Шануем памяць, добры плён.
А катаў кулі не чапалі...
Для іх тут шчыры мой праклён.

Тацяна Сьнітко

МІНУС ДВАЦЦАЦЬ СЕМ А ШОСТАЙ РАНКУ

(Усім, хто радня па духу)

А ў гэтай зімы
  надта моцны напой!
Выкшталцоны малюнак
  зьляднелага шкла...
Гэта кропля за кропляй —
  напэўна, спакой...
А сьвітанку бракуе,
  напэўна, сьвятла.

Толькі ў гэтым спакоі
  надта добры адчай.
А ў гэтым бяссоньні
  надта кепскія сны.
Зьнерухомее ноч,
  а сьвятлу не змаўчаць —
І яшчэ так далёка
  да нашай вясны!..

А чырвоныя кроплі —
  проста ружы і кроў.
І сьцяжынцы ў завеі
  так пасуюць муры.
І зіма паміраe,
  ня маючы слоў.
А вясне надта рана
  пакуль гаварыць.

І малюнак на шкле —
  гэта мы і мароз.
Гэта сьвечка згасае
  і сонны пакой.
А бязьлітасны студзень
  ня ведае сьлёз.
А завея — бязь межаў.
  А агонь — за сьцяной.

... Надта многа сьвятла —
  у вачах, са сьцяны!
Надта многа жыцьця,
  каб уцiснуцца ў час!
Надта боскі напой
  для скаланай зімы...
Калі ласка, яшчэ!
Пару кропель.
За нас!..

Тацяна Ульянычава

СЯБРАМ

"Ты вершы складаеш? —
спыталі сябры, —
А нам прысьвяціш ты
якіх-небудзь тры?"
Я нават ня ведаю,
як адказаць,
бо вершы заўсёды
нялёгка складаць.
Яшчэ зразумець
немагчыма тады,
калі ўжо ў сшытку
чатыры рады,
ці будзе то ода,
ці крыкі пра моду,
ці верш пра каханьне
або развітаньне.
Ці сум аб мінулым,
ці казка аб чулым,
спагадлівым, добрым,
прыгожым ці злым.
Цяпер зразумелі,
напэўна, сябры,
што верш не заўсёды
бывае такі,
якім вы жадаеце
бачыць яго.
Тут мала, паверце,
жаданьня майго.

Дзяніс Хвастоўскі

***

Нядоўга думаў Тэд Макена —
Адкрыў свой замак пацукам
Is iad a tha ag coiseachd*;
Slean agat**, my castle!
  Come, come, come!..
Калі ж ангельцы неўзабаве
Прыйшлі пад самы манастыр —
Быў пацучынымі зубамі
Ужо замак зьедзены бы сыр.
І стала войска, рты разявўшы:
Ні каменя ім не знайсьці;
І толькі брама, рагатаўшы,
Іх запрашала ўвайсьці...
Сьмяяўся ціха Тэд Макена,
Шырокі з дуба далягляд —
Каму жыцьцё — ніжэй калена,
Каму жыцьцё — на іншы лад.
А зграя, што ўшчэнт зраўняла
Выяву Шкоцкага двара,
Спакайнатою пазірала
з-за мужных плеч гаспадара.

* *Гэта яны, якія йдуць. (шатл.)*
** *Slean agat. — Бывай (ірл.)*

Ірэна Янчанка

Хмараў заслона.
Раптам вынайшаў шлях свой
Сонца праменьчык.

Цяжкая сьпёка.
Толькі поўны калодзеж
Спакойнага сну.

Вольна і колка
Пасьля "цёплай сустрэчы"
Дыхаюць думкі.





Касэта-поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 30.000 БРБ):

1. Ален. Нармалёк 2 альбо Мафія (1996)
2. Вольга Акуліч.Трохкутнік
3. Вальжына Цярэшчанка (1991-1995)
4. Беларускія народныя казкі
5. Музычныя казкі (1996)
6. Бонда. Найлепшыя песьні
7. Данчык. Я ад вас далёка. Мы адной табе належым.
8. Данчык. Мы яшчэ сустрэнемся.
9. Новае неба. Дзеці чорнага гораду (1991)
10. Новае неба. Сон у трамваі (1994)
11. Новае неба. Go home (1995)
12. Новае неба. Мая краіна (1996)
13. Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
14. Крама. Гэй, там, налівай! (1994)
15. Крама. Камэндант (1995)
16. Крама. Лепшыя песьні (1993-1995)
17. Мроя. Найлепшыя песьні з праграмаў 1988-1990
18. NRM. LaLaLaLa (1995)
19. NRM. Одзірыдзідзіна (1996)

20-23. Беларуская музычная літаратура (т.1-4)
24-28. Залаты фонд Беларускага рок-н-ролу (т.1-5)
 т.1. Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты (1986-1990)
 т.2. Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы (1990-1993)
 т.3. Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо (1986-1991)
 т.4. Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя (1992-1994)
 т.5. Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Тарнадо. Флэт (1992-1994)
29. Рок па вакацыях-96 (НРМ. Уліс. Флэт. Тарнада. Крама. Рублёвая зона. Новае неба. А.Шадзько і А.Юшын)
30. Будзьце аптымістамі, рабіце дзетак (Новае неба. Ляпис Трубецкой. НРМ. Палац, 1996)
31-33. Беларускі джаз
 т.1. Рэнэсанс .
 т.2. Ігар Сафонаў
 т.3. Яблычная гарбата. Пчаліны танец.
34. Беларуская гітарная музыка (1996)

35. Беларуская сымфанічная музыка (1996)
36. Яўген Паплаўскі. Творы (1996)
37-39. Лепшыя музычна-драматычныя творы радыёстанцыі "Беларуская маладзёжная"
 т.1. Чалавек, якому хацелася ўсяго (памяці Ф.Мэркуры)
 т.2. Лесьвіца ў нябёсы (фантазыя па матывах Лед Зэпэлін, Робэрта Планта і Рычарда Баха)
 т.3. Танец поўні (прагулка са Стынгам)
40. Андрэй Мельнікаў. Успамін (1994-1995)
41. Андрэй Мельнікаў. Салам Саўкам (1993)
42. Андрэй Мельнікаў. Песьні выгнаньня (1991-1993)
43. Андрэй Мельнікаў. Камяні майго вогнішча (1994-1995)
44. Андрэй Мельнікаў. Да апошняга камісара (1995-1996)
45. Андрэй Мельнікаў. Гэта мы (1996)
46. Андрэй Мельнікаў. Шлях. 2 часткі (1996)
47. Уліс. Краіна доўгай белай хмары (1990)
48. Уліс. Чужаніца (1991)
49. Уліс. Танцы на даху (1993)
50. Уліс. Life-96
51. Уліс. Блуканьне (1996)
52. Мясцовы час. Наша ўскраіна (1991)
53. Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)
54. Палац (1995)

55. Песьні беларускіх бардаў (1992)
56. Рок супраць рэвалюцыяў (Новае неба. Зіндам. Уліс. Мроя. Крама, 1994)
57. Маладзёжныя хрысьціянскія сьпевы Прыйдзі і праслаўляй (1996)
58. Ліцьвіны. Неба і зямля (1994)
59. Ліцьвіны. Пятае сакавіка (1996)
60. Зьміцер Бартосік. Да пабачэньня... (1996)
61. Уладзімер Клімовіч. Дзеці вятроў (1997)
62. Камэлот. У краіне талераў. (1995)

кошт 27.000 БРБ:

63. Новае неба. Выбранае. Песьні з альбомаў 1990-1996 г.
64. Уліс. Ратуйце вашыя душы. Песьні з альбомаў 1996 г.
65. NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996 г.

Касэты можна замовіць праз пошту:
220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч.
Даведкі праз тэлефон у Менску (апроч выходных):
239-78-49, Віталь.

Новыя кнігі, дасланыя ў рэдакцыю

Гайдук М. Белавескія быліцы і небыліцы: Легенды, паданьні: Для малодш. шк. узросту / Маст. Г.П.Сянькоўскі. — Менск: Юнацтва, 1996. — 175 с.: іл. 6000 ас. ISBN 985-05-0084-0

Гілевіч Н. Збор твораў. У 6 т. Т. 1. Вершы і паэмы 1946-1976 / Прадм. У. Конана. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. —350 с.: іл., 1 л. партр. 3500 ас. ISBN 985-02-0245-9 (т. 1)

Горолевич Т. Философия естествознания: советский и постсоветский периоды (субъективные заметки) — Менск: Право и экономика, 1996. — 91 с. ISBN 985-6194-51-2

Далідовіч Г. Жар каханьня: Апавяданьні пра жанчын. Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 350 с. 2500 ас. ISBN 985-02-0003-0

Дзень за днём: Прыкметы надвор'я, а таксама народны каляндар-месяцаслоў: Для дашк. і малодш. шк. узросту / Сабр. і апрац. А Русецкі; Маст. В.Александровіч. — Менск: Юнацтва, 1997. — 158 с.: каляр. іл. 7000 ас. ISBN 5-7880-0833-6

Кантакты і дыялёгі: інфармацыйна-аналітычны і культуралягічны бюлетэнь. — Менск: Беларусь, 1997. — 64 с. №1.

Марціновіч А. Зерне да зерня: Гісторыя ў асобах: Эсэ, нарысы: Для сярэд. і ст. шк. узросту / Маст. В.Дударанка. — Менск: Юнацтва, 1996. — 366 с.: іл. 6000 ас. ISBN 985-05-0153-7

Новы запавет. Псалтыр / Пер. Васіль Сёмуха. — Менск: ВЦ "Бацькаўшчына", 1995. — 489 с. 5700 ас. ISBN 985-6026-06-7

Сіўко Ф. Апошняе падарожа ў краіну ліваў: Аповесьці, Менск: Маст. літ., 1997. — 255 с. 1500 ас. ISBN 985-02-0012-X

Справочник белорусских общественных объединений / Сост. А. Шибицкая. — Менск: А-во САДИ, 1997. — 157 с. ISBN 985-6177-15-4

Танк Максім. Блікі сонца: Вершы, казкі. — Менск: Юнацтва, 1997. — 128 с.: іл. 8000 ас. ISBN 985-05-0051-4

Терпимость: предверие мира: Учеб.-препод. руков. по воспит. в духе мира, прав человека и демократии. — Менск: НСЦ, 1996. —64 с. 5000 ас. ISBN 985-6216-08-7

Чаропка В. Уладары Вялікага княства. — Менск: Полымя, 1996. — 638 с.: іл. ISBN 985-07-0034-3

Шамякін І. Вялікая княгіня: Раман, аповесьці: Для ст. шк. узросту / Маст. К.С. Ракіцкі. — Менск: Юнацтва, 1997. — 366 с.: іл. 6000 ас. ISBN 985-05-0030-1

1. М.Говард. Сучасная культурная антрапалёгія (25.000 БРБ)
2. Ў.Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня 12.000 БРБ)
3. Дж.Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку (10.000 БРБ)
4. П.Брунэль, К.Пішуа, А.-М.Русо. Што такое параўнальнае літаратуразнаўства (25.000 БРБ)
5. Б.М.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію (10.000 БРБ)
6. Дж.Лоўзі. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі (20.000 БРБ)
7. Ж.Б.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён (10.000 БРБ)
8. Ф.Брэтон, С.Пру. Выбух камунікацыі (20.000 БРБ)
9. Ж.Эрш. Філязофскае здумленьне (30.000 БРБ)
10. Ш.Дэбаш, Ж.-М. Пант'е. Уводзіны ў палітыку (30.000 БРБ)
11. К.Г.Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё (25.000 БРБ)
12. Дж.Бэрдшоў. Эканоміка. Ч.1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў (45.000 БРБ)
13. Ю.Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі (25.000 БРБ)
14. Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1 (30.000 БРБ)
15. Крыўя. №1, 1994 (45.000 БРБ)
16. Крыўя. №1, 1996 (55.000 БРБ)
17. Беларускі гістарычны агляд (30.000 БРБ)
18. В.Кіпель. Беларусы ў ЗША (15.000 БРБ)
19. М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі, 1764-1794 (20.000 БРБ)
20. Т.Сапач. Восень (10.000 БРБ)
21. Унія: часопіс хрысьціянскага сумоўя. №4 1995 (12.000 БРБ)
22. Ю.Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны (20.000 БРБ)

Кнігі — поштай

23. А.Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... (30.000 БРБ)
24. Круглы год: хоку беларускіх паэтаў (26.000 БРБ)
25. Э.Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі (15.000 БРБ)
26. А.Глёбус. Скрыжаваньні (10.000 БРБ)
27. Беларускі вайсковы строй і зброя (20.000 БРБ)
28. Беларускі рок-н-рол (10.000 БРБ)
29. Кася ў школцы (9.000 БРБ)

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму праз пошту пералічыць на наступны рахунак: *БГФ "Наша Ніва" р/р 3015201930039 "Гарант" філія АКБ "Поіск" г. Менска, код 987.*

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары "Для пісьмовага паведамленьня" ўказаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас.

Паштовыя выдаткі аплочваюцца пры атрыманьні кнігі.

Даведкі праз тэлефон у Менску (апроч выходных): 239-78-49, Віталь Супрановіч.
Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч.



Усіх дзяўчат з Фракцыі віншуем з надыходам Вясны'97. Вітаўт і Павал

Вольга Штыцько! Твой сябар Аляксандар віншуе цябе з днём жанчын. Жадаю ўсяга найлепшага!

Маладзёвая фракцыя БНФ запрашае моладзь, якая прагне дзеяньня і змаганьня за БЕЛАРУСЬ. Штодня ў 19.00 на Варвашэні, 8

Фан-клюб беларускай музыкі запрашае фанатаў беларускага року на свае дыскатэкі. Тэлефануйце: 49-08-88. Віталь

11 сакавіка ў кінатэатры "Зьмена" адбудзецца прагляд фільма В.Асьлюка "Сьлёзы блуднага сына" з канцэртам В.Шалкевіча. Пачатак а 18 гадзіне. Даведкі праз тэл.: 49-08-88

12 сакавіка а 17 гадзіне (вул. Варвашэні, 8) адбудзецца імпрэза ўзнагароджаньня Славаміра Адамовіча літаратурнай прэміяй ТВЛ "Гліняны Вялес" за зборнік вершаў "Каханьне пад акупацыяй"

Віншую ўсіх беларусаў са сьвятам утварэньня БНР. Уладзя

Таварыш! Уступай у БНФ, ствара суполкі Фронту ў сваім месьце, вёсцы. Разам пераможам! Менск, Варвашэні, 8. Тэл.: 233-50-12

Ірэна, віншую з 8-ым Сакавіка. Шчасьця, посьпеху й зьдзяйсьненьня ўсіх мараў. Ігарок

Праца для прадаўца-кансультанта будаўнічых матэрыялаў (пажадана мець уласны аўтамабіль). Тэл.: 76-92-05, 26-61-87. Міхал

Прадаю набор кафлі для каміна "Белавеская пушча", нядорага! Тэл.: 262-21-00

Іянізатар паветра прадаю. Ачышчае і аздараўляе паветра. Неабходны ў кожным доме, офісе і аўтамабілі. Тэл.: 273-39-38

Фільтар для ачысткі вады. Патрэбны ў кожным доме. Дарагі, але эфэктыўны. Тэл.: 273-39-38 (з 18 да 22.00). Вольга

Раблю лекавы (акупунктура) й агульны масаж з выездам да кліента. Тэл.: 262-83-86 з 21.00 да 22.00

Праца дома, укладваньне і адсылка рэклямных буклетаў. 100.000 руб. у дзень. Капэрта са зваротным адрасам + купон бясплатнай абвесткі. 220073, Менск а/с 26

Куплю п/э пакеты, упаковачныя. Тэл.: 253-92-26

Прадам пакеты п/э з малюнкам, упаковачныя. Тэл.: 260-94-78

Паслугі ксэракапіяваньня, выгадна, апэратыўна. Тэл.: 253-92-26.

Дорага куплю кнігі, часопісы савецкага часу, маркі, значкі, манэты, паштоўкі. Перасылка за мой кошт. Для адказу капэрта, купон б/а. 210015, Віцебск-15, а/с 34

Бясплатна вышлю народныя рэцэпты поўнага вылечваньня дыябэту, катаракты, заіканьня, язвы страўніка. 2 капэрты і купон б/а ад Вас. 210001 Віцебск-1, а/с 39, бабулі Марыі

Прадаю Opel-Амэга 1987 г. 3 л., бэнзын, АБС, скура. Тэл.: 35-10-41, 28-60-83

Прадаю сродак для спыненьня росту валасоў. Тэл.: (0232) 49-91-81

ДАВЕДКІ

"Шаноўная НН, калі ласка, надрукуй варыянт гімну Беларусі на верш Янкі Купалы "Маладая Беларусь".

Ул. Сямашка, г. Берасьце Паўднёвы.

Янка Купала

Маладая Беларусь

Вольны вецер напеў вольных песень табе,
Бор зялёны узьняў дружным гоманам,
Сонца полымем вызвала к слаўнай сяўбе,
Зоры веру ўлілі сілам зломаным.

І ў часы буры, нягод і вялікіх надзей
Зацьвіла, расьцьвіла даўгажданая,
І крыніцай жывой над айчызнай сваёй
Паплыла, пацякла неспыняная.

Паплыла, пацякла зь сьветлай казкай жыцьця
Полем, лесам, гарой і далінаю...
З свойскіх кветак-пралесак — карона твая,
Ўся сама — яснота лебядзіная.

Зіхаціш і гусьлярскаю песьняй зьвініш,
Узьнімаеш мінуўшчыну даўную;
Час сягоньняшні ўперад ісьці не пыніш,
І глядзіш сьмела ў будучнасьць тайную.

Сьмела ў сонца ідзеш, як жывы агняцьвет,
Сееш ласкава сны залацістыя;
Не пужае сумежны дакучны сусед,
Не пужае пуціна цярністая.

Ад мяжы да мяжы, ад канца да канца
Абнаўленьня павевы расходзяцца,
Абнімае душу без граніц, без канца
Маці-радасьць, што лепшы дзень родзіцца.

Ўжо ня так тапары ў зялёным бары
Хвойкі валяць зімой маразянаю,
Ўжо ня так касары ад зары да зары
Летам звоняць касой адкляпанаю.

Значан гарт у руках, чутна песьня бязь сьлёз,
Грудзі славы надзеяй калышуцца,
Ў кнігі новы закон ёмка пёрамі з кос
Наўсягды людзьмі новымі пішацца.

Расьцьвітай жа, ўзьнімай на арліных крылах
Душы, сэрцы і думы заспаныя,
Вызывай, выклікай на вялікі прасьцяг
Сілу, ведзьмай-пятлёй не чапаную.

Высылай, рассылай на край сьвет пасланцоў,
Як з гнязда сакалінага сокалаў,
Хай лятуць, далятуць да байцоў-удальцоў,
Хай грымяць весткай добраю ўвокала.

Годзе ў полі, ў лясах ты, старонка, і так
Сіратой начавала забытаю,
Годзе выпіў крыві з сэрца крыўды чарвяк,
Косьці вецер тачыў непакрытыя.

Падымайся зь нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі;
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі!..

МАЛАДАЯ БЕЛАРУСЬ


Муз. Канстанціна Галкоўскага.
Сл. Янкі Купалы



Галкоўскі Канстанцін Міхайлавіч (16.6.1875, Вільня — 20.2.1963), літоўскі і беларускі кампазытар, дырыжор і педагог. Беларус. Народны артыст Літоўскай ССР (1955). Прафэсар (1947). Скончыў Пецярбурскую кансэрваторыю (1908). З 1908 вёў пэдагагічную работу ў Вільні (з 1945 у кансэрваторыі). Сярод вакальных твораў Галкоўскага многія заснаваныя на беларускім музычным фальклёры, напісаныя на вершы беларускіх паэтаў: ансамблі, рамансы і хоры на вершы Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Танка, З.Бядулі, К.Буйло, апрацоўкі беларускіх народных песень, народныя харавыя сюіты "Дуда" і "Каханьне" (апошняя з сымфанічным аркестрам).

Дзякуй усім, хто дапамагаў у пошуку музыкі, а перадусім сп. Людміле Мітаковіч, супрацоўніцы Беларускага радыё, якая знайшла фанаграму гэтага гімну ў выкананьні Забэйды-Суміцкага, і Мікалаю Калядку, дырыжору Бел. Дзярж. акадэмічнага тэатру опэры і балету, які запісаў музыку.

КОНКУРС



Шаноўныя чытачы! Дасылайце свае адказы пасьля апошняга пытаньня й будзьце ўважлівыя...

Якая краіна?

Базавыя шапікі "НН" у Менску

(працуюць безь перапынку на абед і ў выходныя дні)

раён па "Белдруку"	№ шапіка	адрас
Ленінскі	№11	пр. Ф.Скарыны, 10 (каля Паштамту)
	№110	вул. Пуліхава, 3 (каля гастраному)
Цэнтральны	№1	пр. Ф.Скарыны, 38 (крама "Хлеб", мэтро "Пл. Перамогі")
	№109	вул. Заслаўская, 9 (каля гастраному "Заслаўе")
Кастрычніцкі	№41	вул. Маскоўская, 20 (каля ДБ, мэтро "Ін-т культуры")
	№303	АС "Дружная"
Маскоўскі	№255	пр. газэты "Правда", 14а
	№289	пр. Любімава, 26-1
Фрунзенскі	№14	вул. Арлоўская — Фінская запраўка
	крама №21	станцыя мэтро "Пушкінская"
Савецкі	№133	вул. В.Харужай, 6 (каля прыпынку "Камар.рынак")
	№225	вул. Кальцова, 48
Першамайскі	№162	пр. Ф.Скарыны, 89
	№164	пр. Скарыны — мэтро "Парк Чалюскінцаў"
Заводзкі	№200	пр. Партызанскі, 36
	№254	вул. Сурганава, 17
Партызанскі	№214	пр. Ракасоўскага, 119 (насупраць кіно "Салют")
	крама №2	пр. Ф.Скарыны, 44 (каля крамы "Оптыка")

Газэта прадаецца таксама ў кнігарні "Сьветач" (пр-т Машэрава).

КУПОН **Бясплатнай прыватнай абвесткі**

Тэкст:

Імя і прозьвішча. Адрас, тэлефон

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.

220123, Менск, а/с 71

"Наша Ніва" незалежная газэта

заснаваная ў 1906, аднаўленая ў 1991

заснавальнік Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
выдавец БГФ "Наша Ніва"
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
Уладзімер Бараніч
дызайн і вёрстка Лявон Раманчык
набор Таццяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by

Падпісны індэкс 63125

 Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая. Наклад 5100. Нумар падпісаны ў друк 19.55, 9/3/1997. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 1319 . Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.